Хроніка парушэньняў правоў чалавека
ў Віцебскім рэгіёне

# ШЭРАЯ КНІГА

**студзень – снежань**

**2022 года**



Віцебск, 2023

# АГЛЯД ПАРУШЕННЯЎ ПРАВОЎ І СВАБОД У БЕЛАРУСІ ЗА 2022 ГОД

Летась працягваўся і нарастаў надзвычай глыбокі грамадска-палітычны крызіс, у вытоках якога знаходзілася ўзурпацыя ўлады і яе засяроджванне на працягу чвэрці стагоддзя ў руках А. Лукашэнкі, вынікам якой сталі слабасць дэмакратычных інстытутаў, адсутнасць найважнейшых і абавязковых дэмакратычных гарантый, павагі і выканання правоў чалавека і асноўных свабод.

Не змірыўшыся з дэ-факта паразай на прэзідэнцкіх выбарах у жніўні 2020 года, пабачыўшы прыкметы недзеяздольнасці і стомленасці карнага апарату, улада працягвала перафарматаванне сваіх інстытутаў пад патрэбы таталітарнай сістэмы, якая прыйшла на змену аўтарытарызму, канчаткова знішчаючы станоўчыя дасягненні ранейшых гадоў, якія з'явіліся вынікам кампрамісаў і супрацоўніцтва з міжнароднымі арганізацыямі, грамадзянскай супольнасцю і яго інстытутамі.

Такім чынам, правы і свабоды, каштоўнасць і ўніверсальнасць якіх і раней не ў поўнай ступені падзяляліся нават у рыторыцы, а дэ-факта рэгулярна парушаліся ўладамі, засталіся без аніякай падтрымкі з боку ўладных інстытутаў.

Улады паўсюдна ўкараняюць і агрэсіўна адстойваюць свае правы на парушэнне правіл канстытуцыйнай змены ўлады і ўліку меркавання народа падчас прыняцця рашэнняў, парушэнне права на мірныя сходы, асацыяцыі, умяшанне ў свабоду выказвання меркаванняў.

Катаванні і іншыя віды жорсткага, бесчалавечнага, зневажальнага абыходжання з палітычных матываў зрабіліся жахліва паўсядзённай, будзённай нормай. У правядзенне таталітарнай палітыкі ўцягнутыя ўсе галіны ўлады: выканаўчая, судовая і заканадаўчая. Імі выбудоўваецца новая сістэма, якая выключае любыя адступленні ад дзяржаўнай палітыкі і ідэалогіі, закладаецца дзеля гэтага канстытуцыйная і заканадаўчая аснова.

З гэтай мэтай ствараецца новая ідэалогія, дзе ў сімбіёзе з наратывамі мінулых гадоў, часоў СССР: варожае асяроддзе, барацьба з дзяржаўнай здрадай, барацьба з нацызмам — ужываецца найноўшая тэрміналогія: барацьба з экстрэмізмам і тэрарызмам, абарона інтарэсаў нацыянальнай бяспекі і да т. п.
Ва ўсіх гэтых выпадках сэнс паняццяў цынічна падмяняецца, а вынікам робіцца страх, які татальна пануе ў грамадстве на фоне беспакаранай агрэсіі абаронцаў ладу.

У апублікаваным 9 сакавіка 2022 года дакладзе Упраўлення ААН па правах чалавека адзначаецца, што ціск, які ўрад працягвае аказваць на апанентаў, грамадзянскую супольнасць, журналістаў і адвакатаў, прывёў да парушэння асноўных правоў чалавека дзясяткаў тысяч жыхароў Беларусі і да неспрыяльных наступстваў у жыцці велізарнай колькасці іншых людзей, прытым што няма ніякіх сведчанняў таго, што злачынцаў прыцягнулі да адказнасці.

У дакладзе падрабязна выкладзеныя вынікі разгляду УВКПЧ пытання аб палажэнні ў галіне правоў чалавека ў Беларусі, запытанага Саветам па правах чалавека ААН. Гэты агляд ахоплівае перыяд да выбараў 9 жніўня 2020 года і перыяд пасля іх і да 31 снежня 2021 года.

Цаной палітычнай і эканамічнай падтрымкі з боку ўлад Расійскай Федэрацыі дыктатуры, якая страціла легітымнасць і знаходзіцца пад эканамічнымі санкцыямі, у 2022 годзе стала забеспячэнне тэрыторыяй, паветранай прасторай, інфраструктурай Беларусі для расійскай агрэсіі ў дачыненні да суверэннай Украіны, што паставіла Беларусь у становішча дзяржавыпамагатай агрэсара, якая нясе на чале з дэ-факта кіраўнікамі адказнасць за жахлівыя акты гвалту і разбурэнні.

Безумоўная палітычная і інфармацыйная падтрымка акту агрэсіі і 5 апраўданне дзеянняў агрэсара ў інфармацыйным полі дзяржаўнымі прапагандысцкімі рэсурсамі заклікана нагнятаць у беларускім грамадстве мілітарысцкую гістэрыю на ўзор расійскай і апраўдваць той факт, што адвечная рыторыка А. Лукашэнкі, які абяцаў народу мірнае існаванне наўзамен на лаяльнасць, аказалася фікцыяй.

«Вясна» неадкладна і безумоўна асудзіла акт агрэсіі і ўдзел у ім беларускіх улад, падкрэсліваючы, што дзеянні беларускага рэжыму груба парушаюць як нормы міжнароднага права, двухбаковую дамову паміж Беларуссю і Украінай, гэтак і Канстытуцыю дзяржавы, а таксама канстатавала той факт, што адной з перадумоў да пачатку вайны стала задушэнне беларускай грамадзянскай супольнасці, якая паслядоўна і

непахісна адмаўляла ў падтрымцы імкненню расійскіх і часткі беларускіх уладных эліт ствараць геапалітычныя і вайсковыя саюзы, якія ўцягваюць Беларусь у рэалізацыю імперскіх амбіцый улад РФ.

Пацверджаннем пазіцыі беларускага грамадства стала серыя антываенных пратэсных выступаў, якія адбыліся напрыканцы лютага і, нягледзячы на прагназаваную беспрэцэндэнтную жорсткасць падчас іх задушэння, сабралі тысячы ўдзельнікаў.

Вайна ва Украіне аказала неадназначны ўплыў на палітыку дзяржаў і міжнародных арганізацый у дачыненні да Беларусі: яна бясспрэчна змяніла вектар усеагульнай увагі, аднак прымусіла задумацца пра шырэйшыя наступствы і большы ўплыў на сусветную палітыку беларускіх унутрыпалітычных працэсаў, чым гэта раней уяўлялася.

У кастрычніку стала вядома пра прысуджэнне Нобелеўскай прэміі міру зняволенаму кіраўніку «Вясны» Алесю Бяляцкаму, Праваабарончай арганізацыі «Мемарыял» і Цэнтру грамадзянскіх свабод: «На працягу шматлікіх гадоў яны адстойвалі права крытыкаваць уладу і абараняць асноўныя правы грамадзян.

Яны прыклалі беспрэцэндэнтныя высілкі для дакументавання ваенных злачынстваў, парушэнняў правоў чалавека і злоўжывання ўладай. Разам яны дэманструюць значэнне грамадзянскай супольнасці для свету і дэмакратыі».

У ААН ізноў заклікалі ўлады Беларусі вызваліць Алеся Бяляцкага са зняволення: Анаіс Марэн, Спецыяльная дакладчыца па пытанні аб становішчы ў галіне правоў чалавека ў Беларусі, Мэры Лоўлар, Спецыяльная дакладчыца па пытанні аб становішчы праваабаронцаў, і Ірэн Хан, Спецыяльная дакладчыца па пытанні аб заахвочванні і абароне права на свабоду меркаванняў і іх свабоднае выказванне, апублікавалі сваю заяву пасля рашэння Нобелеўскага камітэта прысудзіць А. Бяляцкаму прэмію міру 2022 года.

Пабудова таталітарнай сістэмы запатрабавала змены Канстытуцыі, якая нават у той рэдакцыі, што дзейнічала і з'ўлялася вынікам замацавання на ўзроўні Асноўнага закона ўзурпацыі аднаасобнай улады Аляксандрам Лукашэнкам, перастала задавальняць патрэбы дыктатара на сучасным этапе.

У новай рэдакцыі Канстытуцыі, прынятай на рэферэндуме, які быў праведзены з істотнымі парушэннямі, яшчэ больш размыты адрозненні паміж галінамі ўлады, закладзены бязмежныя магчымасці і гарантыі па ўтрыманні ўлады дэ-факта ў розных дзяржаўных пасадах Аляксандрам Лукашэнкам; саслаблена роля органаў прадстаўнічай улады і судоў.

Аднчасова з гэтым заканадаўчая база Беларусі страчвае рысы прававой і працягвае напаўняцца рэакцыйнымі нормамі, якія ігнаруюць дэмакратычныя канстытуцыйныя асновы і міжнародныя

абавязальніцтвы Беларусі, прызначаныя дзеля адвольнага пашырэння правоў дзяржаўных інстытутаў і расправы над супернікамі рэжыму: яны прадугледжваюць б адвольнае асуджэнне, пазбаўленне маёмасці, грамадзянства, абмежаванне працэсуальных правоў, узмацненне санкцый за парушэнне прадпісанняў і забаронаў закона, абмяжоўваюць правы асацыяцый і г. д.

«Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі працягвае імкліва пагаршацца, уводзячы краіну ў атмасферу страху і беззаконня», — папярэдзіла, прадстаўляючы свой штогадовы даклад Савету па правах чалавека, Спецыяльная дакладчыца ААН па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі Анаіс Марэн і падрабязна апісала палітыку сістэматычнага ўзмацнення жорсткасці заканадаўства, якое абмяжоўвае грамадзянскія і палітычныя правы беларускімі ўладамі. Незалежная экспертка вылучыла канстытуцыйны рэферэндум 27 лютага 2022 года як адзін з апошніх прыкладаў гэтай тэндэнцыі. Згодна з Марэн, працэсу бракавала празрыстасці і адкрытасці, а галасаванне было азмрочана сур'ёзнымі парушэннямі і не можа лічыцца свабодным і справядлівым.

Звыклымі інструментамі рэпрэсій у дачыненні да ўдзельнікаў мірных акцый пратэсту, іншадумцаў, удзельнікаў розных супольнасцяў і ініцыятываў, журналістаў і праваабаронцаў на працягу года былі крымінальны і адміністрацыйны перасълед, адвольныя напады на грамадзян і іх жыллё пад выглядам правядзення следчых дзеянняў паводле надуманых абвінавачванняў, катаванні, жорсткае, бесчалавечнае, зневажальнае абыходжанне з затрыманымі і арыштаванымі.
30 кастрычніка 2022 г. набыў моц закон аб дэнансацыі Рэспублікай Беларусь Факультатыўнага пратаколу да Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах, што пазбаўляе ахвяраў парушэнняў правоў чалавека ў Беларусі, якім было адмоўлена ў правасуддзі на нацыянальным узроўні, магчымасці падаваць свае звароты ў Камітэт па правах чалавека.

Прымаючы сваё рашэнне аб дэнансацыі, Беларусь не падала канкрэтных тлумачэнняў і не правяла аніякіх кансультацый з грамадзянскай супольнасцю і няўрадавымі арганізацыямі. Рэспубліка Беларусь робіцца чацвёртай дзяржавай у гісторыі і адзінай дзяржавай у XXI стагоддзі, якая выйшла з Факультатыўнага пратаколу, ратыфікаванага 117 дзяржавамі. Выхад Беларусі з працэдуры разгляду індывідуальных скаргаў з'яўляецца сур'ёзнай перашкодай для абароны правоў чалавека, заявіў Камітэт ААН па правах чалавека.

**Усе, што адбывалась у мінулым годзе у Віцебскай вобласці было адлюстрананнем працэсаў, якія працякалі ў палітычнай і грамадскай сферах ў межах Беларусі.**
**Дадзенае выданне, ў храналагічным парадку, прадстаўляе чытачам факты парушэння правоў чалавека ў 2022 годзе ў Віцебскім рэгіёне.**

## Факты парушэньняў грамадзянскіх і палітычных правоў

## Студзень 2022 года

**01.01.2022**

29 снежня суд Бешанковіцкага раёну вынес абвінаваўчы прысуд у крымінальнай справе ў дачыненні 35-гадовага жыхара Віцебску, які нібыта абразіў памочніка пракурора Віцебску. На падставе арт.369 КК мужчыну прызначылі пакаранне ў выглядзе абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу на тэрмін 1 год 6 месяцаў і штрафу ў 2900 рублёў.
У судовым паседжанні абвінавачаны раскаяўся ў зробленым і прызнаў віну ў поўным аб'ёме. Як сцвярджаецца, падсудны добраахвотна, а не па рашэнні суду, пералічыў 700 рублёў на разліковы рахунак дзіцячага дома, а таксама 200 рублёў – на разліковы рахунак прытулку для жывёлаў.
Апроч таго, суд пастанавіў прымяніць да падсуднага спецыяльную меру, прадугледжаную крымінальным законам, якая дае магчымасць канфіскаваць прадметы і сродкі, з дапамогай якіх было ўчыненае злачынства – мабільны тэлефон iPhone перайшоў ва ўласнасць дзяржавы.
Прысуд не набыў законнай моцы і можа быць абскарджаны і апратэставаны ў апеляцыйным парадку.

**04.01.2022**



Былую настаўніцу з Мёраў **Эму Сцепулёнак**, якую абвінавацілі ў распальванні сацыяльнай варожасці (арт. 130 КК) і абразе прадстаўніка ўлады (арт. 369 КК), перавялі з Жодзінскай турмы ў віцебскі СІЗА №2. У апошнім лісце на волю палітзняволеная піша, што «ніякага руху па справе няма наагул». 68-гадовая жанчына знаходзіцца за кратамі больш за тры месяцы.
«Цяпер я ў Віцебску, у СІЗА-2. Нас усіх накіравалі па СІЗА краіны па месцы жыхарства. У Мёрах СІЗА няма, таму – Віцебск. Ніякага руху па справе няма наагул. Бязглуздзіца поўная і невядомасць… 30 снежня будзе тры месяцы, як мы сядзім», – піша волю Эма Сцепулёнак.
Паведамляе ў лісце, што ўмовы ўтрымання ў Віцебску вонкава лепшыя, але насамрэч нават горшыя за тыя, што былі ў следчай турме ў Жодзіне.
«Харчаванне аднастайнае, медабслугоўвання практычна няма (падала тры заявы да тэрапеўта, але так і не прыняла мяне)». А ціск скача. Пасцельнага рэжыму не маю. Наагул, на людзей тут напляваць. У Жодзіне было нашмат лепей», – піша палітзняволеная.
Жанчына піша, што засталася зусім адна ў Беларусі. Усё жыццё аддала школе і дзецям, дапамагала сястры, якая зараз жыве ў Санкт-Пецярбурзе. Прызнаецца, што ў у турме пазнаёмілася з многімі выдатнымі людзьмі, якія падтрымліваюць яе.

**04.01.2022**

Суддзя Аршанскага раёну і гораду Ворша Дзмітрый Разумовіч вынес прысуд **Сяргею Парфяненкаву**, якога абвінавацілі ў абразе прадстаўніка ўлады (арт. 369 Крымінальнага кодэксу). Мужчыну прызналі вінаватым і пакаралі абмежаваннем волі на два з паловай гады. Аршанец мае намер абскардзіць судовы вырак у Віцебскім абласным судзе.
Следства і пракуратура абвінавацілі Сяргея Парфяненкава ў тым, што ён са свайго акаўнта ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі» ў суполцы «Усатый таракан» пакінуў каментар пра супрацоўніка ДАІ, які спыняў і штрафаваў аршанскіх актывістаў. У прыватнасці, ён напісаў у каментарах слова «мразь» і некалькі іншых напаўцэнзурных выразаў.
У судовым пасяджэнні 27 снежня Сяргей стаў адмаўляць, што пісаў менавіта ён. Бо дакладна не памятаў – даўно было. Казаў аб тым, што з ягонага акаўнта мог напісаць і нехта іншы.

Але суд пагадзіўся з аргументамі дзяржаўнага абвінаваўцы і палічыў, што Парфяненкаў сапраўды абразіў міліцыянта. Суддзя Дзмітрый Разумовіч прызнаў мужчыну вінаватым і прызначыў яму пакаранне ў выглядзе абмежавання волі з накіраваннем ва ўстанову адкрытага тыпу тэрмінам на два з паловай года. У якасці матэрыяльнай кампенсацыі маральнай шкоды аршанец павінен выплаціць супрацоўніку ДАІ 1750 рублёў.

**09.01.2022**

У апошняй дэкадзе снежня 2021 году рашэннем раённых судоў Віцебскай вобласці 14 медыярэсурсаў былі залічаныя ў рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. Пры гэтым суды скарысталіся правам неадкладнага выканання сваіх рашэнняў, паколькі, на думку суддзяў, прамаруджванне ў выкананні рашэння можа прывесці да значнай шкоды для дзяржавы або зрабіць немагчымым самое выкананне.
Так, рашэннем суду Чыгуначнага раёну Віцебску носьбітамі экстрэмісцкіх матэрыялаў сталі інтэрнэт-рэсурс «Чорная кніга акупантаў і памагатых рэжыму – Не разбіць, не спыніць, не стрымаць!», Telegram-канал «Стачка Нафтана», Instagram-паблік «Стачкам ААТ «Нафтан», суполка ў сацсетцы «ВКонтакте» «Стачка ААТ «Нафтан», старонка ў Facebook «Стачкам ААТ »Нафтан», суполка сацыяльнай сеткі »ВКонтакте» «Гэта Віцебск, дзетка! [Тыповы Віцебск]».
У судзе Кастрычніцкага раёну Віцебску вырашылі, што Telegram-каналы з назвамі «Хопіць Баяцца! – Таццяна Мартынава», «КДБ З НАРОДАМ!», «Армія з Народам – Chat», «Армія з народам» і «Партызаны 97%» маюць кантэнт экстрэмісцкага зместу.
У судзе Гарадоцкага раёну Віцебскай вобласці пагадзіліся з меркаваннем праваахоўнікаў аб экстрэмісцкім змесце публікацый, размешчаных у Telegram-чаце «Гарадок для Жыцця NEW» і Telegram-групе «Гарадок 97%». Падобнае рашэнне прыняў і суд Наваполацку ў дачыненні да Telegram-каналу «Стачка Нафтана».
Цяпер улады не абцяжарваюць сябе абавязкам называць, у адпаведнасці з патрабаваннем нарматыўна-прававых дакументаў, публікацыі, праз якія яны ўносяць медыярэсурс у рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў. Апошнім часам гэтая працэдура мае фармальны характар, а суды выносяць рашэнне канвеерным спосабам.
Неабходна адзначыць, што практычна ва ўсіх выпадках ініцыятыва падачы заяваў у суды аб прызнанні інфармацыйнай прадукцыі экстрэмісцкімі матэрыяламі сыходзіць ад кіраўніцтва 7-га ўпраўлення (па Віцебскай вобласці) ГУБАЗІКа МУС Рэспублікі Беларусь.

**10.01.2022**

Палітвязня **Максіма Знака**, якога асудзілі на 10 гадоў калоніі, этапавалі для адбыцця пакарання ў папраўчую калонію Віцьба-3. У апошніх лістах палітвязень паведамляе, што пакуль знаходзіцца на каранціне. Да гэтага Максім Знак, як мяркуецца, быў змешчаны ў віцебскі СІЗА-2. У верасні 2021 году яго прысудзілі да 10 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму.
«Я хацеў падарожнічаць, але крыху павандраваў у канцы года. Затое адразу – у культурную сталіцу», – напісаў Максім Знак у лісце, адпраўленым 31 снежня на адрас сваёй сястры.
Палітвязень расказаў у лісце, што напісаў 6181 ліст на волю.

**12.01.2022**



На сваёй старонцы ў Facebook юрыст ліквідаванага «Офісу па правах людзей з інваліднасцю» **Алег Граблеўскі** паведаміў, што паспяхова пакінуў Беларусь і зараз знаходзіцца па-за дасяжнасцю следчых органаў краіны. Дзяржава выставіла супраць яго абвінавачанне паводле артыкулу 209 («Махлярства») за нібыта завалоданне грашыма арганізацыі.
«Вельмі ўдзячны маім паручальнікам, якія з гонарам прайшлі гэтыя выпрабаванні. Увесь час зняволення беларускія і міжнародныя праваабарончыя арганізацыі, журналісты, палітыкі, грамадскія актывісты змагаліся за нашае вызваленне. Іх праца не была марнай. З болем і цяжкім сэрцам я вымушаны быў пакінуць Радзіму. Але, дзе б ні жыў, я буду рабіць усё, каб наша краіна стала вольнай. Жыве Беларусь!» – дадаў.

**13.01.2022**

12 студзеня 2022 года Віцебскі абласны суд па звароце Упраўлення юстыцыі Віцебскага аблвыканкаму ліквідаваў 5 раней зарэгістраваных грамадскіх аб'яднанняў. Гэта страта для грамадзянскай супольнасці вобласці і краіны. Пад ліквідацыю трапілі спартовы клуб «Віцьбіч», «Таварыства дружбы» Полацк-Фрыдыхсхафен«, Віцебскі дзіцячы хоспіс, «Таварыства пчаляроў-аматараў» і аб’яднане «Шлях з варагаў у грэкі».
Закрыць Віцебскае грамадскае аб'яднанне «Спартыўны клуб воднага пола «Віцьбіч» – такое рашэнне прыняла суддзя Віцебскага абласнога суда Наталля Хількевіч. Гэтая спартовая арганізацыя была зарэгістраваная ў 2006 годзе і займалася папулярызацыяй водных відаў спорту.
Па патрабаванні юстыцыі намаганнямі суддзі Таццяны Дзегцяровай спыніла сваё юрыдычнае існаванне Таварыства дружбы «Полацк-Фрыдыхсхафен». Таварыства было зарэгістраванае як аб’яднанне грамадзян у 1997 годзе. За ўсю сваю гісторыю члены арганізацыі садзейнічалі ўмацаванню і развіццю добрасуседскіх узаемаадносін паміж беларускім і нямецкім народамі. У свой час пра арганізацыю і яе дзейнасць пісала газета "Полацкі веснік".
Тая ж суддзя Наталля Хількевіч ліквідавала грамадскую дабрачынную арганізацыю «Віцебскі дзіцячы хоспіс», які праіснаваў 22 гады. За гэты час арганізацыя змагла дапамагчы многім сем'ям, дзеці ў якіх пакутавалі ад цяжкіх невылечных хваробаў. У 2001 годзе пра працу хоспіса пісала газета "Советская Белоруссия".
Суддзя Віктар Быстроў пазбавіў дзейнасці чальцоў Дубровенскага грамадскага аб'яднання «Таварыства пчаляроў-аматараў». Дубровенскае грамадскае аб'яднанне «Таварыства пчаляроў-аматараў» было адной з шасці беларускіх арганізацый, якія ў 2014 годзе заснавалі Саюза беларускіх пчаляроў. Цяпер гэты прафесійны саюз, у якім больш за 2,5 тысячы чалавек, будзе існаваць без сваіх паплечнікаў з Дуброўна.
Той жа Быстроў пазбавіў статусу юрыдычнай асобы Эка-культурнае і адукацыйнае грамадскае аб’яднане «Шлях з варагаў у грэкі». Грамадзяне, якія былі аб'яднаныя ў межах арганізацыі «Шлях з варагаў у грэкі» імкнуліся па-новаму паглядзець на «горад мастакоў Малевіча і Шагала». Яны імкнуліся напоўніць Віцебск новымі візуальнымі і культурніцкімі аб’ектамі. У 2020 годзе нязменны кіраўнік гэтай арганізацыі мастак Віктар Буга прапанаваў гарадскім уладам Віцебску стварыць музей Халакоста.

**14.01.2022**

Самымі выніковымі «знішчальнікамі ТГ» былі раённыя суды Віцебску. Ім удалося «знішчыць» 74 «электронных экстрэмістаў». На рахунку астатніх раённых судоў вобласці толькі 16 «перамог». Больш за ўсіх шчыраваў суд Чыгуначнага раёну Віцебску.
Суд Чыгуначнага раёну Віцебску ў 2021 годзе вынес 25 рашэнняў у дачыненні да 54 медыярэсурсаў. Суд Кастрычніцкага раёну прыняў 21 рашэнне ў дачыненні да 21 тэлеграм-каналу. Суд Першамайскага раёну зрабіў гэта адзін раз і прызнаў наяўнасць экстрэмісцкіх матэрыялаў у адным інтэрнэт-рэсурсе.
Калі казаць пра выніковасць, то далей ідуць раённыя суды Віцебскай вобласці, якія прынялі рашэнні па 16 рашэнняў у дачыненні да 16 ТГ. Так, суд Наваполацку прызнаў экстрэмісцкімі матэрыяламі 5 рэсурсаў, суд Гарадоцкага раёну – 3, Расонскага і Лепельскага па 2, суд Дубровенскага, Шаркаўшчынскага, Глыбоцкага і Мёрскага раёнаў – па адным.

**15.01.2022**

Суд Дубровенскага раёну вынес прысуд паводле арт. 369 КК («Знявага прадстаўніка ўлады») у дачыненні 40-гадовага спартоўцы **Юрыя Свіціна**. Па версіі следства, ён абразіў пракурора Дубровенскага раёну Міхаіла Пацеева. Суддзя Марыя Цыклінская прызначыла пакаранне ў выглядзе трох гадоў абмежавання волі без накіравання ва ўстанову адкрытага тыпу і штраф 2900 рублёў. Прысуд набыў ужо законную моц.




14 студзеня 2022 году судовая калегія па крымінальных справах Віцебскага абласнога суду разгледзела апеляцыйную скаргу жыхара Дуброўна Юрыя Свіціна. Калегія не пагадзілася з довадамі абароны і прысуд пакінула без змены, а скаргу – без задавальнення.

Цяпер майстру спорту, прызёру чэмпіянату Еўропы і сяміразоваму чэмпіёну Беларусі па кікбоксінгу і рукапашным баі Юрыю Свіціну давядзецца адбываць у родным Дуброўне прызначанае судом пакаранне ў поўным аб'ёме, а таксама выплаціць вялікі штраф.

**17.01.2022**

Праваабарончая супольнасць Беларусі прызнала жыхара Мёраў **Сяргея Васільева** палітвязнем. Мужчына быў затрыманы 26 жніўня 2021 году і асуджаны на тры гады абмежавання волі за паклёп на прэзідэнта (арт. 367 КК). Тэрмін адбывае ў пасёлку Круглае Магілёўскай вобласці (ПУАТ №46).
Праваабаронцы нагадваюць, што Сяргей Васільеў быў затрыманы за тое, што ў грамадскім месцы трымаў у руках плакат з надпісам «Узурпатар». Да суду мужчыну ўтрымлівалі ў жодзінскім следчым ізалятары.
Суд прызнаў Васільева вінаватым у паклёпе на прэзідэнта і прысудзіў да трох гадоў «хіміі». Стала вядома, што 28 снежня 2021 году Сяргей Васільеў пачаў адбываць пакаранне.

**17.01.2022**



Суд Віцебскага раёну прызнаў прадпрымальніка **Уладзіміра Мунякіна** вінаватым у махлярстве ў асабліва буйным памеры (ч.4 арт.209 КК.) і асудзіў на 6 гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму са штрафам у памеры 150 базавых велічынь. Паводле прысуду, Мунякін махлярскім чынам прысабечыў маёмасць 124-х пацярпелых на агульную суму каля 146 тысяч рублёў.
Суд над Уладзімірам Мунякіным пачаўся ў Віцебску яшчэ ў кастрычніку. Крымінальную справу разбіраў суддзя Міхаіл Зубеня.
Паводле пастановы суду Віцебскага раёну, абвінавачаны ў перыяд з 2017-га да 2020 году праводзіў рэкламную кампанію ў інтэрнэце, называючы сябе дырэктарам і заснавальнікам прадпрыемства «АГІС ПРО», зарэгістраванага ў Расейскай Федэрацыі. Па звестках следства, кампанія Мунякіна фактычна не ажыццяўляла ніякай фінансава-гаспадарчай дзейнасці. Абвінавачаны нібыта браў пазыкі ад насельніцтва для адкрыцця новых вытворчасцяў і ўкаранення новых тэхналогіяў у межах праектаў «Сацыяльная бяспека» і «Інтэрнэт-ІІ». У прысудзе сцвярджаецца, што Мунякін загадзя не меў намеру выконваць абавязкі па вяртанні сродкаў. Такім чынам завалодаў маёмасцю 124-х пацярпелых на агульную суму 145614,77 рублёў.
Цікава, што, па версіі следства, махлярскую схему Мунякін пачаў ажыццяўляць яшчэ на пачатку 2017 году. Але «зацікавіліся» ім толькі тады, калі той агучыў свае палітычныя амбіцыі. Таксама на сваім ютубе-канале «Сацыяльная бяспека» падчас масавых акцый у 2020 годзе заклікаў аказваць супраціў міліцыянтам. Начальнік віцебскага ГУБАЗіКу назваў яго тады «радыкальна палітызаваным блогерам».
Уладзімір Мунякін прызнаны вінаватым у авалодванні маёмасцю шляхам махлярства і на падставе ч.4 арт. 209 КК пакараны пазбаўленнем волі на 6 гадоў з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму са штрафам у памеры 150 базавых велічынь.
Як паведамляецца, з Мунякіна ўжо спагналі на карысць 39 пацярпелых больш за 115 тысяч рублёў, таксама ў якасці кампенсацыі маральнай шкоды, заяўленай 5 пацярпелымі, – 2002 рублі. Спагнаная таксама дзяржпошліна – 1292 рублі.
Прысуд не набыў законнай моцы і можа быць абскарджаны і апратэставаны.
Уладзіміра Мунякіна затрымалі 2 снежня 2020 году ў Варонежскай вобласці Расейскай Федэрацыі. Паводле яго слоў, ён паехаў да сваякоў, каб перачакаць, пакуль здымуць каронавірусныя абмежаванні ў Маскве. На той момант у Беларусі супраць яго ўжо была распачатая крымінальная справа за махлярства. Нібыта для рэалізацыі сваіх амбіцыйных планаў ён збіраў у людзей грошы, абяцаючы вялікі прыбытак, але абяцанні не выканаў. Як перадавала прэс-служба МУС, ён, апроч таго, абяцаў перамагчы на выбарах Лукашэнку, а збор сродкаў ладзіў «пад выглядам прэзідэнцкай кампаніі».

**23.01.2022**

Дэпартамент па гуманітарнай дзейнасці кіраўніцтва справамі прэзідэнта ў чарговы раз адмовіў Евангельскай царкве Навалукомля ў рэгістрацыі атрыманай гуманітарнай дапамогі на суму 25625 шведскіх крон (2800 долараў) ад дабрачыннай арганізацыі «Ос-Хельпен» (Швецыя) і запатрабаваў вярнуць

увесь тавар назад адпраўніку за кошт членаў царкоўнай арганізацыі.
Царква атрымала паведамленне аб прыбыцці «гуманітаркі» яшчэ 20 верасня і з таго часу тройчы падавала заяву на яго рэгістрацыю, але кожны раз атрымлівала адмоўнае рашэнне з Дэпартаменту гуманітарнай дзейнасці. Адмову на трэцюю заяву прыйшоў у апошні дзень чатырохмесячнага тэрміну дзеяння дазволу на захоўванне грузу.
Актывісты не разумеюць падставаў, на якіх улады адмовіліся прыняць у краіну гуманітарны груз, у склад якога ўваходзяць інвалідныя каляскі, адзенне, абутак, мэбля, посуд, якія павінны былі быць размеркаваныя паміж тымі, хто мае ў гэтым патрэбу.
Магчыма, дыскрымінацыйнае стаўленне да рэлігійнай суполкі звязана з тым, што яе пастар **Аляксандр Зарэцкі** падпісаў на пачатку 2021 году «Адкрыты ліст хрысціян Беларусі» супраць гвалту над удзельнікамі пратэстаў, пасля чаго яго выклікалі на допыт у Новалукомльскі аддзел міліцыі і на гутарку да ідэолага раёну, а 8 ліпеня 2021 году ў ягоным доме быў праведзеныператрус.
На гэты момант пастар Аляксандр знаходзіцца ў статусе сведкі ў крымінальнай справе і даў падпіску аб неразгалошванні матэрыялаў справы.

**24.01.2022**



Раніцай 22 студзеня ў маскоўскім метро затрымалі **Дзяніса Зорына** – грамадзяніна Расеі, які мае від на жыхарства ў Беларусі. Пры затрыманні яму паведамілі, што ён знаходзіцца ў федэральным вышуку па запыце з Беларусі – нібыта за абразу прадстаўнікоў улады. У выпадку экстрадыцыі, беларускі суд мог асудзіць Зорына да 3 гадоў пазбаўлення волі.
«Прывезлі ў аддзел паліцыі на метро «Баўманскі». Па метро везлі ў кайданках. Я ў федэральным вышуку. Паліцыянты сказалі, што, як і іншых расейцаў, адправяць у Беларусь. Звычайная практыка. Адвакат мне не патрэбны», – коратка паведаміў чытачам свайго тэлеграм-каналу Дзяніс Зорын.
Гісторыя пераследу Дзяніса пачалася 29 снежня 2020 года, калі яго затрымалі ў Верхнядзвінску на трое сутак для правядзення следчых дзеянняў у межах заведзенай у дачыненні да яго крымінальнай справы паводле арт. 369 КК («Абраза прадстаўніка ўлады») за ганебныя пасты ў сацсетках на адрас сілавікоў.
Пра сваё затрыманне і «турэмныя прыгоды» Дзяніс напісаў кнігу «72 гадзіны». 9 сакавіка 2021 года ён з'ехаў у Расею, але крымінальная справа ў Беларусі супраць яго не была закрытая.
Познім вечарам 22 студзеня пасля шматгадзіннага допыту ў следчым камітэце ў Цверы, Дзяніса вызвалілі. Расейскія паліцыянты канфіскавалі ў яго ўсе гаджэты.

**27.01.2022**

Палітзняволены праваабаронца **Леанід Судаленка** пераведзены ў папраўчую калонію №3 «Віцьба».
14 студзеня Гомельскі абласны суд адхіліў апеляцыйную скаргу праваабаронцы і пакінуў прысуд у сіле. Судаленку пакаралі трыма гадамі пазбаўлення волі ва ўмовах агульнага рэжыму.
Леанід Судаленка – старшыня Гомельскага аддзялення Праваабарончага цэнтру «Вясна», праваабаронца з 20-гадовым стажам аказання дапамогі ў аднаўленні парушаных правоў грамадзянаў. Ён дапамагаў у падрыхтоўцы і накіраванні шматлікіх індывідуальных зваротаў у Камітэт па правах чалавека ААН супраць Беларусі.
На працягу 2020 года Леанід Судаленка аказваў юрыдычную дапамогу пры абскарджанні пастаноў, вынесеных судом за ўдзел у несанкцыянаваных мітынгах, якія адбываюцца ў Гомлі пасля выбараў прэзідэнта.
Быў затрыманы раніцай 18 студзеня 2021 па дарозе на офіс у межах крымінальнай справы, узбуджанай па арт. 342 Крымінальнага кодэксу (групавыя дзеянні, якія груба парушаюць грамадскі парадак) і быў змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання.
Крыху раней у грамадска-палітычным цэнтры на вуліцы Палескай, 52, дзе знаходзіцца ў тым ліку і офіс «Гомельскай Вясны», адбыўся ператрус, які доўжыўся больш за 9,5 гадзін. Увесь гэты час у офісе знаходзіўся Леанід Судаленка. Пасля ператрусу яго даставілі ў УБАЗ, затым адпусцілі. Таксама правялі ператрус у яго доме.

**27.01.2022**

16 студзеня 2022 году ў Віцебску быў затрыманы 28-гадовы **Мікіта Палеонак**. Яго затрымалі ў межах крымінальнай справы аб абразе прэзідэнта (арт. 368 КК) і прадстаўніка улады (арт.369 КК). На час правядзення следчых дзеянняў Паленак узяты пад варту як мінімум на два месяцы і змешчаны ў Віцебскі следчы ізалятар №2.
Праваабарончая супольнасць Беларусі прызнала Мікіту Палеонка палітычным зняволенным.
«У сувязі з павелічэннем колькасці выпадкаў асуджэння і пазбаўлення волі грамадзянаў краіны па шэрагу дыфамацыйных артыкулаў Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, а таксама ў сувязі са знявагай дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь, мы, прадстаўнікі беларускай праваабарончай супольнасці патрабуем спыніць праслед праваменых форм выказвання меркаванняў, і ў чарговы раз пацвярджаючы свае неаднаразова выказаныя патрабаванні па дэкрыміналізацыі дыфамацыі і недапушчальнасці пазбаўлення волі грамадзян за абразу службовых асобаў, дзяржавы, дзяржаўных органаў і сімвалаў», - гаворыцца ў заяве праваабаронцаў.
Праваабаронцы патрабуюць неадкладна вызваліць палітвязня Мікіту Палеёнка і спыніць крымінальны праслед у дачыненні яго.
Таксама прыняць захады, скіраваныя на дэкрыміналізацыю дыфамацыйных правапарушэнняў і адмену артыкулаў Крымінальнага кодэкса, якія прадугледжваюць адказнасць за абразу дзяржавы, дзяржаўных сімвалаў і службовых асобаў, а менавіта – арт. 368, 369 КК Рэспублікі Беларусь, і спыніць усе раней распачатыя па дадзеных артыкулах крымінальныя справы.

**27.01.2022**



Супрацоўнікі МУС правялі ператрус і затрымалі 62-гадовага віцебскага актывіста **Міколу Качурца**. Пра гэта паведаміла жонка Міколы. Папярэдне, мужчыну затрымлівалі супрацоўнікі Першамайскага РАУС Віцебску. У выніку ператрусу канфіскавалі ноўтбук. Ранкам 27 студзеня стала вядома, што Качурэц змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання (ІЧУ) на 72 гадзіны.
Як расказала раніцай 27 студзеня жонка Міколы Качурца Марына, ён сам перад затрыманнем паспеў ёй пазваніць з суседскага тэлефону. Хто яго затрымлівае і робіць ператрус, дакладна не зразумеў. Паспеў паведаміць, «што размахваюць нейкай паперчынай».
Жанчына таксама паведаміла, што аднесла ў ІЧУ перадачу для Міколы – яе, хоць і з ваганнем, прынялі. Спадарыня Марына хоча трапіць на прыём да начальніка Першамайскага РАУСу Віцебску, каб дакладна даведацца аб прычынах затрымання мужа і з якой нагоды рабіўся ператрус. Пакуль ведае толькі, што Міколу затрымалі на 72 гадзіны.

## Люты 2022 года

**01.02.2022**

Суддзя Віцебскага абласнога суда Наталля Рошчына разгледзела апеляцыйную скаргу палітвязня **Аляксандра Жалязоўскага**. Такім чынам, палітвязню ў хуткім часе давядзецца адправіцца на 3 гады адбываць пакаранне ва ўстанове адкрытага тыпу.
Ацаніўшы ўсе аргументы абароны, выкладзеныя ў скарзе, суддзя Рошчына прыняла рашэнне пакінуць прысуд без змены, апеляцыйную скаргу аставіла без задавальнення.
Згодна з пастановай суда Кастрычніцкага раёну Віцебску ад 7 лістапада 2021 года асуджаны Жалязоўскі абразіў у інтэрнэце прадстаўніка ўлады (арт. 369 КК). Суддзя Кастрычніцкага раёна Віцебска Сяргей Будрэвіч, прызнаўшы 50-гадовага віцябляніна вінаватым і асудзіў яго на тры гады абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. Акрамя таго, Жалязоўскі мусіць выплаціць пацярпеламу кампенсацыю маральнай шкоды ў памеры 1000 рублёў.

**03.02.2022**

За студзень 2022 года судамі Віцебскай вобласці было прынята 13 пастаноў аб прылічэнні

камунікацыйных рэсурсаў да распаўсюджвальнікаў экстрэмісцкага кантэнту. Адзін з іх сапраўды вёў прапаганду экстрэмізму, а астатнія 12 былі звязаныя з пратэстнай актыўнасцю, якая ўзнікла па прычыне фальсіфікацыі ўладамі вынікаў галасавання падчас прэзідэнцкіх выбараў 2020 года.
Рашэннем суда Шумілінскага раёна Віцебскай вобласці ад 18 студзеня 2022 года, тэлеgram-канал з назвай "Шуміліна сёння" прызнаны інфармацыйным рэсурсам, праз які праводзілася распаўсюджванне экстрэмісцкіх матэрыялаў.
У той жа дзень з тым жа вынікам суддзя суда Чыгуначнага раёна Віцебска Святлана Варатынская вынесла пастанову ў дачыненні да тэлеgram-канала "NEXTA | НЕХТА | НАВІНЫ БЕЛАРУСІ".
19 студзеня за лічаныя хвіліны telegram-група з назвай "Віцебск і вобласць страйкуе" суд Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці прылічыў да распаўсюджвальнікаў экстрэмісцкіх матэрыялаў.
25 студзеня суддзя суда Кастрычніцкага раёна Віцебску, Алеся Жарыкава, прыняла рашэнне ў дачыненні да ўсіх матэрыялаў, размешчаных у telegram-групе "Група канала Мікалай Маслоўскі" і на telegram-каналах "Беларусь ЗА перамены" і "Бібліятэка Экстрэміста". На думку суддзі Жарыкавай гэтыя матэрыялы варта лічыць экстрэмісцкімі.

**03.02.2022**




Прадстаўнікі палітзняволенага экс-прэтэндэнта ў кандыдаты на пасаду прэзідэнта **Віктара Бабарыкі,** якога асудзілі да 14 гадоў калоніі, ад яго імя накіравалі ў Камітэт ААН па правах чалавека індывідуальнае паведамленне. У хуткім часе, паведамленне атрымае рэгістрацыйны нумар і Камітэт пачне ліставанне с дзяржаўнымі органамі Беларусі. Палітвязень Бабарыка віну не прызнаў і адбывае паказанне ў ПК №1 Наваполацка.
Крымінальны пераслед, затрыманне і заключэнне пад варту Віктара Бабарыка пазбавіла яго магчымасці выказваць сваё меркаванне ў працэсе выбараў прэзідэнта Беларусі 2020 года. Абмежаванне свабоды выказвання меркавання не было абумоўлена правамернымі мэтамі: кантэкст падзей напярэдадні затрымання і той факт, што Віктар Бабарыка быў арыштаваны ў разгар вострага палітычнага дыскурсу падчас пачатку выбарчай кампаніі, прыводзіць да высновы, што ён заключаны пад варту ў пакаранне за рэалізацыю свабоды выказвання меркавання – права, прадугледжанага пунктам 2 артыкула 19 Пакта.
Адмова Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў у рэгістрацыі Віктара Бабарыкі ў якасці кандыдата ў прэзідэнты Беларусі не была абумоўленая аб'ектыўнымі і абгрунтаванымі прычынамі. Пры гэтым ён неправамерна быў пазбаўлены права на абскарджанне рашэння ЦВК у Вярхоўным судзе. Гэта сведчыць аб парушэнні права быць абраным на дзяржаўную пасаду і права ўдзельнічаць у вядзенні дзяржаўных спраў па дыскрымінацыйных падставах – па матывах палітычных перакананняў, а таксама аб тым, што ён быў пазбаўлены сродка судовага абскарджання гэтых парушэнняў на нацыянальным узроўні (парушэнне пунктаў а) і b) артыкула 25 у сукупнасці з пунктамі 3а) і 1 артыкула 2, і артыкулы 26 Пакта).
Працяглае зняволенне пад вартай да суда, падаўжэнне ўтрымання пад вартай без уліку асабістых абставінаў Віктара Бабарыкі, пры адсутнасці доказаў яго намераў перашкодзіць расследаванню або схавацца, неабгрунтаваная адмова ва ўжыванні неізаляцыйных мер, падаўжэнне тэрмінаў утрымання пад вартай у перыяд расследавання пракурорам, а не судом, адмова ва ўдзеле Віктара Бабарыкі ў судовых пасяджэннях пры разглядзе скаргаў абароны на падаўжэнне тэрмінаў утрымання пад вартай складаюць парушэнне яго права на свабоду (артыкул 9 Пакта).
Публічныя заявы службовых асобаў дзяржавы і зацвярджэння дзяржаўных СМІ аб вінаватасці Віктара Бабарыкі да вынясення судом прысуду, яго знаходжанне ў зале суда ў клетцы і кайданках сведчаць аб парушэнні прэзумпцыі невінаватасці (пункта 2 артыкула 14 Пакта). Перашкода Віктару Бабарыку з боку органа расследавання ў падачы скаргі ў суд з мэтай абвергнуць недакладныя звесткі, якія падрываюць прэзумпцыю невінаватасці, пазбавіла яго права на эфектыўны сродак прававвой абароны і доступу да суду (парушэнне пункта 2 артыкула 14 у сукупнасці з пунктам 3а) артыкула 2 Пакта).
Перашкода абаронцам Віктара Бабарыкі ва ўдзеле ў першых працэсуальных дзеяннях, нядопуск абаронцаў у СІЗА КДБ у чэрвені і жніўні 2020 для канфідэнцыйнай гутаркі ім, а таксама устараненне ад абароны Віктара Бабарыка ўсіх чатырох яго адвакатаў, пазбаўленне іх статусу за выказванне імі прафесійнага меркавання з'яўляецца парушэннем права на абарону (пункта 3b) артыкула 14 Пакта).

Адмова ў дазволе журналістам недзяржаўных СМІ і інтэрнэт-рэсурсаў прысутнічаць у судовым пасяджэнні неабгрунтавана абмежавала правы Віктара Бабарыкі на публічнае разбіральніцтва справы (пункт 1 артыкула 14 Пакта).
Адмова суда ў далучэнні і разглядзе пісьмовых матэрыялаў, прадстаўленых абаронай у абгрунтаванне яе пазіцыі, у той час як доказы, прадстаўленыя абвінавачваннем, разглядаліся судом без усялякіх умоў, з'яўляецца парушэннем роўнасці бакоў у працэсе (пункт 1 артыкула 14 Пакта).
Абвяшчэнне ў судзе пісьмовых паказанняў сведак і абвінавачаных, дадзеных падчас папярэдняга расследавання, да допыту іх абаронай і тое, што гэтыя паказанні пакладзены ў аснову прысуду суда, парушае роўнасць і спаборнасць бакоў у судовым працэсе і правы абвінавачанага дапытваць сведак.
Разгляд крымінальнай справы па абвінавачванні Віктара Бабарыка па першай інстанцыі Вярхоўным Судом, прысуды якога не падлягаюць абскарджанню ў апеляцыйным парадку пазбавіла Віктара Бабарыка права на абскарджанне прысуду, што парушае пункт 5 артыкула 14 Пакта.
Заяўнік просіць Камітэт прызнаць парушэнне названых ім правоў па Пакту і абавязак дзяржавы даць эфектыўныя сродкі прававой абароны супраць гэтых парушэнняў шляхам вызвалення Віктара Бабарыкі, анулявання судзімасці, выплаты справядлівай кампенсацыі і вяртання маёмасці, канфіскаванай дзяржавай.

**04.02.2022**



26 лістапада 2021 года суд Першамайскага раёну Віцебску вынес прысуд 45-гадоваму Дзмітрачэнку. Ён быў прызны вінаватым у публічнай абразе прадстаўніка ўлады (арт. 369 КК) – былога кіраўніка адміністрацыі Кастрычніцкага раёну Віцебску Сяргея Сташэўскага і прыгаварыў Алега да аднаго года і шасці месяцаў абмежавання волі з накіраваннем ва ўстанову адкрытага тыпу.
Прысуд агучыў суддзя Міхаіл Юрчанка. Пракуратура прасіла суд пакараць Дзмітрачэнку двума з паловай гадамі абмежавання волі.
У ходзе папярэдняга следства было высветлена, што 12 жніўня 2020 году **Алег Дзмітрачэнка**, выкарыстаўшы свой мабільны тэлефон, са свайго ўліковага запісу «ВКонтакте», пад публікацыяй «Чыноўнік Сяргей Сташэўскі прымусіў чальцоў камісіі падрабіць пратакол» у суполцы «Гэта Віцебск, дзетка» пакінуў допіс абразлівага зместу. Напісаў нібыта ў дачыненні чыноўніка фразу «Адзін з мр…яў».
Падчас папярэдняга следства Дзмітрачэнка віны не прызнаваў. Спачатку наагул адмаўляў факт учынення ім злачынства, мяркуючы, што ягоная старонка «ВКонтакте» была ўзламаная. Потым спаслаўся на тое, што перад ягоным каментарам ужо былі каментары з негатыўнай ацэнкай учынку Сташэўскага і ягоны допіс тычыцца не чыноўніка, а менавіта аднаго з каментатараў.
Аднак на судзе Дзмітрачэнка змяніў пазіцыю: цалкам прызнаў віну і заявіў, што раскайваецца ва ўчыненым, а абразлівы допіс зрабіў пад уплывам эмоцыяў. Таксама выказаў гатоўнасць прынесці пацярпеламу публічныя прабачэнні.
Сяргей Сташэўскі таксама змяніў сваю першапачатковую пазіцыю, і ў пісьмовай заяве ўказаў, што не настойвае на прыцягненні Дзмітрачэнкі да крымінальнай адказнасці.

**04.02.2022**

Суд Аршанскага раёна і горада Оршы разгледзеў справу **Арцёма Ляшнеўскага**, якога абвінавачвалі ў здзяйсненні злачынства па артыкуле 369 КК «Абраза прадстаўніка ўлады». У віну 37-гадоваму мужчыне ставілі тое, што ў адной з сацсетак ён пакінуў абразлівы каментар у адрас гродзенскага ДАІшніка Вайцяшонка.
Пра абвінавачанага вядома, што ён працуе машыністам, і што на працы аб ім адгукаюцца як аб сапраўдным прафесіянале і станоўчым з усіх бакоў чалавеке. Яго калегі даслалі ў суд хадайніцтва, у якім прасілі пакараць Арцема не «хіміяй з накіраваннем», а «хатняй хіміяй», бо не хапае кваліфікаваных машыністаў і рабочы калектыў паручаецца за яго.
Таксама вядома, што пацярпелы адмовіўся ад маральнай кампенсацыі і прасіў строга не караць Арцёма, а эксперты доўга не маглі даказаць, што абразлівы каментар датычынна менавіта Вайцешонка, бо напісаны ён быў вельмі абстрактна, без указання іменаў, але менавіта пад пастам таго самага ДАІшніка Вайцяшонка.

Тым не менш, суддзя Святлана Кузьмічонак прызначыла Ляшнеўскаму 2,5 года «хіміі». Менавіта такі тэрмін для абвінавачанага запрошваў і пракурор.
Цікава дэталь біяграфіі асуджанага. Артём быў сябром участковай выбарчай камісіі №58 ад Аршанскай гарадской арганізацыі "БРСМ", калі ў верасні 2012 года абіралі дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў 5 склікання.

**05.02.2022**



У судзе Кастрычніцкага раёна Віцебска скончыўся разгляд крымінальнай справы ў дачыненні да 39-гадовага жыхара Віцебска дырэктара ПУП **Аляксандра Міхайлава.** Суддзя Сяргей Будрэвіч прызнаў падсуднага вінаватым у пагрозе ў дачыненні да службовай асобы, якая выконвае службовыя абавязкі (арт. 366 КК РБ), абразе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (арт. 368) і абразе прадстаўніка ўлады (арт. 369) і прызначыў яму пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на 2 гады з адбываннем пакарання ў калоніі з агульным рэжымам.
Падчас судовага працэсу, бок абвінавачання прадстаўляў памочнік пракурора Віцебску Аляксандр Філіпенка. Ён заявіў, што падсудны ў ТГ "Віцебск 97" і "Карнікі Беларусі" на працягу 2020 і 2021 гадоў пакідаў публікацыі і фота з сынам з месцаў правядзення актаў пратэсту ў абласным цэнтры.
У мабільным тэлефоне Міхайлава следчыя знайшлі каментары ў дачыненні да некалькіх міліцыянтаў, якія праходзяць службу ў Гомелі, Полацку і Барысаве, а таксама ў дачыненні да вайскоўца 103-й Віцебскай асобнай паветрана-дэсантнай брыгады і А.Р. Лукашэнку.
Падчас следства і на судзе Міхайлаў прызнаў сваё дачыненне да напісання абразлівых публікацый, пакінутых у ТГ, і раскаяўся ў зробленым.

**08.02.2022**

Пракурор Віцебскай вобласці Ігар Украінец пастанавіў абмежаваць доступ да інтэрнэт-сайтаў «zubr.media» і «xx2022.org». На думку пракурора, гэтыя інфармацыйныя рэсурсы распаўсюджвалі інфармацыю, якая можа нанесці шкоду нацыянальным інтарэсам Рэспублікі Беларусь.
Пры даследаванні зместу матэрыялаў, апублікаваных на гэтых сайтах, пракуратурай было ўстаноўлена, што на интэрнэт-рэсурсах «xx2022.org» і «zubr.media», апублікаваныя недакладныя звесткі аб лютаўскім «рэферэндуме», а таксама незаконныя заклікі да грамадзян краіны псаваць бюлетэні падчас галасавання.
Так, ва ўлётцы «Перакрэслі Падман» на сайце xx2022.org пракуратура пабачыла заклік да псавання бюлетэняў для галасавання.
«Рэферэндум» – гэта падман і злачынства, у якім нас пераконваюць прыняць удзел. Нам прапануюць ілжывы выбар паміж новай і старой Канстытуцыяй. Насамрэч гэта выбар паміж Лукашэнкам і Лукашэнкам. Падман ляжыць у аснове рэжыму: нам хлусяць пра заробкі, нам хлусяць на выбарах, нам хлусяць пра каронавірус. Але праўда на нашым баку. Мы прыйдзем на рэферэндум і перакрэслім абодва хлуслівыя прапановы. Гэта першы крок да праўды».
А ў матэрыяле на сайце zubr.media "Лукашэнка хоча, каб беларусы не ўдзельнічалі ў рэферэндуме" вартавыя законнасці ўстанавілі «недакладныя звесткі аб запланаваным рэферэндуме».
«Набліжаным Лукашэнку патрэбная ўпэўненасць у будучыні. Ім патрэбная падстрахоўка таго, што, калі не стане Лукашэнкам, яны застануцца ва ўладзе. Новая канстытуцыя, якая патрэбная рэжыму ў будучыні, цешыць самалюбства Лукашэнкі, ён трымае рыторыку, што ўсе беларусы прымаюць гэтую канстытуцыю», – выказаў сваё меркаванне аўтар артыкула
У сваім рашэнні Ігар Украінец указаў, што матэрыялы, выстаўленыя на сайтах, матывавалі грамадзян Рэспублікі Беларусь да супрацьпраўных паводзін, дыскрэдытавалі органы дзяржаўнай улады і ў цэлым Рэспубліку Беларусь, і пастанавіў доступ да сайтаў "xx2022.org" і "zubr.media" абмежаваць на 6 месяцаў.

**08.02.2022**



38-гадовага жыхара Браслава прызналі вінаватым паводле трох артыкулаў Крымінальнага кодэксу – за заклікі да пратэстаў і распаўсюд інфармацыі пра пракурора Браслаўскага раёну, якую суд палічыў ілжывай (арт.188, ч.2 арт.203-1, ч.1 арт.342). 7 лютага справу **Алега Раманчыка** разбіраў суд Шаркаўшчыны і Шаркаўшчынскага раёну ў асобе суддзі Аксаны Табола.

Згодна з матэрыяламі справы, Алег Раманчык са снежня 2020 года па студзень 2021 года вырабіў не менш за дзесяць улётак з фатаграфіяй і асабістымі дадзенымі пракурора, дзе адлюстраваў недакладныя звесткі аб здзяйсненні пацярпелым злачынстваў пры ажыццяўленні службовых паўнамоцтваў. Яшчэ не менш як у дзесяці ўлётках ён змясціў персанальныя дадзеныя і інфармацыю аб прыватным жыцці пацярпелага і месцы ягонага жыхарства. Паводле следчых, ён паведаміў інфармацыю аб прыватным жыцці і персанальныя дадзеныя без згоды раённага пракурора, распаўсюдзіўшы ўлёткі праз паштовыя скрыні жыхароў Браслава.

Таксама следства паказала, што з 1 снежня 2020 года па 28 студзеня 2021 года Алег Раманчык вырабіў не менш за пяць улётак, якія змяшчаюць заклік да групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак. І таксама распаўсюдзіў іх у розных месцах Браслава.

Паводле арт.188 Крымінальнага кодэксу яму прысудзілі год абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу (ПУАТ), паводле ч. 2 арт. 203-1 КК – арышт, тэрмінам адзін месяц, паводле ч.1 арт. 342 КК – абмежаванне волі з накіраваннем у ПУАТ на тэрмін 3 гады. Па сукупнасці пакаранняў шляхам паглынання менш строгага тэрміна больш строгім канчатковае пакаранне прызначанае ў выглядзе абмежавання волі тэрмінам тры гады з накіраваннем у ПУАТ. Камп'ютар і прынтар канфіскаваныя як сродкі здзяйснення злачынства.

**09.02.2022**

Беларускія праваабарончыя арганізацыі 8 лютага зрабілі заяву аб прызнанні палітвязнямі пяці зняволеных па шэрагу дыфамацыйных артыкулаў Крымінальнага кодэксу краіны. Сярод прызнаных – і прадпрымальнік з Віцебску **Аляксандр Міхайлаў**, якога 4 лютага асудзілі на два гады калоніі за абразу прэзідэнта і пагрозы ў дачыненні службовай асобы.

4 лютага ў судзе Кастрычніцкага раёну Віцебску скончыў разгляд крымінальнай справы ў дачыненні да 39-гадовага жыхара Віцебску дырэктара прыватнага прадпрыемства Аляксандра Міхайлава.

Суддзя Сяргей Будрэвіч прызнаў падсуднага вінаватым у пагрозе ў дачыненні да службовай асобы, якая выконвае службовыя абавязкі (арт. 366 КК РБ), абразе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (арт. 368) і абразе прадстаўніка ўлады (арт. 369) і прызначыў яму пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на 2 гады з адбываннем пакарання ў калоніі агульнага рэжыму.

Падчас судовага працэсу бок абвінавачання прадстаўляў памочнік пракурора Віцебску Аляксандр Філіпенка.

Праваабаронцы настойваюць на неадкладным вызваленні палітвязня Аляксандра Міхайлава і спыненні крымінальнага пераследу ў дачыненні яго.

**09.02.2022**



У судзе Кастрычніцкага раёну Віцебску 9 лютага скончыўся судовы працэс над 51-гадовым **Андрэем Кузняцовым**, у дачыненні якога была распачатая крымінальная справа за абразу менскай суддзі Вікторыі Шабуні (арт. 391 КК РБ). Мужчыну прызналі вінаватым і пакаралі абмежаваннем волі на 2,5 года без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу.

Таксама суд пастанавіў канфіскаваць смартфон Huawei і іншыя прылады, з дапамогай якіх Андрэй Кузняцоў зняважыў суддзю Шабуню.

Справу, якая цягнулася амаль 3 месяцы, разбірала суддзя Ганна Тылец.

Абвінавачанне падтрымлівала старшая пракурорка аддзелу

пракуратуры Віцебскай вобласці Драгель, якая патрабавала пакараць Кузняцова 2 гадамі і 6 месяцамі «хатняй хіміі».
Падчас судовага следства асуджаны на «хатнюю хімію» прызнаў сваю віну часткова і раскаяўся ў зробленым.
Пацярпелая суддзя Вікторыя Шабуня на разгляд справы ні разу не з’явілася, чым паказала сваю абыякавасць і фактычна разбурыла ўсе аргументы абвінавачання. З улікам таго, што лінгвістычная экспертыза дала расплывістую характарыстыку словаў, якія абразілі гонар суддзі, і калі б гэтую справу разглядаў кампетэнтны, незалежны і бесстаронні суд, то Кузняцоў быў бы апраўданы.

**12.02.2022**

8 кастрычніка 2021 году Камітэт разгледзеў паведамленне № 2708/2015 атрыманае ад віцябляніна **Пятра Берлінава**, і прыйшоў да высновы, што беларуская дзяржава з'яўляецца парушальнікам ягонага права на асабістую недатыкальнасць, а таксама права на свабоднае выказванне свайго меркавання і на ўдзел у мірных сходах.
Прычынай, якая схіліла Пятра Берлінава звярнуцца ў КПЧ, было рашэнне суддзі суду Чыгуначнага раёну Віцебску Алены Цыганковай, якая пакарала яго адміністрацыйным арыштам за нібыта ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве.
Не з'яўляючыся журналістам і не знаходзячыся ў шэрагах ніводнай палітычнай партыі або грамадзкай арганізацыі, Берлінаў – выпадкова – узяў удзел у масавым вулічным мерапрыемстве – флэшмобе, які 5 лістапада 2014 году ў Віцебску правялі мясцовыя незалежныя журналісты. Публічнае мерапрыемства не было дазволенае ўладамі. А паколькі не было дазволенае, маёр міліцыі Аляксандар Рыбакоў з райаддзелу міліцыі склаў на Берлінава пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні і перадаў гэты пратакол у суд.
Падчас судовага разбору суддзя Алена Цыганкова не разабралася ў заблытанай справе і пакарала Берлінава трыма сутакамі арышту, якія ён да таго ўжо адбыў у ізалятары часовага ўтрымання Віцебску. Тым самым суддзя сваім рашэньнем прыкрыла незаконнае затрыманне Берлінава і ўтрыманне яго пад арыштам без рашэння суду.
Скаргі на незаконные пакаранне ў Віцебскі абласны і Вярхоўны суды былі адхіліныя. Пасля гэтага мужчына звярнуўся са скаргай у КПЧ ААН, каб абараніць парушаныя беларускай дзяржавай ягоныя грамадскія і палітычныя правы.
Цяпер, калі Камітэт прыняў рашэнне пра тое, што правы былі парушаныя дзяржавай, Рэспубліка Беларусь абавязаная даць Берлінаву эфектыўны сродак прававой абароны і поўнае пакрыццё прычыненай яму шкоды. Адпаведна, дзяржава абавязаная, у прыватнасці, даць аўтару скаргі адэкватную грашовую кампенсацыю, у тым ліку пакрыць усе судовыя выдаткі, панесеныя Берлінавым. Дзяржава таксама абавязаная прыняць усе неабходныя меры для прадухілення такіх парушэнняў у будучым, у прыватнасці шляхам перагляду свайго нацыянальнага заканадаўства аб масавых мерапрыемствах і яго прымянення, з тым каб прывесці яго ў адпаведнасць са сваімі абавязкамі і прыняць меры, накіраваныя на дапамогу грамадзянам у рэалізацыі іх правоў на свабоднае выказванне свайго меркавання і на ўдзел у мірных сходах.
Камітэт таксама жадае атрымаць цягам 180 дзён ад беларускага ўраду інфармацыю аб захадах, зробленых для рэалізацыі рашэння Камітэту ў справе Пятра Берлінава.
Беларускай дзяржаве Камітэт прапануе таксама апублікаваць гэтае рашэнне ў дзяржаўных СМІ і забяспечыць яго шырокі распаўсюд на афіцыйных мовах, прызнаных у Беларусі.

**12.02.2022**

У спіс рэсурсаў ПЦ "Вясна", прызнаных экстрэмісцкімі рашэннем суда Чыгуначнага раёна Гомеля ад 27 студзеня 2022 года трапілі і віцебскія медыя праваабарончага цэнтра “Вясна”.
Інтэрнет-старонка сацыяльнай сеткі "Facebook" з назвай "Віцебская Вясна", якая мае ідэнтыфікатар https://facebook.com/groups/vjasna; Інтэрнет-старонка сацыяльнай сеткі "Аднакласнікі" з назвай "Віцебская Вясна", якая мае ідэнтыфікатар https://ok.ru/vitebskspring; Інтэрнет-старонка сацыяльнай сеткі "Facebook" з назвай "Віцебская Вясна", якая мае ідэнтыфікатар https://facebook.com/vitebskspring/?ref=page_internal; Інтэрнэт-старонка "Віцебск Рэгіянальны сайт па правах чалавека Вясна", якая мае ідэнтыфікатар https://vitebskspring.org.
Праваабаронцы папярэджваюць, тых чытачоў, якія карыстаюцца інфармацыяй з чатырох пералічаных вышэй рэсурсаў аб адміністратыўнай адказнасці па ч. 2 арт. 19.11 КАаП у якой прапісана адказансць за распаўсюджванне інфармацыйнай прадукцыі, уключанай у рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў.

За падобнае правапарушэнне суд можа пакараць накладаннем штрафу ў памеры ад дзесяці да трыццаці базавых велічынь з канфіскацыяй прадмета адміністрацыйнага правапарушэння або арыштам тэрмінам да 15 сутак за кожны даказаны акт распаўсюду "экстрэмісцкіх" матэрыялаў.
Таму трэба быць асцярожным і абачлівым: не пакідайце каментароў пад публікацыямі, не давайце на іх спасылкі і не рабіце перапосты матэрыялаў на свае ці іншыя рэсурсы.

**14.02.2022**

У Віцебскай вобласці налічылі каля 12 000 працаздольных грамадзянаў, «не занятых у эканоміцы», якія вымушаныя будуць аплачваць падвышаныя рахункі за камнульныя паслугі. Пра гэта заявіў старшыня камітэту па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкаму **Аляксандр Хрыстафораў.**
Жыхары вобласці, якія трапілі ў гэтую катэгорыю, вымушаныя аплачваць так званы «падатак на дармаедства» – разлічвацца за камунальныя паслугі па падвышаных тарыфах.
Як запэўніў журналістаў аднаго з праўладных выданняў Аляксандр Хрыстафораў, зроблена гэта не таму, што ў дзяржавы няма магчымасцяў дапамагаць беспрацоўным або праз неэфектыўнасць эканомікі, а толькі «у мэтах дадатковага стымулявання да працаўладкавання».
Паводле інфармацыі чыноўніка, каб скласці і ўпарадкаваць гэты спіс «дармаедаў», абавязаных аплачваць павышаныя камунальныя плацяжы, у 2021 годзе 26 адпаведных камісіяў правялі 796 пасяджэнняў, з якіх 138 былі выязнымі. Праз падобныя камісіі прайшло каля 66000 жыхароў Віцебскай вобласці.
У адпаведнасці з Дэкрэтам №3 «Аб садзейнічанні занятасці насельніцтва» і пастановай Савету міністраў «Аб вызначэнні паслуг, якія прадастаўляюцца працаздольным грамадзянам, не занятым у эканоміцы…», грамадзяне абавязаныя аплачваць па падвышаных тарыфах ацяпленне, гарачае водазабеспячэнне і газазабеспячэнне пры наяўнасці газавага ацяпляльнага абсталявання.
У сярэднім, напрыклад, за ацяпленне такім грамадзянам даводзіцца плаціць у 5 разоў больш, чым астатнім. А ў цэлым аплата за камунальныя паслугі павялічваецца ў некалькі разоў.

**18.02.2022**

Суд Першамайскага раёну Віцебску асудзіў на паўтара года «хіміі» **Руслана Чэркаса** за каментар пакінуты ў «Аднакласніках» у чэрвені 2020 году на старонцы Вольгі Карач. Суддзя Наталля Карабліна прызнала мужчыну вінаватым у публічнай абразе прадстаўніка ўлады (арт. 369 КК РБ).
Паводле матэрыялаў справы, Руслан Чэркас «у чэрвені 2020 году з мабільнага тэлефона ў сацыяльнай сетцы на агульнадаступнай старонцы пад публікацыяй у дачыненні да прадстаўніка ўлады – інспектара ДПС ДАІ АУС Ганцавіцкага райвыканкаму, публічна размясціў каментар, у якім змяшчалася выяўленая ў непрыстойнай, лаянкавай форме абраза на адрас апошняга».
Абвінавачаны прызнаў сваю віну ў поўным аб'ёме і ад паслуг адваката адмовіўся. Пацярпелы міліцыянт Ігар Вольніч на працэс не з’явіўся і запрасіў 1500 рублёў маральнай кампенсацыі за абразу.
Руслан Чэркас заявіў, што гэта занадта вялікая для яго сума і папрасіў суд зменшыць памер кампенсацыі за маральную шкоду да 700 рублёў. У выніку пракурор запрасіў для яго пакаранне ў выглядзе абмежавання волі на паўтара года. Суддзя падтрымала бок абвінавачання і пастанавіла накіраваць мужчыну ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу тэрмінам на 1 год і 6 месяцаў. Мабільны тэлефон канфіскаваны ў даход дзяржавы як сродак учынення злачынства.
Пост Вольгі Карач з фатаграфіяй супрацоўніка ганцавіцкай дарожна-паставой службы Ігара Вольніча быў размешчаны ў «Аднакласніках» падчас прэзідэнцкіх выбараў. На фота міліцыянт падчас мірнай акцыі затрымлівае пратэстоўца, прыціснуўшы каленам ягоную галаву да зямлі. Фотаздымак суправаджаў надпіс: «Гэта я так спрытна прыціснуў да тратуара галаву мірнага дэманстранта падчас затрымання. Ігар Вольніч, супрацоўнік ДПС АДАІ г. Ганцавічы». Гэты пост выклікаў шквал негатыўных каментароў. Многія з іх сталі падставай для завядзення крымінальных справаў.

**22.02.2022**

Віцяблянін **Вадзім Кузьмін** зарэгістраваўся назіральнікам на «рэферэндум» ад партыі «Справядлівы свет» адразу на двух участках (участак №1 у бібліятэцы імя Астроўскага па вул. Дзімітрава і ўчастак №2 у індустрыяльна-тэхналагічным каледжы па вул Кірава). Парушэнні ён заўважыў у тым, што на першым участку не быў вывешаны спіс сябраў камісіі, тым часам як на другім участку такі спіс быў.
Затое скрыня перад пачаткам галасавання была апячатаная такім чынам, што пад крышку магла пралезці далонь. Назіральнік напісаў скаргі ў акруговую камісію, а на ўчастках тым часам вырашылі

пазбавіцца ад яго.
«Да мяне падыходзяць і кажуць: «Ведаеце, Вадзім Мікалаевіч, у нас ужо ёсць назіральнікі ад БРСМ, ад Белай Русі, ад Фонду Міру. Трох назіральнікаў нам дастаткова, і мы клапоцімся пра ваша здароўе: зараз людзі хварэюць на каронавірус, ідзіце лепей дахаты». Значыць, як рэферэндум праводзіць, дык каронавірусу няма. А як мне працаваць назіральнікам, дык ёсць небяспека?» – кажа Вадзім Кузьмін.
Назіральнік падаў скаргі ў акруговую камісію, у тым ліку і пра тое, што яго выдалілі з участкаў. Скаргі ён адвёз асабіста, але не паспеў дабрацца дахаты, як яму патэлефанавалі з пракуратуры і запрасілі прыехаць «на прафілактычную гутарку». Калі ж ён адмовіўся, то пракурорскія работнікі прыгразіліся прыехаць да яго дахаты, нягледзячы на тое, што ён даглядае хворую 92-гадовую маці.

**23.02.2022**

Увечары 21-га лютага віцебскага фотамастака і краязнаўцу **Віктара Барысенкава** забралі адбываць 10-суткавы арышт, прысуджаны яшчэ ўвосень. Пра гэта паведаміў адзін з сяброў Віктара Барысенкава, які прасіў не называць ягонае імя. Па звестках крыніцы, на 10 сутак фотамастака асудзілі за той жа фотаздымак, за які ў жніўні 2021 году ён адбыў 7 сутак арышту, але з прысудам не згадзіўся.
Пазней ён спрабаваў аспрэчыць рашэнне рашэнне суду Кастрычніцкага раёна ў Віцебскім абласным судзе, але яму гэта не ўдалося. Сваім абурэннем судовымі пастановамі ён падзяліўся ў сацсетках, зноўку апублікаваўшы гістарычнае фота – маўляў, гэта ж не ён намаляваў той сцяг! За гэта па тым самым артыкуле яму прысудзілі яшчэ адзін арышт – ужо на 10 сутак».
Агулам Віктару Барысенкаву прысудзілі 17 сутак.

**23.02.2022**



Доктару **Уладзіміру Мартаву**, затрыманаму на лецішчы пад Лепелем, прысудзілі 7 сутак адміністратыўнага арышту. Яго прызналі вінаватым у парушэнні заканадаўства аб масавых мерапрыемствах. Паводле жонкі Уладзіміра Мартава, яго судзілі за бел-чырвона-белы сцяжок на аватарцы ў сацыяльнай сетцы, а таксама за нейкую песню (пакуль не зразумела, таксама змешчаную ў сацсетках, або знойдзеную на дыску, які забралі пры затрыманні). На яго быў складзены пратакол паводле арт. 24.23 КаАП РБ («Парушэнне заканадаўства аб масавых мерапрыемствах»). Сваю віну Мартаў не прызнаў. Паведамляецца, што лекі для доктара дзякуючы настойлівасці родных усё ж прынялі (мужчына мае гіпертанію).
Уладзімір Мартаў – былы загадчык аддзялення анестэзіялогіі і рэанімацыі Віцебскай лякарні хуткай дапамогі. Ён быў адным з першых беларускіх медыкаў, хто адкрыта распавядаў пра рэальную сітуацыю з каронавірусам. Увесну 2021 года з рэаніматолагам не працягнулі кантракту.

**23.02.2022**

Пра нечаканы візіт міліцыі паведаміла **Вольга Верамеенка**. Паводле актывісткі, міліцыянты наведаліся на былы адрас яе пражывання і «хацелі паразмаўляць».Ператрусы ў гэтыя дні адбыліся ў некалькіх актывістаў рэгіёну.
«23 лютага трое супрацоўнікаў аршанскіх органаў (дакладна не вядома, якіх, бо прадстаўляцца не ў іхных правілах) наведаліся па маім былым адрасе пражывання ў Воршы, дзе зараз жывуць мая сястра з няпоўнагадовым дзіцём і мой бацька, інвалід 1 групы. Пагаварыць яны са мной хацелі! Цікава, аб чым? Можа ўспомнілі, як я ў 2015 годзе напісала шэсць скаргаў на старшыню выбарчай камісіі, што была ў школе №3? То супакойцеся! Я не збіралася ісці на самазваныя рэферэндумы, нават каб і была ў краіне», - напісала Вольга Верамеенка.
Вольгу Верамеенку трымалі на «сутках», накладалі штрафы і забаранялі ёй гандляваць таварамі ў нацыянальных колерах, канфіскоўваючы іх цэлымі скрынямі. Урэшце крама «Адметнасць» зачынілася праз бясконцыя падатковыя праверкі. А Вольга Верамеенка цяпер вымушана жыве за межамі Беларусі.

**24.02.2022**

Суддзя Верхнядзвінскага суду Людміла Каваленка прызнала **Дзяніса Пяцько** вінаватым паводле двух артыкулаў Крымінальнага Кодэксу: за абразу Аляксандра Лукашэнкі (арт.368) і за абразу прадстаўніка ўлады (арт.368).
Падставай для судовага разбіральніцтва сталі каментары ў сацыяльных сетках, дзе Дзяніс Пяцько ў негатыўным святле выказаўся пра кіраўніка Беларусі і прадстаўнікоў Мінскай пракуратуры. Ён быў затрыманы 19 кастрычніка 2021 году ў межах распачатай супраць яго крымінальнай справы, але пазней яго адпусцілі, і да суду ён быў на волі.
Судовы працэс некалькі разоў пераносілі, і вырак быў абвешчаны толькі на чацвёртым пасяджэнні, хаця яшчэ падчас другога ў сваёй прамове Дзяніс Пяцько цалкам прызнаў віну.
Суддзя вырашыла пакараць падсуднага 2,5 гадамі «хіміі» – роўна такое пакаранне прасіў вынесці прысутны на судзе работнік пракуратуры.

**28.02.2022**

**Уладзімір Булаўскі** асуджаны да 15 сутак арышту. Вядомы ў Віцебску моладзевы актывіст быў затрыманы 27 лютага на плошчы Перамогі.
Пра свой намер выйсці на "галоўную плошчу гораду", як заклікалі беларусаў, гатовых пратэставаць супраць расейскага нападу на Ўкраіну, ён сам паведаміў на ўласнай старонцы ў Фэйсбуку. 28-га лютага Уладзіміра Булаўскага судзілі ў судзе Чыгуначнага раёну Віцебску, ён прызнаны вінаватым у несанкцыянаваным пікетаванні. Цяпер ён знаходзіцца ў віцебскім ІЧУ.

**28.02.2022**



Каля дзвюх гадзін ён быў вымушаны правесці ў аддзеле міліцыі Чыгуначнага раёну. Потым затрыманага адпусцілі, але ягоны тэлефон застаўся «у палоне».
Паводле ягоных словаў, яму не пашчасціла апынуцца ў раёне чыгуначнага вакзала 28 лютага каля 18 гадзін: якраз на гэты час каля чыгуначных вакзалаў розных гарадоў Беларусі былі анансаваныя антываенныя акцыі.
**Сяргей Серабро** добра вядомы віцебскім міліцыянтам, і яго з'яўленне на чыгуначным вакзале магло выклікаць пэўныя падазрэнні: ён з'яўляецца заснавальнікам незалежнага інтэрнэт- рэсурсу «Народныя Навіны Віцебску». Верагодна, супрацоўнікі міліцыі вырашылі, што спадар Серабро збіраецца рабіць рэпартаж з несанкцыянаванай акцыі.
Сайт «Народныя Навіны Віцебску» існуе ўжо 16 гадоў, і яго неаднаразова спрабавалі заблакаваць. У жніўні 2020 года Мініформ заблакаваў адзін з паддаменаў — news.vitebsk.cc, прычыны блакавання не паведамляліся. Цяпер рэсурс працягвае працаваць па іншым адрасе, але час ад часу карыстальнікі інтэрнэту маюць праблемы з доступам, бо спробы заблавакаць СМІ.

## Сакавік 2022

**02.03.2022**

Суд Лепеля і Лепельскага раёна прызнаў **Міхаіла Чумакова** вінаватым у здзяйсненні злачынства паводле арт. 369 «Абраза прадстаўніка ўлады», прысудзіўшы яму 2 гады «хіміі» і пастанавіўшы выплаціць Вольнічу маральную кампенсацыю.
Даведку аб інваліднасці жонкі пасля заканчэння суда ў абвінавачанага так і не прынялі.
Пра абвінавачанага вядома, што яму 59 гадоў. Мужчына жанаты, яго жонка мае інваліднасць і патрэбу ў штодзённай дапамозе. На ўсіх месцах працы, дзе раней мужчына быў працаўладкаваны, яго характарызуюць як станоўчага з усіх бакоў чалавека.
Міхаіла Чумакова абвінавачваюць у тым, што 22 чэрвеня 2020 года ў Аднакласніках пад пастом Вольгі Карач мужчына пракаментаваў фота, на якім старэйшы лейтэнант Вольніч разам з іншымі супрацоўнікамі міліцыі жорстка затрымлівае мужчыну. Фатаграфія, пра якую ідзе гаворка, ужо стала знакамітай. Бо пасля таго паста ў Аднакласніках, негатыўныя каментары пад якім пакінулі сотні людзей, Вольніч падаў у суда на сваіх крыўдзіцеляў ужо шмат разоў. І працягвае гэта рабіць, спаганяючы з усіх каментатараў маральную кампенсацыю.

Па згодзе бакоў судовае пасяджэнне па справе Міхаіла Чумакова прайшло ў скарочанай форме і заняло ўсяго 45 хвілін.
Абвінавачаны і яго жонка знаходзіліся ў вельмі падушаным стане. Раней Міхаіл Станіслававіч ніколі не прыцягваўся да крымінальнай адказнасці. Вядома таксама, што падчас следчых дзеянняў Міхаіл Чумакоў прыносіў прабачэнні Вольнічу, і што абвінавачанага ўтрымлівалі пад вартай.
Пацярпелага Вольніча апыталі па інтэрнэце. Супрацоўнік ДАІ растлумачыў, што падчас таго затрымання ён выконваў свой службовы абавязак і даручэнне вышэйстаячага начальства, а той мужчына, галаву якога ён прыціскаў каленам, быў у нецвярозым стане і раней судзімы.
Таксама Вольніч паведаміў суду, што каментар абвінавачанага прынёс яму маральныя пакуты і страх перад людзьмі, з якімі даводзілася сутыкацца па абавязку службы.
У якасці маральнай кампенсацыі Вольніч запытаў 1 500 рублёў.
Падчас судовых спрэчак бок абвінавачвання выказаўся пра тое, што віна Чумакова цалкам знайшла сваё пацверджанне, ды і сам абвінавачаны яе прызнаў.
У якасці пакарання для Міхаіла Чумакова пракурорка запытала 2 гады абмежавання волі з накіраваннем у выпраўленчую ўстанову адкрытага тыпу. Калі мужчына пачуў гэта, папрасіў суд змякчыць пакаранне, бо лічыць яго занадта жорсткім.

**02.03.2022**

27 лютага віцяблянка **Кацярына Бакан** выйшла на плошчу Перамогі ў Віцебску з букетам, які супрацоўнікі міліцыі расцанілі як атрыбут пікетавання. У судзе Чыгуначнага раёну яе прызналі вінаватай у адміністрацыйным правапарушэнні паводле адміністрацыйнага артыкула 24.23.
На плошчы Перамогі 27 лютага не адбывалася нейкіх масавых акцый, але міліцыянты пільнавалі тых, хто наважыцца пратэставаць супраць вайны ва Ўкраіне. Пад іхную ўвагу і трапіла Кацярына Бакан.
Усяго 27 лютага як на плошчы Перамогі, так і на выбарчых участках ці каля іх, было затрымана прыблізна 10 чалавек. Іх асобы высвятляюцца. На дадзены момант дакладна вядома, што таксама на плошчы Перамогі быў затрыманы вядомы ў Віцебску моладзевы актывіст Уладзімір Булаўскі. 28 лютага яму быў прысуджаны арышт на 15 сутак – таксама за ўдзел у несанкцыянаваным пікетаванні.

**03.03.2022**



Суд Наваполацка разгледзеў адміністратыўную справу старшыні Беларускага Незалежнага Прафсаюза “Нафтана” **Вольгі Брыцікавай**. Міліцыя палічыла, што надпіс на яе вопратцы – “Не вайне”, з'яўляецца пікетаваннем, склала пратакол і накіравала яго ў суд.
27 лютага супрацоўнікі міліцыі затрымалі лідэра незалежнага прафсаюза на адным з участкаў у Наваполацку, дзе праходзіла галасаванне на «рэферэндуме» па змене Канстытуцыі і да суда яна знаходзілася ў ізаляцыі.
Суд Наваполацка пагадзіўся з тым, што Брыцікава здзейсніла не дазволенае ўладамі масавае мерапрыемства, і ў рамках артыкула 24.23 (Парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў) Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях прызначыў ёй пакаранне ў выглядзе адміністрацыйнага арышту на 15 сутак.

**04.03.2022**

У Бешанковіцкім раёне затрыманы журналіст і бард **Георгі Станкевіч**. Пра гэта паведаміла ягоная жонка. Паводле яе, міліцыя палявала на Георгія ад 3 сакавіка: непадалёк ад ягонага дома ў вёсцы Старыя Ранчыцы дзяжурыла міліцэйская машына. Падобна, сачэнне адбывалася ўсю ноч, бо ўжо з раніцы супрацоўнікі МУС прыйшлі зператрусам.
Як расказала жонка затрыманага, міліцыянты прыйшлі зператрусам з самай раніцы, калі спадар Георгі выйшаў у двор, каб упраўляцца з гаспадаркай. Супрацоўнікі міліцыі пачакалі, пакуль мужчына падоіць кароў, а потым забралі гаспадара. Патлумачылі, што ён нібыта размясціў у інтэрнэце выявы з

забароненай экстрэмісцкай сімволікай.
У хаце Георгія Станкевіча правялі ператрус, забралі тэлефон і камп'ютар. Аргтэхніку забралі для праверкі прыкладна на месяц – так міліцыянты патлумачылі жонцы Георгія Станкевіча. Якія менавіта «экстрэмісцкія» выявы сталі падставай для затрымання, супрацоўнікі міліцыі не патлумачылі. Шукалі ў хаце і «нацыяналістычную» сімволіку, але нічога не знайшлі.
Незадоўга да затрымання Георгі Станкевіч казаў, што прэтэнзіі да яго могуць быць выкліканы матэрыяламі пра вайну ва Украіне, якія ён размяшчаў на сваім сайце штодня. 1 сакавіка ён размясціў там адмысловы зварот да жыхароў Бешанковіцкага раёну і раённых уладаў, дзе заклікаў усімі магчымымі спосабамі садзейнічаць спыненню вайны.

**04.03.2022**




Высвятляюцца падрабязнасці пра лёсы затрыманых на выбарчых участках 27 лютага, у дзень»рэферэндуму». Некаторыя адбылі па трое сутак за кратамі літаральна ні за што.
Праз трое сутак, якія давялося правесці ў ІЧУ, на волю выйшла студэнтка Наваполацкага дзяржаўнага ўніверсітэту **Аляксандра Бука**. Яе затрымалі на выбарчым участку разам са знаёмым, **Цімафеем Нікіпяровічам**. Аляксандра нават не мела намеру галасаваць, бо гэта быў не ейны ўчастак, і пайшла проста «за кампанію». «За кампанію» яе і затрымалі. Цімафею Нікіпяровічу прысудзілі 15 сутак арышту за тое, што ён сфатаграфаваў бюлетэнь. Па якім артыкуле яго судзілі, Аляксандра дакладна не ведае, а што да яе, то суду не было ўвогуле.
У міліцыянтаў не знайшлося аніякіх доказаў супраць дзяўчыны, якую без віны трымалі ў зняволенні. Апрача гэтага, у дзяўчыны забралі мабільны тэлефон, нібыта «для праверкі».

**04.03.2022**

Бешанковіцкі паэт і журналіст **Георгі Станкевіч,** затрыманы сёння ўранні, вярнуўся дахаты пасля суду. Суддзя Наталля Рэут аштрафавала яго на 70 базавых велічынь (2 240 рублёў) за «пікетаванне без дазволу раённай адміністрацыі». Пікетам суд палічыў фотаздымак, размешчаны на сайце «Віцебскай Вясны»: на ім Георгі Станкевіч стаіць на фоне бел-чырвона-белага сцяга.
Паводле міліцэйскага пратаколу, «1 сакавіка ў 18.15 падчас аператыўнай праверкі» супрацоўнік Бешанковіцкага РАУС Дзяніс Каваленка заўважыў на сайце «Віцебскай Вясны» фотаздымак Георгія Станкевіча. І як той ні спрабаваў тлумачыць, што не ён размяшчаў гэтае фота ў інтэрнэце, пераканаць суд не атрымалася.
Фотаздымак, які стаў падставай для затрымання і судовага разбіральніцтва, быў архіўны: на сайце «Віцебскай Вясны» ён быў размешчаны побач з антываенным зваротам Георгія Станкевіча. Жыхар вёскі Старыя Ранчыцы Бешанковіцкага раёну звярнуўся да землякоў, заклікаючы іх любым коштам паспрыяць сканчэнню вайны ва Украіне. Гэты зварот ён апублікаваў на сайце beshankovichy.by, які ўжо некалькі год рэдагуе і дзе апошнімі днямі размяшчае шмат аператыўных матэрыялаў пра напад Расеі на Украіну.

**07.03.2022**

Краязнаўца **Кастусь Шыталь** атрымаў дзіўнага зместу допісы ад незнаёмага чалавека, які дэманструе дасведчанасць у ягоным асабістым жыцці: прынамсі ведае, што спадар Шыталь цяпер знаходзіцца не ў Беларусі і што ўлетку, яшчэ на радзіме, у яго быў ператрус. Яшчэ больш дзіўнай выглядае прапанова незнаёмца неадкладна вяртацца ды самому ісці ў Віцебскае абласное ўпраўленне КДБ...
17 чэрвеня 2021 году ў Кастуся Шыталя правялі ператрус у межах крымінальнай справы паводле артыкулу 369 КК, па якой ён праходзіў у статусе сведкі. Справа была ініцыяваная на падставе паведамленняў у мясцовым чаце «Докшицы для жизни» – нібыта там былі размешчаныя абразлівыя выказванні на адрас супрацоўнікаў міліцыі. На думку следства, адміністратарам чату быў Кастусь Шыталь. Краязнаўца паспрабаваў зняпраўдзіць гэтае меркаванне, але міліцыянтаў ягоныя словы не пераканалі, і пасля ператрусу ў яго забралі ўсю наяўную аргтэхніку – тры ноўтбукі, два тэлефоны, флэшку і прынтар. Праз небяспеку несправядлівых абвінавачванняў краязнаўца быў вымушаны пакінуць Беларусь.

**11.03.2022**

Суд Наваполацка ў дачыненні да старшыні пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі БНП работнікаў ААТ «Нафтан» **Вольгі Брыцікавай**, вынес чарговую, трэцюю пастанову, па арт. 24.23 КаАП, паводле якога Вольга была пакараная адміністрацыйным арыштам на 15 сутак.
27 лютага старшыня пяршоўкі Беларускага Незалежнага прафсаюза (БНП) на Нафтане Вольга Брыцікава была затрымана на выбарчым участку, дзе праходзіў рэферэндум аб змяненнях у канстытуцыю Беларусі.
Наваполацкі суд арыштаваў яе на 15 сутак, нібыта за парушэнне артыкула 24.23 КаАП РБ "Парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў".
Са слоў відавочцаў прычынай затрымання стала тое, што Вольга прыйшла на ўчастак для галасавання ў жоўта-сінім адзенні. Па словах сябраў прафсаюза, суды па іншых двух адміністрацыйных артыкулах таксама прысудзілі Вользе яшчэ двойчы па 15 сутак.
На дадзены момант старшыня прафсаюзнай спрадвечнай арганізацыі асуджана ўвогуле на 45 сутак і адбывае арышт у ізалятары Ушацкага РАУС Віцебскай вобласці.

**11.03.2022**




Экстрэмісцкім прызнаны артыкул «Гурт «Sumarok» запісаў кліп на песню «Чэрці», надрукаваны ў Маладзечанскай «Рэгіянальнай газеце». Рашэнне пра гэта 24 лютага прыняў суд Маладзечанскага раёну. Аўтар песні, колішні жыхар Полацку **Ігар Палынскі,** аргументаў суду не ведае і пра падставы прызнання артыкулу экстрэмісцкім матэрыялам можа толькі меркаваць.
У кліп былі ўключаныя кадры, знятыя падчас пратэстаў супраць вынікаў прэзідэнцкіх выбараў. Здымкі пераважна рабіліся ў Маладзечне – туды Ігар Палынскі пераехаў з Полацку. Разам з калегамі ён здымаў пратэсты 9 і 10 жніўня 2020 году, першыя буйныя шэсці ў Маладзечне, таксама ў кліпе ёсць здымкі з мітынгаў Святланы Ціханоўскай, Марыі Калеснікавай і Веранікі Цапкала ў Менску і ў Маладзечне, і кадры пратэставых падзеяў у іншых гарадах Беларусі.
Кліп на песню «Чэрці» можна паглядзець на інтэрнэт-сервісе youtube. У артыкуле пра прэм’еру няма нічога асаблівага, што можа падацца «крамолай» – толькі інфармацыя пра здымкі кліпа.

**11.03.2022**

Камітэт ААН па правах чалавека асуджае Рэспубліку Беларусь за прывядзенне ў выкананне смяротнага прысуду ў дачыненні да **Віктара Паўлава**, чыя справа ўсё яшчэ знаходзіцца на разглядзе Камітэта.
С 2010 года Віктар Паўлаў з'яўляецца ўжо 15-й па ліку асобай, пакаранай Рэспублікай Беларусь падчас разгляду яго справы Камітэтам ААН па правах чалавека, нягледзячы на неаднаразовыя просьбы Камітэта прыпыніць выкананне прысуду на час разгляду яго скаргі аб заяўленых ім парушэннях яго правоў.
Віктар Паўлаў быў затрыманы 3 студзеня 2019 года па падазрэнні ў здзяйсненні забойства і крадзяжы маёмасці. У гэты ж дзень, у адсутнасць адваката, ім былі падпісаныя прызнавальныя паказанні, і пракурор санкцыянаваў меру стрымання ў выглядзе змяшчэння пад варту. Упершыню Паўлава прывезлі ў суд толькі праз пяць месяцаў пасля яго затрымання. У ліпені 2019 года Віцебскі абласны суд асудзіў яго да вышэйшай меры пакарання. У лістападзе таго ж года Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь пакінуў у сіле прысуд суда першай інстанцыі.
Скарга Паўлава ў Камітэт ААН па правах чалавека была пададзена ў 2020 годзе і ўтрымлівае заявы аб ужыванні да яго катаванняў у месцах зняволення, аб адмове ў доступе да юрыдычнай дапамогі і аб несправядлівым судовым разглядзе. Камітэт зарэгістраваў скаргу і пачаў вытворчасць па падрыхтоўцы яе да разгляду.
Камітэт неаднаразова накіроўваў Рэспубліцы Беларусь просьбы аб прыпыненні выканання смяротнага

прысуду, а пачынаючы з чэрвеня 2021 года таксама прасіў прадаставіць інфармацыю аб месцазнаходжанні Віктара Паўлава ў сувязі з інфармацыяй пра магчымае таемнае выкананне смяротнага прысуду. Аднак ні на адзін з запытаў Камітэт не атрымаў адказаў.
Некаторы час назад Віцебскі абласны суд нарэшце праінфармаваў сям'ю Паўлава, што смяротны прысуд быў прыведзены ў выкананне, але не прадаставіў інфармацыю пра дату пакарання ці месца, дзе пахаванае цела Віктара Паўлава.
У падобных справах, якія тычацца таемнага выканання смяротнага пакарання, Камітэт ААН па правах чалавека раней выявіў парушэнне Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах.
Камітэт таксама ўжо прызнаваў невыкананне Рэспублікай Беларусь працэдур Камітэта і невыкананне яго просьбаў аб прыняцці часавых мер абароны парушэннем Факультатыўнага пратаколу да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, бо ўсе дзяржавы-ўдзельнікі абавязаны ў адпаведнасці з міжнародным правам добрасумленна супрацоўнічаць з Камітэтам.
Нягледзячы на тое, што смяротны прысуд у дачыненні да Віктара Паўлава ўжо быў прыведзены ў выкананне, Камітэт ААН па правах чалавека, у адпаведнасці са сваёй практыкай, працягне разгляд яго справы на адной са сваіх будучых сесій.

**14.03.2022**

Віцебскі актывіст **Мікола Качурэц** выехаў з Беларусі пры дапамозе фонду BYSOL. Некалькі апошніх гадоў актывіста пераследавалі віцебскія ўлады за ягоную палітычную і прабеларускую пазіцыю.
Паводле звестак праваабаронцаў, ад 2018 году Мікалая Качурца незаконна затрымлівалі 39 разоў. Яго штрафавалі, садзілі на суткі, канфіскоўвалі БЧБ-атрыбутыку.
Пасля жніўня 2020 году пераслед з боку супрацоўнікаў МУС у дачыненні да Качурца яшчэ больш узмацніўся.
Толькі завядзенне ў дачыненні да ўжо не маладога актывіста крымінальнай справы стала прычынай вымушанай эміграцыі.

**14.03.2022**

Затрыманы 53-гадовы **Сяргей Грыбовіч** кажа ў «пакаянным відэа», што запоўніў анкету ў Telegram, адгукнуўшыся на заклік былога рэстаратара і актывіста Вадзіма Пракоп’ева, які 5 сакавіка ў сваім тэлеграм-канале «Радио Гаага» абвясціў набор трохсот беларусаў у батальён добраахвотнікаў, каб бараніць Украіну ад расейскай агрэсіі.
8-га лютага YouTube-канал «Вадим Прокопьев» і тэлегра-канал «Радио Гаага» былі прызнаныя экстрэмісцкімі на тэрыторыі Беларусі.
Затрыманне Сяргея Грыбовіча праводзілі супрацоўнікі ГУБАЗіК. Мужчыне выставілі абвінавачанне па двух артыкулах: 130 КК (Распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай або іншай сацыяльнай варожасці) і 361-3 КК (Удзел на тэрыторыі замежнай дзяржавы ва ўзброеным фарміраванні або ўзброеным канфлікце, ваенных дзеяннях, вярбоўка або падрыхтоўка асоб да такога ўдзелу).

**14.03.2022**

З 26 студзеня палітзняволены гомельскі праваабаронца **Леанід Судаленка** адбывае прысуджанае яму пакаранне пад Віцебскам, у папраўчай калоніі №3 «Віцьба». Паводле ягонай жонкі, сям’я атрымлівае лісты з-за кратаў больш-менш рэгулярна, але ў кожным допісе ён паведамляе, што лісты з волі яму не аддаюць. Фактычна, за ўвесь час знаходжання на «Віцьбе», ніводнага ліста ён не атрымаў, у тым ліку ад дзяцей.
Жонка акцэнтуе ўвагу на тым, што да мужа не заўсёды дапускаюць адваката. Афіцыйная прычына для адмовы: «ён шмат працуе, і адрываць яго ад працы немагчыма». Леанід Судаленка працуе ў «Віцьбе» markeрознарабочым на дрэваапрацоўцы – прыбірае пілавінне, нешта прыносіць, нешта адносіць. Чаму ў гэтай працы нельга зрабіць перапынак або знайсці палітвязню замену на кароткі час – застаецца незразумелым.

**15.03.2022**




Найстарэйшы апазіцыянер Віцебску, які неаднаразова падкрэсліваў, што жыве па беларускай Канстытуцыі, прынятай у 1994 годзе, бо ўсе пазнейшыя лічыць нелегітымнымі, быў затрыманы якраз 15 сакавіка, у Дзень Канстытуцыі. Што стала падставай для затрымання, застаецца невядомым.

Апошні раз 15 сакавіка **Барыс Хамайда** выходзіў на сувязь каля 14-й гадзіны. Ён патэлефанаваў журналістам, каб паведаміць, што знаходзіцца ў райаддзеле міліцыі Чыгуначнага раёну Віцебску. Акалічнасцяў тлумачыць не стаў, паабяцаўшы паведаміць усё пазней. Аднак больш тэлефонных званкоў ад актывіста не было, і ён сам не адгукаецца на тэлефанаванні.

Знаходжанне Барыса Хамайды менавіта ў Чыгуначным РАУС ускосна сведчыць пра тое, што ён быў затрыманы каля так званага «сіняга дому». На гэтае месца ў цэнтры Віцебску ён выходзіць практычна штодня ўжо трэцяе дзесяцігоддзе. Апошнія гады ён распаўсюджвае тут беларускую літаратуру і незалежную прэсу, а ягонае «працоўнае месца» кожны віцяблянін пазнаваў па бел-чырвона-белым парасоне над столікам з кнігамі, газетамі і часопісамі. Яшчэ ўлетку, падчас чарговага затрымання, у Барыса Ханонавіча забралі і парасон, і вышыванкі, у тым ліку з малітвай «Ойча наш», вышытай чырвонымі ніткамі на белай палатніне, некалькі стужак у нацыянальных колерах, паштоўкі...

**22.03.2022**

Адміністрацыя папраўчай калоніі №1 Наваполацку пачала ўжываць у дачыненні палітвязня **Віктара Бабарыкі** неабгрунтаванае прыцягненне да дысцыплінарнай адказнасці. Яму ўжо абвясцілі адну вымову, маецца пагроза таго, што будзе ўжытае другое спагнанне.

Прыцягненне да дысцыплінарнай адказнасці можа пацягнуць за сабой змяшчэнне ў штрафны ізалятар (ШІЗА), скарачэнне колькасці перадач і спатканняў і нават завядзенне новай крымінальнай справы.

Апроч таго, Віктар Бабарыка павінен насіць жоўтую бірку – гэта азначае, што ён пастаўлены на прафілактычны ўлік. Адміністрацыя калоніі лічыць, што Бабарыка «схільны да захопу закладнікаў, нападу на адміністрацыю і хуліганскіх праяваў».

Нагадваем пра абставіны крымінальнага пераследу Бабарыкі, былога экс-кандыдата на пасаду кіраўніка беларускай дзяржавы.

6 ліпеня 2021 года ў судзе Маскоўскага раёну Менску агучылі прысуды па гучнай і рэзананснай «справе Белгазпрамбанку», фігурантам якой з'яўляецца палітвязень, экс-банкір, былы кандыдат на пасаду прэзідэнта Беларусі Віктара Бабарыка. Для яго пракурор Сяргей Гіргель запытваў 15 год пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму.

Суддзя Вярхоўнага суда Ігар Любавіцкі пакараў яго 14-мі гадамі калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму, прызнаўшы Віктара Бабарыку вінаватым у атрыманні хабару ў асабліва буйным памеры (ч. 3 арт. 430 КК) і ў легалізацыі сродкаў, атрыманых злачынным шляхам (ч. 2 арт. 235 КК).

Акрамя гэтага, палітвязня пакаралі штрафам у памеры 145 тысяч рублёў (пяць тысяч базавых велічынь), а таксама ён павінен будзе выплаціць больш за 46 мільёнаў рублёў, каб пагасіць нібыта нанесеную ім шкоду. Таксама Бабарыку пазбавілі права займаць кіроўныя пасады на некаторы час. Бабарыка віну не прызнаў.

**23.03.2022**

Жыхарка Полаччыны, была затрыманая ў Віцебску. Падставай стала тое, што 28-гадовая супрацоўніца полацкай стаматалагічнай клінікі **Святлана Фірсава** нібыта пакінула абразлівы каментар пад відэа з прамовай Лукашэнкі, і здарылася гэта яшчэ ў 2021 годзе.

4 лютага суд Полацку і Полацкага раёну пакараў Святлану Фірсаву штрафам у памеры 200 базавых велічынь за «апаганьванне збудаванняў і псаванне маёмасці» паводле арт. 341 Крымінальнага кодэксу.

Па матэрыялах абвінавачання, у перыяд з 13 па 30 лістапада 2020 году Фірсава і яе сяброўка Вольга Трунова неаднаразова, з выкарыстаннем балончыкаў з фарбай чырвонага і белага колераў, наносілі надпісы і выявы на слупах электраперадач, дрэвах, асфальце, лаўках на прыпынках транспарту ў Полацкім раёне. Таксама яны расклейвалі лісты паперы з чырвонай палоскай на белым фоне.

**25.03.2022**



Візіт участковага міліцыянта актывістка звязвае з тым, што сёння – Дзень Волі, і супрацоўнікі міліцыі імкнуцца перадухіліць масавыя акцыі. **Таццяна Севярынец** распавяла, што яе папярэдзілі пра адказнасць за ўдзел і арганізацыю несанкцыянаваных масавых выступаў – далі падпісаць афіцыйную паперу, што яна знаёмая са зместам адміністрацыйнага артыкула 24.23 КаАП (Парушэнне парадку арганізацыі масавых мерапрыемстваў).
Паводле Таццяны Севярынец, гэта ўжо 4-е ці нават 5-е папярэджанне пра адміністрацыйную і крымінальную адказнасць.
Прафілактычныя гутаркі і візіты міліцыянтаў з папярэджаннямі адбываюцца сёння па ўсёй Беларусі. Маюць месца і прэвентыўныя затрыманні. Актывістка звярнула ўвагу на тое, што ўжо некалькі дзён не адгукаецца на тэлефанаванні жыхар Віцебску Яўген Сцяпанаў. Ад пачатку вайны ва Украіне ён пісаў лісты ў розныя інстанцыі, каб дэпутаты і дзяржаўныя чыноўнікі паспрыялі спыненню расейскай агрэсіі. Адказаў па сутнасці ён не атрымаў, але ягоная актыўнасць магла справакаваць міліцыю на тое, каб затрымаць чалавека як «патэнцыйна небяспечнага» у сённяшніх умовах.

**27.03.2022**

Праваабаронцам стала вядома, што ксяндза Аляксандра, пробашча касцёла Святога Апостала Андрэя, што ў Лынтупах на Пастаўшчыне, затрымалі яшчэ 24 сакавіка, напярэдадні Дня Волі. Яго ўтрымліваюць у пастаўскім ізалятары часовага ўтрымання.
Прычына затрымання святара невядомая. Гэтаксама невдома, ці быў ксёндз **Аляксандр Баран** асуджаны, або яго пратрымаюць за кратамі 72 гадзіны і выпусцяць да суду.
Ксёндз Аляксандр Баран у жніўні 2020 году разам з парафіянамі выходзіў на акцыю за свабодныя выбары і супраць гвалтоўных дзеянняў так званых сілавікоў.

**27.03.2022**

Жыхар Віцебску **Яўген Сцяпанаў** звярнуўся са скаргай у абласную пракуратуру, бо лічыць, што супрацоўнікі Першамайскага РАУС парушылі ягоныя правы. У прыватнасці, міліцыянты не назвалі сваіх пасадаў, імёнаў і прозвішчаў, не патлумачылі яму ягоныя правы і не далі азнаёміцца з дазволам наператрус. У межах якой справы ён праводзіўся – мужчына дагэтуль не ведае.
Яўген Сцяпанаў лічыць парушэннем тое, што міліцыянты праводзілі ператрус у некалькіх пакоях адначасова, а таму не было магчымасці сачыць за іхнымі дзеяннямі. Таксама ён зазначае, што быў праведзены дагляд рэчаў ягонага сына і ягонай маці, у выніку былі забраныя не толькі ягоныя асабістыя рэчы, але і рэчы, якія належаць іншым асобам.
Міліцыянты забралі ноўтбук, два мабільныя тэлефоны, гульнявую прыстаўку, сістэмны блок ад камп'ютара, відэакамеру, некалькі флэшак, CD-дыскі. А таксама былі забраныя нататнік з паролямі ад электронных паштовых скрыняў, паветраныя шарыкі зялёнага, чырвонага і белага колераў і нават шарыкавая ручка. Акт з пералікам забраных рэчаў яму не далі, сцвярджае Яўген Сцяпанаў.
І асобна адзначае, што супрацоўнікі міліцыі забралі спіс (на паперы) тых асобаў і інстанцый, куды ён накіроўваў заявы пра неабходнасць спыніць вайну ва Украіне, і скаргі пра тое, што адказы на ягоныя допісы дасылаліся яму з парушэннем заканадаўства аб зваротах грамадзянаў.

**31.03.2022**

Супраць пробашча пастаўскай парафіі Езуса Міласэрнага распачалі адміністрацыйную справу за распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў. 25-га сакавіка над ім павінны быў адбыцца суд, але справу вярнулі ў Пастаўскі РАУС на дапрацоўку. Ксёндз **Андрэй Бульчак**, грамадзянін Польшчы, шмат гадоў аддаў святарскаму служэнню на Віцебшчыне. Але ягоны дазвол на працу ў Беларусі мае скончыцца ў траўні, і святар не меў ілюзіі, што ён будзе працягнуты. Таму прыняў рашэнне з’ехаць ужо цяпер, не чакаючы вынікаў суду, бо ў выпадку штрафу ён не хоча «фінансаваць гэты рэжым».

Паводле Андрэя Бульчака, ён быў вымушаны з’ехаць у так хутка, што нават не развітаўся з парафіянамі.

Сюжэт відэароліка «Ліст», які стаў падставай для судовага пераследу пастаўскага ксяндза, вельмі просты. Дзяўчына з Беларусі піша ліст у Польшчу пра тое, што беларусы – мірныя людзі, яны супраць вайны ва Украіне, і не хочуць, каб у замежжы думалі, што яны на баку захопнікаў.

Пра свой неспадзяваны ад’езд ксёндз Андрэй Бульчак распавёў у відэаінтэрв’ю ксяндзу Вячаславу Барку, таксама вымушанаму ўцекачу з Беларусі. Ксёндз Вячаслаў, у мінулым пробашч у Расонскім касцёле, ужо доўгі час вядзе ўласны youtube-канале. Следчы камітэт распачаў праверку некаторых відэаролікаў на наяўнасць «экстрэмізму», і апроч гэтага, святару давялося адбыць 10 сутак арышту за допісы ў сацыяльных сетках, у якіх міліцыянты ўбачылі памкненне да распаўсюду фашыстоўскай сімволікі.

**31.03.2022**



Затрыманне адбылося 30-га сакавіка. Па звестках праваабаронцаў, жанчыну вінавацяць паводле арт. 19.11 КаАП (распаўсюджванне экстрэмісцкіх матэрыялаў). Сябры і знаёмыя чакалі, што сёння над спадарыняй Таццянай адбудзецца суд. Аднак працэсу не было, і падобна, што жанчыну будуць трымаць пад вартай 72 гадзіны. Такое шырока практыкуецца на Віцебшчыне: затрыманых па «палітычных» артыкулах не судзяць адразу, а выпісваюць позвы ў суды пасля трох сутак знаходжання за кратамі.

30-га сакавіка наваполацкія міліцыянты прыйшлі па **Таццяну Трафімаву** на працу. Не заспеўшы актывісткі, накіраваліся да яе дахаты. Калі меркаваць па міліцэйскім імпэце ў пошуках жанчыны, то ўсе матэрыялы адміністрацыйнай справы мусілі быць падрыхтаваныя, каб найхутчэй накіраваць яе ў суд. Аднак Таццяну Трафімаву затрымалі, а да суду справа не дайшла.

Сябры і аднадумцы не выключаюць, што наваполацкую актывістку адпусцяць на волю ў нядзелю, а суд адбудзецца пазней. Але гэта толькі ў тым выпадку, калі справа супраць яе толькі адміністрацыйная, і іншых падставаў для затрымання ў міліцыянтаў няма.

## Красавік 2022

**02.04.2022**

Суддзя суда Кастрычніцкага раёна Віцебска **Мікалай Атрахімавіч** спыніў адміністрацыйную вытворчасць у дачыненні да былога палітвязня Міхаіла Жамчужнага па артыкуле 19.1 (Дробнае хуліганства) Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях. Суддзя палічыў, што міліцыі не ўдалося даказаць вінаватасць Жамчужнага ў здзяйсненні хуліганскага ўчынку. Калі доказы прысутнічалі, то абвінавачанаму пагражаў бы адміністрацыйны арышт тэрмінам да 15 сутак. Прысуд уступіў у законую моц.

Неабходна адзначыць, што суддзя Атрахімавіч пагадзіўся з праваахоўнымі органамі ў той частцы, што Міхаіл Ігаравіч учыніў нейкае правапарушэнне, якое падыходзіць пад кваліфікацыю "Дробнае хуліганства".

Аднак, работнікі міліцыі не далі суду аб'ектыўных дадзеных, якія б указвалі на тое, што ў дзеяннях Жамчужнага прысутнічалі ўсе прыкметы адміністрацыйнага правапарушэння, прадугледжаныя заканадаўствам у выпадку прымянення артыкула 19.1 КаАПа.

Таксама няма тлумачэнняў таму, з якой мэтай супрацоўнікі міліцыі склалі пратакол пры адсутнасці хуліганскіх дзеянняў і да прыводу да суддзі пазбавілі Жамчужнай волі на трое сутак у выглядзе ўтрымання ў Ізалятары часовага ўтрымання.

**02.04.2022**

Ксяндза **Аляксандра Барана** затрымалі 24 сакавіка за «пікетаванне» праз фатаграфіі са сцягам Украіны і бела-чырвона-белым сцягам у сацсетцы.

«Для мяне, як і для іншых хрысціян, бела-чырвона-белы сцяг — гэта знак Хрыста ўваскрослага, які

нясе свет, — заявіў Баран. — А сцяг Украіны я размясціў, бо служыў там, у мяне засталіся сябры і сваякі ва Украіне, і такім чынам я хацеў паказаць, што памятаю пра іх і люблю».
Праз трое сутак, калі паводле закона ксяндза мусілі альбо судзіць, альбо вызваліць, склалі новы пратакол — за «распаўсюджванне экстрэмісцкіх матэрыялаў». Гэта дазволіла міліцыі пратрымаць яго яшчэ трое сутак.

**02.04.2022**




Вядомы віцебскі відэаблогер **Віталь Усціновіч** трое сутак адбыў у ізалятары часовага ўтрымання. Па выхадзе на волю ён паведаміў, што міліцыянты забралі ў яго ўсю аргтэхніку, таму ягоны youtube-канал, які мае больш за 45 тыс падпісчыкаў, пакуль застаецца без новых відэаролікаў. Ці выставілі яму абвінавачанне, блогер не паведамляе. І прычынаў затрымання не называе.
Жыхары Віцебску, і не толькі яны, ведаюць Віталя Усціновіча як стваральніка вобраза «деда Шоушенко». Гэты персанаж мае вусы, размаўляе на трасянцы і ўвесь час даказвае сваім апанентам, што лепш за іх разбіраецца ў палітыцы, эканоміцы і ўвогуле ва ўсіх сферах беларускага жыцця.
Таксама блогер з'яўляецца стваральнікам сатырычнага цыклу «Ябацькіны новасти», дзе аналізуе палітычныя падзеі ў Беларусі. У відэароліках Віталя Усціновіча сустракаюцца фрагменты відэазапісаў з удзелам Аляксандра Лукашэнкі, Лідзіі Ярмошынай, Рыгора Азаронка, іншых пазнавальных асобаў. І пасля прагляду такіх «навінаў» гледачам найчасцей становіцца не весела, а наадварот…
Апрача сатырычных выпускаў, на канале Віталя Усціновіча можна паглядзець ягоныя «кулінарныя выпрабаванні», дзе ён дэгустуе прадукцыю, якую можна набыць у тутэйшых крамах, «відэаэкспедыцыі» па закінутых вёсках Віцебшчыны і па зачыненых віцебскіх прадпрыемствах. Здымаў блогер таксама мясцовыя палітычныя падзеі, у прыватнасці, сустрэчы ў Віцебску з кандыдатамі напярэдадні мінулых прэзідэнцкіх выбараў. Матэрыялы гэтых прамых трансляцый і цяпер захоўваюцца на канале Віталя Усціновіча.

**05.04.2022**

4 красавіка была затрыманая па адміністрацыйнай справе юрысконсульт ВА "Нафтан" **Вераніка Бахмутава**. Дзяўчыну затрымалі на наўпрост працоўным месцы, дэманстратыўна надзелі кайданкі і павезлі на допыты.
Прычынай затрымання магло паслужыць фота профілю ў Facebook, на якім прысутнічае выява лагатыпа TUT by. Гэтым учынкам дзяўчына выказала падтрымку ўсімі любімаму сайту. Згодна з дзейным заканадаўствам па артыкуле 19.11 КаАП Вераніцы могуць пакараць штрафам (ад 10 да 30 б. ст.) або адміністрацыйным арыштам да 15 сутак. У межах указанага артыкула суд можа канфіскаваць прадмет адміністрацыйнага правапарушэння.
У выпадку прыцягнення Бахмутавай да адміністрацыйнай адказнасці, у кіраўніцтва ВА "Нафтан" з'явіцца законная падставай звольніць Веранікі.
Трэба адзначыць, што на дадзены момант яшчэ 2 юрысконсульты прадпрыемства знаходзяцца ў Следчым ізалятары КДБ — Аляксандр Капшуль і Ігар Мінц. Ім прад'яўлены абвінавачанні па артыкуле 356 (Здрада дзяржаве) Крымінальнага Кодэкса Рэспублікі Беларусь.

**05.04.2022**

Пробашча рыма-каталіцкай парафіі святога Апостала Андрэя ў Лынтупах ксяндза **Аляксандра Барана** 4 красавіка асудзілі на 10 сутак адміністрацыйнага арышту.
Суд адбываўся ў Паставах. Падтрымаць ксяндза Аляксандра прыехалі святары дыяцэзіі, біскуп, законная сястра і парафіянін. Пробашча судзілі за дзеянні ў сацсетках паводле двух адміністрацыйных артыкулаў - 24.23 «несанкцыянаванае пікетаванне» (за выяву бел-чырвона-белага сцяга разам з украінскім сцягам на аватарцы) і 19.11 «распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў» (лайкі і каментары пад публікацыямі інфармацыйных старонак, абвешчаных «экстрэмісцкімі»).
Сведкамі выступілі двое міліцыянтаў, якія прагледзелі старонкі святара і склалі рапарты аб адміністрацыйных парушэннях. Спрэчкі ў судзе працягваліся некалькі гадзін.

Пасля абвяшчэння рашэння святара не затрымалі адразу ў зале суда, а далі гадзіну на тое, каб самому прыйсці для адбывання пакарання. Ксендз Аляксандр з пакорай так і зрабіў.

**05.04.2022**



4 красавіка вядомы віцебскі дысідэнт **Барыс Хамайда** выйшаў з ІЧУ пасля арышту, прысуджанага яму нібыта за несанкцыянаванае пікетаванне. Пакуль ён быў у зняволенні, міліцыянты паспелі ад ягонага імя зарэгістравацца ў Telegram і прадаць канфіскаваны ў Хамайды стары, яшчэ «кнопачны» тэлефонны апарат... Як патлумачылі ў Чыгуначным РАУС, грошы пайшлі ў кошт пагашэння ранейшых штрафаў. Барыс Хамайда распавёў «Віцебскай вясне» падрабязнасці пра сваё затрыманне, суд і «сукамернікаў» за кратамі.
Найстарэйшага віцебскага грамадскага актывіста затрымалі ў Дзень канстытуцыі. 15 сакавіка, як звычайна, ён выйшаў да так званага «сіняга дому», дзе распаўсюджвае беларускую літаратуру. Больш як паўгода таму ў міліцыя забрала ў Барыса Хамайды ўсе «нацыяналістычныя» рэчы, якія аздаблялі ягонае «працоўнае месца»: бел-чырвона-белы парасон, вышытую чырвоным на белай палатніне малітву «Ойча наш», маленькі сцяжок, некалькі паштовак… Не забралі хіба што жоўта-блакітную стужку, якая раней не падавалася міліцыянтам чымсьці крамольным.

**06.04.2022**

У судзе Полацка и Полацкага раёна 4 красавіка вынесены прысуд жыхарцы вёскі Дуброўны **Любові Цвярдовай.** 60-ці гадовую жанчыну абвінавацілі ў абразе прэзідэнта Беларусі па ч. 1 арт. 368 Крымінальнага кодэкса. Справу разглядаў суддзя Віктар Баліка і пакараў Цвярдову 4 гадамі абмежавання волі без накіравання ва ўстанову адкрытага тыпу і вялікім штрафам.
Па матэрыялах справы, Любоў Цвярдова, раней не судзімая, неаднаразова ў інтэрнэце размяшчала запісы, якія ўтрымліваюць негатыўную ацэнку А. Лукашэнкі.
Так, 19 жніўня 2021 года ў сацыяльнай сетцы “Аднакласнікі” на сваёй персанальнай старонцы Цвярдова, у адкрытым доступе пакінула паведамленне, якое мае негатыўную ацэнку прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (“фашыст”), яна ж пазней на сваёй старонцы напісала каментар са словамі (“Усе фашысты”). Наўмысна размясціла ў тэлеграм-канале “Краіна для жыцця. Полацк-Наваполацк” пад пастом з фатаграфіяй прэзідэнта каментар (“фашыст”), неаднаразова пакідала каментары ў тэлеграм-чатах (“Жыве Беларусь!”). Пры гэтым выкарыстоўвала мабільны тэлефон Iphone 6 мадэлі і планшэт.
У судзе ў якасці сведкі быў дапытаны стрыечны брат абвінавачанай, які паведаміў, што з Любоўю Цвярдовай сустракаецца нечаста, яе пагляды не падзяляе і нічога не ведае пра негатыўныя каментары.
Агучаныя ў судзе негатыўныя выказванні прызнаныя абразлівымі лінгвістычнай экспертызай ад 28 лютага 2021 года. Адвакат спрабаваў аспрэчыць вынікі, паколькі прызначэнне экспертызы прайшло з парушэннямі ГПК.
Абвінавачанне запрасіла для Цвярдовай з улікам раней вынесенага і неадбытага пакарання абмежаванне волі без накіравання ва ўстанову адкрытага тыпу тэрмінам на 4 гады.
Вырак суда: чатыры 4 гады абмежавання волі без накіравання ва ўстанову адкрытага тыпу і штраф у памеры 3 200 рублёў.

**06.04.2022**

Жыхар Віцебску, мастак і разьбяр па дрэве **Уладзіслаў Макавецкі** адбывае пакаранне ў Івацэвіцкай калоніі №22, вядомай як «Воўчыя норы». У гэтай калоніі ён знаходзіцца ўжо год, але апошнім часам да яго даходзяць не ўсе лісты з волі, а таксама і ягоныя допісы практычна не трапляюць да блізкіх. Маці Уладзіслава Макавецкага, спадарыня Наталля, просіць усіх неабыякавых людзей падтрымаць сына – з надзеяй, што хоць колькі лістоў, але трапіць да яго ў рукі.
Паводле Наталлі Макавецкай, адзіны шлях зносінаў з сынам – праз тэлефон. Рэдкія тэлефанаванні з калоніі дазваляюць ёй пераканацца, што з Уладзіславам усё добра, ён пачуваецца нармальна і настрой у яго пазітыўны, наколькі ён можа быць такі ў няволі.
16 сакавіка Уладзіслаў адзначаў дзень народзінаў, і да гэтага дня Наталля Макавецкая даслала яму

віншаванне. Але палітвязень яго не атрымаў – яму аддалі толькі ліст з дому. Маці спадзяецца, што перапіска з сынам яшчэ наладзіцца, і звяртаецца да ўсіх, хто піша Уладзіславу, каб не спыняліся і працягвалі гэта рабіць.

Уладзіслаў Макавецкі быў прызнаны вінаватым паводле арт. 364 КК («Гвалт або пагроза ўжывання гвалту ў дачыненні супрацоўніка ўнутраных спраў»). Інцыдэнт, інкрымінаваны Уладзіславу Макавецкаму, адбыўся падчас пратэставага шэсця ў раёне вуліцы Праўды ў Віцебску 6 верасня 2020г. Паводле следства, ён «перашкаджаў законным дзеянням» малодшага сяржанта міліцыі Аляксандра Пятроўскага і старшага сяржанта Дзмітрыя Фядотава. У міліцэйскіх пратаколах засведчана, што Макавецкі замахваўся на Фядотава «рукамі і нагамі», спрабаваў яго ўдарыць і вусна пагражаў яму. Таксама ён нібыта замахнуўся гумовым дручком на Пятроўскага – той дручок сам жа Пятроўскі і згубіў, а Уладзіслаў Макавецкі толькі падняў яго з зямлі. Відавочцы інцыдэнту казалі праваабаронцам, што Уладзіслаў спрабаваў дапамагчы чалавеку, якога міліцыянты збівалі. Пры гэтым ніводзін супрацоўнік міліцыі не пацярпеў.

**07.04.2022**



Крымінальную справу супраць яе паводле ч.1, арт.368 Крымінальнага кодэксу распачалі 15 сакавіка, і ўжо 16 сакавіка дзяўчыну затрымалі проста на працы – 28-гадовая жыхарка гарадскога пасёлку Ветрына працуе ў Полацку ў стаматалагічнай клініцы. Некалькі дзён пасля затрымання яна знаходзілася ў Полацкім ІЧУ, а потым яе перавялі ў Віцебскі СІЗА. Родныя чакаюць лістоў ад зняволенай, але іх пакуль няма.

Жыхарка Ветрына трапіла пад увагу сілавых структур пасля таго, як яе абвінавацілі паводле арт. 341 Крымінальнага кодэксу за «апаганьванне збудаванняў і псаванне маёмасці». У адпаведнасці з матэрыяламі абвінавачвання, у перыяд з 13 па 30 лістапада 2020 году Фірсава і яе сяброўка Вольга Трунова неаднаразова, з выкарыстаннем балончыкаў з фарбай чырвонага і белага колераў, наносілі надпісы і выявы на слупах электраперадач, дрэвах, асфальце, лаўках на прыпынках транспарту ў Полацкім раёне. Таксама яны расклейвалі лісты паперы з чырвонай палоскай на белым фоне. За гэта 2 лютага суддзя суду Полацку і Полацкага раёну Віктар Баліко аштрафаваў **Святлану Фірсаву** на 200 базавых велічынь. Цяпер яна не мае фізічнай магчымасці выплаціць гэты штраф, бо знаходзіцца за кратамі.

**08.04.2022**

Жыхара Наваполацку, студэнта ПДУ асудзілі да 2,5 гадоў пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму. Віталь Лапко, суддзя Наваполацкага гарадскога суду, прызнаў хлопца вінаватым паводле ч. 3 арт. 293 КК («Навучанне або іншая падрыхтоўка асобаў для ўдзелу ў масавых беспарадкаў»). Суд праходзіў у закрытым рэжыме, каб пазбегнуць распаўсюду звестак пра метады грамадскага супраціву. Паводле матэрыялаў крымінальнай справы, **Леанід Шамаў** 10 і 11 жніўня 2020 году праз мясцовыя тэлеграм-чаты нібыта распаўсюджваў інфармацыю пра методыку супрацьстаяння міліцэйскаму гвалту падчас вулічных акцыяў і разнастайныя формы грамадскага рэагавання на ўціск і парушэнне правоў асобы.

Следчыя вырашылі, што размяшчэнне такіх матэрыялаў мела на мэце непасрэднае азнаямленне з імі жыхароў Наваполацку і найбліжэйшых населеных пунктаў. І адзначалі, што ў першыя дні пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 году менавіта ў Наваполацку праходзілі найбольш масавыя пратэставыя выступы і фіксаваліся шматлікія сутыкненні мясцовых жыхароў з міліцыяй.

**12.04.2022**

Камітэт разгледзеўшы скаргу №2361/2014 жыхара Віцебска доктара **Ігара Пастнова** прыйшоў да высновы, што ў дачыненні да яго з боку беларускай дзяржавы было дапушчана парушэнне грамадзянскіх і палітычных правоў.

Скарга Пастнова ў КПЧ датычылась судовага рашэння па якому ён быў накіраваны ў жніўні 2013 года на прымусовае лячэньне ў псыхіятрычную клініку. Прымысовае змяшчэнне ў вар'ятню было абумоўлена палітычнымі прычынамі – тым, што ён наважыўся на аб'ектыўную крытыку асоб, надзеленых

уладай, у тым ліку былога старшыні Віцебскага аблвыканкаму Аляксандра Касянца.



Таксама Ігару Аляксеевічу не ўдалося абскардзіць рашэнне раённага суду, вынесенае судзьдзёй Таццянай Дзегцяровай.

Ягоныя сведчаньні пра тое, што ў судзе не прысутнічалі ні ён сам, ні адвакат, да паслуг якога адміністрацыя псыхіятрычнага шпіталю наогул не дазволіла звярнуцца, не былі прынятыя Віцебскім абласным і Вярхоўным судамі і рашэнне першаснага суду не ўдалося скасаваць.

Зыходзячы з гэтага, Камітэт прыйшоў да рашэння, што прадстаўленыя яму факты сведчаць аб парушэнні беларускімі ўладамі артыкулаў 7, 9(1), 14(1) і 19 Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах. А менавіта, на думку Камітэта ў дачыненні да Пастнова ўжываліся катаванні, яго незаконна пазбавілі волі і права на справядлівы і публічны разгляд справы кампетэнтным, незалежным і бесстароннім судом, ён быў пазбаўлены магчымасці свабодна выказваць публічна сваё меркаванне.

Цяпер Пастноў можа патрабаваць ад Рэспублікі Беларусь поўнай кампенсацыі як маральнай, так і матэрыяльнай шкоды.

У сваю чаргу, беларускія дзяржаўныя органы ў тэрміновым парадку абавязаны абнародаваць рашэнне Камітэта па справе Пастнова і прыняць усе неабходныя меры для прадухілення такіх парушэнняў у будучым.

**12.04.2022**

Суд Верхнядзвінскага раёна разглядзеў справу 22 гадовага мясцовага жыхара. Яго абвінавацілі па арт. 24.23 КаАП у тым, што ён правёў несанкцыянаванае пікетаванне на сайце Адміністрацыі Лукашэнкі. Суддзя Людміла Каваленка прызнала мужчыну вінаватым і арыштавала яго на 15 сутак.

Згодна міліцейскаму пратаколу малады чалавек «наўмысна размясціў фотаздымак з выявай палотнішча сцяга бела-чырвона-белага колеру і выявай герба «Пагоня» дзеля публічнага выказвання сваіх грамадска-палітычных інтарэсаў.

Мужчына на судзе прызнаўся, што даслаў на сайт паведамленне з пытаннем «Чаму Беларусь удзельнічае ў вайне з Украінай?», але адказу не атрымаў. Таму ён зноў напісаў і далучыў фотаздымкі БЧБ-сцяга і герба «Пагоня».

За паўторны допіс на сайце АП: «Добры дзень яшчэ раз, пісаў вам, але адказу няма, пішу яшчэ раз. Чаму Беларусь удзельнічае ў вайне з Украінай? Не вайне!!! Жыве Беларусь!!! Слава Украіне!!!», - маладзён адседзіць паўмесяца ў турме.

**13.04.2022**

Пераслед прафсаюзнага лідэра з Наваполацка **Вольгі Брыцікавай**. 13 красавіка Вольга мусіла выйсці на волю, але міліцыянты сказалі, што яна затрыманая на 72 гадзіны. Хутчэй за ўсё супраць яе распачата крымінальная справа, але не вядома, што ўлады ёй інкрымінуюць. За кратам ізалятары часовага утрымання ва Ушачах Брыцікава ўтрымліваецца ўжо 46-я суткі.

Наваполацкую актывістку Вольгу Брыцікаву затрымалі яшчэ 27 лютага падчас галасавання на рэферэндуме на выбарчым участку. Яе арыштавалі на 15 сутак за тое, што яна сфатаграфавала бюлетэнь.

Праз некалькі дзён над прафсаюзнай лідэркай адбыўся другі суд па адміністратыўнай справе. Ёй прызначылі яшчэ 15 сутак за антываенную вопратку.

**14.04.2022**

Камітэт паведаміў грамадзянскаму актывісту з Віцебску **Мікалаю Качурцу** аб тым, што яго паведамленне аб парушэнні правоў з боку беларускай дзяржавы прымальна для разгляду Камітэтам па сутнасці. "Ваша паведамленне лічыцца працэсуальна гатовым для прыняцця Камітэтам рашэння аб прымальнасці і па сутнасці" - напісаў у афіцыйным дакуменце кіраўнік Сектара дагавораў аб правах чалавека Ібрагім Салама. Гэта азначае, што ў вялікай верагоднасцю Мікалай зможа абараніць сябе ад самавольства ўлад.

Інцыдэнт пачаўся 25 сакавіка 2019 году падчас святкавання БНР-101 Мікалай сфатаграфаваўся з

нацыянальным бел-чырвона-белым сцягам на фоне помніка князю Альгерду ў Віцебску. Доказам гэтага дзеяння сталі відэаматэрыялы, зробленыя супрацоўнікамі Кастрычніцкага РАУС Віцебску.
11 красавіка 2019 году суд Кастрычніцкага раёну Віцебску разгледзеў адміністрацыйную справу ў дачыненні да Качурца. Суддзя Сняжана Кіндзеева прызнала актывіста парушальнікам закону аб масавых мерапрыемствах і аштрафавала яго на 102 рублі.
Дзеля абароны свайго права на ўдзел у мірных публічных акцыях Качурэц звяртаўся ў вышэйшыя судовыя інстанцыі. Аднак беларускія суды адмовіліся абараняць ягоныя правы, матывуючы сваю адмову тым, што раённы суд вынес пастанову, заснаваную на законе і абгрунтаваную фактычнымі доказамі.
Пасля адмовы судоў вышэйшай інстанцыі адстойваць ягоныя правы, Качурэц вычарпаў усе даступныя спосабы абараніць свае грамадзянскія правы ў межах нацыянальнага заканадаўства.

**15.04.2022**

Суд Першамайскага раёну Віцебску пакараў жыхарку Крычава **Марыну Каласкову** абмежаваннем волі на паўтара гады з накіраваннем ва ўстанову адкрытага тыпу, прызнаўшы яе вінаватай паводле артыкула 369 Крымінальнага кодэксу. Суддзя Міхаіл Юрчанка асудзіў жанчыну за абразу былога начальніка Ганцавіцкага РАУС Віталя Куляшова. Пацярпелы на паседжанне не з’явіўся, але пісьмова звярнуўся ў суд з заявай аб спагнанні з абвінавачанай сродкаў у памеры 1000 рублёў за маральную шкоду. Суд задаволіў матэрыяльныя прэтэнзіі Куляшова.
Сваю віну Марына Каласкова прызнала поўнасцю. Яна пацвердзіла, што каментар быў напісаны ёю асабіста «на эмоцыях». І што пазней яна хацела яго выдаліць, але не здолела гэта зрабіць. У жніўні 2020-га году яна працавала ў Расеі на будоўлі, але ў красавіку 2021-га году звольнілася і з тае пары жыла ў Крычаве. 1 снежня 2021-га году жанчыну затрымалі ў межах распачатай супраць яе крымінальнай справы, і на трое сутак змясцілі ў Віцебскі ІЧУ. Потым адпусцілі пад падпіску аб нявыездзе.
Першапачаткова суд над Каласковай быў прызначаны на 1-га сакавіка, аднак жанчына на судовае разбіральніцтва так і не з’явілася. Яна папярэдзіла суд, што спазняецца, працэс перанеслі на пазнейшы час, але, не дачакаўшыся падсуднай, яе абвясцілі ў вышук. Праз некаторы час жанчыну затрымалі і ўзялі пад варту.

**15.04.2022**

За абразу старшыні суда Шумілінскага раёна Іны Грабоўскай жыхар п. Обаль (Шумілінскі раён) быў пакараны 3 гадамі абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. Прычынай інцыдэнту стала незадаволенасць, з пункту гледжання 61-гадовага асуджанага, несправядлівым прысудам па адміністрацыйнай справе, раней вынесеным яму суддзёй Грабоўскай.
Сваю нязгоду ён выказаў па патэлефанаваўшы на прамую лінію міліцыі. У размове з памочнікам дзяжурнага аператыўна-дзяжурнай службы АУС Шумілінскага райвыканкама ў нецэнзурнай форме ён даў ацэнку прафесіяналізму і кампетэнцыям старшыні суда Шумілінскага раённага.
Гэтую ацэнку праваахоўнікі кваліфікавалі як абразу суддзі пры адплаўленні ёю правасуддзя.
У судовым паседжанні мужчына цалкам прызнаў сваю віну ў абразе суддзі, прынёс свае прабачэнні, і быў прысуджаны да трох гадоў хатняй "хіміі" бо даглядае сваю састарэлаю маці.
Неабходна адзначыць, што асуджаны раней неаднаразова прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за крадзяжы, рабаванні і згвалтаванне. Ён не працуе, злоўжывае алкаголем і жыве за кошт састарэлай маці. На працягу 2021 года мужчына 22 разы прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці.

**18.04.2022**

Расія адобрыла выдачу віцяблянкі **Яны Пінчук** у Беларусь. Пастановай Васілевостраўскі раённага суда Санкт-Пецярбурга ад 3 лістапада 2021 года ў дачыненні да Пінчук была абрана мера стрымання ў выглядзе ўтрымання пад вартай, пасля падоўжаная на тэрмін да 30 красавіка 2022 года. Цягам некалькі тыдняў, жанчына будзе дастаўлена ў Віцебскі абласны следчы ізалятар №2.
«Яне ў СІЗА прыйшла пастанова аб яе экстрадыцыі ў Беларусь. Пакуль яна ўсё яшчэ знаходзіцца ў пецярбургскім СІЗА-5. Адвакаты будуць абскарджваць гэтае рашэнне, але дата суда пакуль не прызначаная», — паведаміў «Белсату» муж Яны Мікіта Сафронаў.
У Беларусі Яну абвінавачваюць па пяці артыкулах:
Пінчук абвінавачваецца па наступных артыкулах Крымінальнага кодэкса: паклёп (артыкул 188 КК), незаконныя дзеянні з персанальнымі дадзенымі іншай асобы (частка 2 артыкула 203-1 КК), распальванне сацыяльнай варожасці і варожасці (частка 3 артыкула 130 КК), стварэнне і кіраўніцтва

экстрэмісцкім фарміраваннем (частка 1 і 2 артыкула 361-1 КК), заклікі да дзеянняў супраць нацыянальнай бяспекі (частка 3 артыкула 361 КК).
Калі суд прызнае жанчыну вінаватай, то яе могуць пакараць на тэрмін да 20 год пазбаўлення волі.
22 снежня 2021 года расійскі праваабарончы цэнтр "Мемарыял" прызнаў беларускую актывістку палітзняволенай, а пазбаўленне яе свабоды незаконным і палітычна матываваным, накіраваным на ўтрыманне ўлады суб'ектамі ўладных паўнамоцтваў.

**18.04.2022**

Суд Полацкага раёна прысудзіў 52-гадовага ўраджэнца Полацка, які працаваў кіроўцам аўтобуса ў Польшчы да 7,5 гадоў пазбаўлення волі. Асуджанаму ставілі ў віну стварэнне і кіраўніцтва экстрэмісцкім фарміраваннем, а таксама дзеянні, накіраваныя на ўзбуджэнне сацыяльнай варожасці і навучанне асоб для ўдзелу ў масавых беспарадках. Тым не менш пасля асуджэння рэдактара ТК працягвае распаўсюджваць інфармацыю і мае 770 падпісчыкаў.
Суд паверыў боку абвінавачання ў тым, што палачанін знаходзячыся на тэрыторыі Польшчы, стварыў тэлеграм-канал «Полацк краіна для жыцця чат» (пасля яго назва некалькі разоў). На яго старонках ён размяшчаў інструкцыі па арганізацыі і ажыццяўленні масавых беспарадкаў, падбухторваў грамадзян да хуліганскіх дзеянняў па матывах палітычнай варожасці, публікаваў заклікі да ажыццяўлення экстрэмісцкай дзейнасці. Таксама там неаднаразова публікаваліся заклікі да гвалтоўных дзеянняў у дачыненні да супрацоўнікаў міліцыі.
На канале размяшчаліся навучальныя відэа, як супрацьдзейнічаць работнікам праваахоўных органаў, і іншая дэструктыўная інфармацыя.
Следчыя органы сцвярджаюць, што стваральнік канала "Полацак краіна для жыцця чат" сам ажыццяўляў яго адміністраванне і перыядычна дадаваў новых адміністратараў, сярод якіх былі і апазіцыйныя актывісты Полацка і Наваполацка.

**19.04.2022**

Па рашэнні суду Полацку і Полацкага раёну работнік прадпрыемства «Полацк-Шкловалакно» **Юрый Шчарбакоў** быў асуджаны да 15-ці сутак арышту за дзве публікацыі ў сацыяльных сетках. Абедзве публікацыі былі зроблены некалькі год таму, але толькі цяпер сталі падставай для адміністрацыйнай справы і судовага разбіральніцтва. Рашэнне пра арышт прыняў суддзя Андрэй Дзергачоў.
Суд прызнаў Юрыя Шчарбакова вінаватым паводле двух адміністрацыйных артыкулаў – 19.10 (Прапаганда або публічнае дэманстраванне, вырабніцтва і распаўсюд нацысцкай сімволікі або атрыбутыкі) і 19.11 (Распаўсюд, вырабніцтва, захаванне, перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая ўтрымлівае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або прапагандуе такую дзейнасць). Першае абвінавачанне тычылася карцінкі з інтэрнэту, якую палачанін некалькі гадоў таму размясціў на сваёй старонцы ў Фэйсбуку, другое – рэпосту матэрыялу з вядомага беларускага парталу, які ў той час яшчэ не быў абвешчаны экстрэмісцкім фармаваннем.

**19.04.2022**

**Мікалая Шараха** затрымалі апоўдні 19 красавіка, калі ён кіраваўся на судовы працэс над работнікам ААТ «Полацк-Шкловалакно» Юрыем Шчарбаковым. Паводле сяброў, лідара СПБ прывезлі дахаты ў суправаджэнні чатырох міліцэйскіх машын і ўчыніліператрус. Забралі кампутары і мабільны тэлефон. Мікалаю Шараху не патлумачылі ні падставаў дляператрусу, ні ягонага юрыдычнага статусу. Не пакінулі таксама вопісу забранай маёмасці.
З дому Мікалая Шараха супрацоўнікі міліцыі забралі ўсе прадметы ў нацыянальных колерах і белчырвона-белыя сцягі, старыя нататнікі, дакументы, якія тычацца дзейнасці СПБ і «пярвічкі» незалежнага прафсаюзу на прадпрыемстве «Полацк-Шкловалакно». Таксама забралі кампутары і мабільны тэлефон.Ператрус працягваўся каля 4-х гадзінаў, пасля чаго прафсаюзнага лідара перавезлі ў кватэру ягонай дачкі, дзе таксама шукалі нацыянальную сімволіку і дакументы.

**19.04.2022**




Сярод 15-ці затрыманых лідараў беларускіх недзяржаўных прафсаюзаў аказаўся кіраўнік прафсаюзу Радыёэлектроннай прамысловасці (РЭП) аршанец **Васіль Берасneў**.
71-гадовы мужчына знаходзіцца пад вартай. Справу вядуць следчыя цэнтральнага апарату Камітэту дзяржаўнай бяспекі.
Аршанская арганізацыя РЭП, якой нязменна кіраваў Берасneў, была зарэгістраваная ў 2016 годзе і за шэсць гадоў ператварылася ў магутную рэгіянальную прафсаюзную структуру з больш як 150 сябрамі. Прычым большую яе частку складала моладзь. Сваю дзейнасць прафсаюз праводзіў на тэрыторыі Дубровенскага, Талачынскага і Сенненскага раёнаў Віцебскай вобласці. Пры прафсаюзе працавала юрыдычная служба, актыўнасцю вылучалася жаночая секцыя.
Асноўныя праблемы, якія даводзілася вырашаць РЭП-аўцам, – гэта працаўладкаванне, незаконныя звальненні, нявыплаты заробкаў, розныя працоўныя спрэчкі.
Апроч таго, Васіль Берасneў сумяшчаў працу ў прафсаюзах з праваабарончай дзейнасцю. У Аршанскім рэгіёне ён быў прадстаўніком Рэспубліканскага праваабарончага грамадскага аб'яднання «Беларускі Хельсінкскі камітэт», якое, па рашэнні Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь, было ліквідаванае 30 верасня 2021 года.

**22.04.2022**

У Віцебскім абласным судзе яшчэ ў лютым да 7,5 гадоў калоніі асудзілі 52-гадовага жыхара Полацку **Анатоля Мацулевіча**. За стварэнне і адміністраванне тэлеграм-канала «Полоцк Новополоцк Страна Для Жизни Чат Свободу Сергею Тихановскому» яго абвінавацілі па трох артыкулах Крымінальнага кодэкса: ч. 1 арт. 361-1 (стварэнне экстрэмісцкага фарміравання), ч. 3 арт. 130 (распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай альбо іншай сацыяльнай варожасці), ч. 3 арт. 293 (навучанне ці іншая падрыхтоўка асоб для ўдзелу ў масавых беспарадках). Мужчына пад вартай утрымліваецца ўжо дзесяць месяцаў. Справу ў закрытым рэжыме разглядаў суддзя Яўген Буруноў.
Анатолю Мацулевічу інкрымінавалі стварэнне і адміністраванне тэлеграм-канала «Полоцк Новополоцк Страна Для Жизни Чат Свободу Сергею Тихановскому», які МУС прызнаў экстрэмісцкім фарміраваннем 26 лістапада мінулага года. Хоць затрымалі Мацулевіча за пяць месяцаў да гэтага — 11 чэрвеня 2021 года. 26 чэрвеня яго ўзялі пад варту ў межах арт. 130 Крымінальнага кодэкса і адправілі ў СІЗА-2. 18 лістапада супраць Анатоля ўзбудзілі яшчэ крымінальную справу па арт. 293 КК. 26 лістапада у Мацулевіча сканчываўся магчымы тэрмін утрымання пад вартай, але следчыя не маглі яго адпусціць, таму была ўзбуджаная крымінальная справа яшчэ па арт. 361-1 Крымінальнага кодэкса.
Як гаворыцца ў абвінавачванні, Мацулевіч стварыў 30 красавіка 2020 году тэлеграм-канал «Полоцк Новополоцк Страна Для Жизни Чат Свободу Сергею Тихановскому».

**22.04.2022**

Рок-музыка **Ігар Банцар** заплаціць за камуналку віцебскай «хіміі», хаця не жыў там. Палітвязень па рашэнні суда Ленінскага раёна Гродна заплаціць 81 рубель 66 капеек папраўчай установе адкрытага тыпу № 9 Віцебска і 64 рублі дзяржпошліны. Ігар настойваў, што яму няма за што плаціць. У спецінтэрнаце ВУАТ ён не знаходзіўся - яго рэгулярна адпраўлялі ў штрафны ізалятар. Але суддзя Вольга Шуманская прыняла рашэнне не на карысць былога палітвязня.
Грамадзянскую справу па іску пракурора Віцебска ў інтарэсах ВУАТ № 9 па Віцебскай вобласці да Ігара Банцара разгледзелі 20 красавіка. З гродзенца хацелі спагнаць запазычанасць за пражыванне ў спецінтэрнаце - 81 рубель 66 капеек. Першае паседжанне прайшло 11 красавіка. Тады Банцару не дазволілі азнаёміцца з 13 лістамі, якія знаходзяцца ў матэрыялах справы. Таму ён спаслаўся на Канстытуцыю і папрасіў адкласці справу, пакуль не знойдзе сабе адваката.
Ігар збіраўся выклікаць сведкаў, якія пацвердзілі б, што начальнік ВУАТ падпалкоўнік Эдуард Мачэча ставіцца да яго прадузята. Але ў выніку працэс мінуў без іх. Прадстаўнік ВУАТ №9 таксама папрасіў разгледзець справу без яго.

**22.04.2022**



49-гадовы **Сяргей Канавалаў** быў затрыманы 6 сакавіка за тое, што, «паддаўшыся заклікам дэструктыўных тэлеграм-каналаў», рыхтаваўся да грамадска-небяспечных дзеянняў, накіраваных на дэзарганізацыю функцыянавання чыгуначнага транспарту.
У прыватнасці, планаваў парушыць працу сістэм, адказных за бяспеку чыгуначнага руху. Дзеянні жыхара Віцебску кваліфікаваны як падрыхтоўка да акту тэрарызму, распачата крымінальная справа.
Паводле следчых, мужчына мог планаваць вывядзенне са строю сістэм, якія забяспечваюць бяспеку чыгуначнага руху, бо меў доступ да пэўнага абсталявання. Калегі Сяргея Канавалава сведчаць, што ягонае затрыманне мела пад сабой асабісты канфлікт: у яго былі складаныя ўзаемаадносіны з намеснікам начальніка дыстанцыі сігналізацыі і сувязі па ідэалогіі, былым начальнікам транспартнай міліцыі Глячковым. Каб звесці рахункі, апошні паведаміў у ГУБАЗіК і КДБ пра нібыта падрыхтоўку дыверсіі.
Праваабаронцы выступілі з заявай пра прызнанне палітзняволеным Сяргея Канавалава і яшчэ 10-ці чалавек, якіх вінавацяць у датычнасці да «чыгуначнай справы» – спробах перашкодзіць функцыянаванню беларускай чыгункі пасля пачатку ваенных дзеянняў ва Украіне.

**26.04.2022**

Звольнены мастацкі кіраўнік тэатру імя Якуба Коласа **Міхаіл Краснабаеў**. Менавіта ён паставіў спектакль «Ціль», які быў забаронены адразу пасля прэм’еры 21 лістапада мінулага году. Неўзабаве пасля прэм’еры, 1 снежня мінулага году быў звольнены дырэктар тэатру Аляксандр Старых, а ў пачатку гэтага году пасады ў тэатры страцілі акторы Юлія Крашэўская і Арцём Герак. Цяпер падышоў да сканчэння працоўны кантракт з Міхаілам Краснабаевым, і яго не працягнулі. У тэатры лічаць, што шэраг звальненняў наўпрост звязаны з тым, што спектакль «Ціль» не ўпадабала высокае начальства – за тое, што са сцэны прагучалі словы «Жыве Фландрыя!», а ў якасці дэталяў касцюмаў былі выкарыстаны белыя і чырвоныя стужкі.
Спектакль «Ціль» быў пастаўлены паводле п’есы расейскага драматурга Рыгора Горына, якую ён напісаў на падставе раману бельгійскага пісьменніка Шарля Дэ Кастэра «Ціль Уленшпігель». Раман і спектакль распавядаюць пра барацьбу фламандцаў супраць іспанскага валадарства ў 16 стагоддзі. П’еса для пастаноўкі была перакладзена на беларускую мову, і фраза «Жыве Фландрыя!» была ўсяго толькі літаральным перакладам лозунгу «Да здравствует Фландрия!»
Прэм’ерай спектакля «Ціль» тэатр імя Якуба Коласа адзначаў сваё 95-годдзе. У зале прысутнічалі кіраўнікі Віцебскай вобласці і прадстаўнікі Мінкульту. Ніхто з іх афіцыйна не патлумачыў, чаму адразу ж пасля прэм’еры спектакль знялі з рэпертуару.

**26.04.2022**

Чатыры гадзіны самы вядомы віцебскі апазіцыянер быў вымушаны правесці ў аддзеле міліцыі Чыгуначнага раёну. Яго затрымалі каля «сіняга дому» нібыта за несанкцыянаванае пікетаванне, аднак ніякіх атрыбутаў «пікету» пры ім не было – толькі беларускамоўныя кнігі, якія ён распаўсюджвае на працягу апошніх месяцаў. У выніку спадара **Хамайду** адпусцілі без пратаколу, але з папярэджаннем, што наступнае затрыманне можа скончыцца для яго крымінальнай справай.
Пра тое, што распаўсюджваць беларускую літаратуру – гэта тое самае, што пікетаваць, актывісту спрабаваў давесці старшы лейтэнант па прозвішчы Шушкевіч.

**27.04.2022**

Суд Аршанскага раёна і горада Оршы вынес прысуд мясцоваму жыхару **Андрэю Антаневічу.** Яго абвінавацілі ў абразе прэзідэнта (ч.1 арт. 368 Крымінальнага кодэкса) і абразе прадстаўніка ўлады (арт. 369 Крымінальнага кодэкса). Справу разглядаў суддзя Дзмітрый Разумовіч.
Пад часу разбіральніцтва справы стала вядома, што ў тэлеграм-канале “Вусы Лукашэнкі” Антаневіч размясціў абразлівыя каментары ў бок прэзідэнта і былога міністра унутраных спраў Юрыя Караева.
Для змягчэння пакарання Антаневіч далучыў да матэрыялаў справы даведку аб тым, што ягоная жонка

мае групу інваліднасці, а таксама аб тым, што сям'я мае на ўтрыманні непаўнагадовае дзіця.
Пад час працэсу падсудны прызнаў сваю віну і пакаяўся ў садзеяным. Характарыстыка выдадзеная з месца працы была станоўчай. Раней да крымінальнай адказнасці Андрэй не прыцягваўся.
Пракурор запрасіў па артыкуле 368 абмежаванне волі з накіраваннем ва ўстанову адкрытага тыпу тэрмінам на два гады, а па артыкуле за абразу прадстаўніка ўлады – тры гады без накіравання.
Суд прызнаў Андрэя Антаневіча вінаватым і пакараў трыма гадамі "хатняй хіміі".

**28.04.2022**

У судзе Наваполацка пяты раз запар асудзілі старшыню незалежнага прафсаюза «Нафтан» **Вольгу Брыцікаву**, якую затрымалі яшчэ 27 лютага. Справу разглядала сумнавядомая мясцовая суддзя Зінаіда Балаболава.
Пяты пратакол на Вольгу зноў склалі па арт. 24.23 КаАП (несанкцыянаванае пікетаванне). Папярэднія чатыры пратаколы супраць актывісткі былі за антываенныя акцыі пратэсту.
Брыцікаву прызналі вінаватай і зноў пакаралі 15-сутачным арыштам. Яе ўтрымліваюць у часовым ізалятары горада Ушачы.
Вольга Брыцікава працавала начальнікам аддзела рэалізацыі нафтапрадуктаў на "Нафтане". У жніўні 2020-га яна стала актыўнай удзельніцай пратэстаў на прадпрыемстве. Калі праходзіў сход працоўных з удзелам тагачаснага кіраўніка Камітэта дзяржаўнага кантроля Івана Церцеля (цяпер — старшыня КДБ), якраз Брыцікава агучыла патрабаванні да ўладаў.
У канцы 2020-га Вольгу Брыцікаву звольнілі, у 2021 годзе яна стала кіраўніком незалежнага прафсаюза на "Нафтане".

**28.04.2022**

Праваабаронца і журналіст з Оршы **Ігар Казмярчак** даведаўся, што на яго завялі крымінальную справу па ч.1 артыкула 368 Крымінальнага кодэкса за абразу Лукашэнкі. Вытворчасцю па справе займаецца Аршанскі міжраённы аддзел Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь. Калі справа дойдзе да суда, то Ігару паграджае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін да чатырох гадоў. Цяпер сп. Казмярчак знаходзіцца за межамі краіны і яму нічога не пагражае.
Гэты не першы "наезд" на грамадзянскага актывіста. Так, у пачатку ліпеня 2021 года, каля 6 гадзін раніцы ў кватэру, дзе ён пражываў, з'явіліся супрацоўнікі Дэпартамента фінансавых расследаванняў. Падчас правядзенняператрусу ў Казмерчака канфіскавалі ноўтбук і мабільны тэлефон. Пасля шматгадзіннага допыту яго адпусцілі. Магчыма, што пасля аналізу зместу гаджэтаў, была ўзбуджаная крымінальная справа па частцы 1 арт. 368 КК РБ.

**29.04.2022**

У гарадскім пасёлку Расоны асудзілі Мікалая Машарскага, якога прызналі вінаватым у закліках да ўдзелу ў акцыі пратэсту 27 лютага. Суд над ім прайшоў, пакуль мужчына знаходзіўся ў Расіі. Рашэнне суддзі пра арышт на 20 сутак Машарскі атрымаў праз паведамленне ў Viber. Праз дзень пасля вяртання ў Беларусь Мікалая затрымалі дома пяцёра сілавікоў у бронекамізэльках. Увесь арышт ён адбываў у віцебскім ізалятары, дзе для арыштаваных паводле «народных» артыкулаў створаны адмысловыя ўмовы. Былы арыштант распавёў «Вясне» пра ўмовы ўтрымання ў ІЧУ, пра збіванне адміністрацыяй «непалітычных» за пратэст і пра тое, як улады Расонаў пераследваюць ягоную сям'ю з палітычных матываў.

## Травень 2022

**02.05.2022**

Да жыхара Оршы фотамастака **Дзяніса Сімановіча** ў копі-цэнтр Ozen.by завіталі супрацоўнікі ГУБАЗіка. Іх увагу прыцягнулі некалькі значкоў з выяваю жоўтага поля з блакітным небам. Такія сувеніры Дзяніс паспеў таксама падарыць некалькім сваім знаёмым. Сімановіча дапыталі і адпусцілі дадому.
А 29 красавіка запрасілі на гутарку ізноў, адкуль ён ужо не выйшаў. Дзяніс паспеў патэлефанаваць блізкім і паведаміў, што ў судзе яго арыштавалі за пікатаванне на 10 сутак, па часцы 1 артыкула 24.23 Кодэкса аб адміністратыных правапарушэннях Рэспублікі Беларусь.
У той жа час у копі-цэнтр працягваюць заглядваць супрацоўнікі ГУБАЗ, іх цікавіць, якая прадукцыя там вырабляецца і што менавіта прадаюць людзям. Магчыма міліцыянты шукаюць падставы, для

крымінальнага прыследу Сімановіча.

**05.05.2022**

Па рашэнні адміністрацыя Наваполацкай калоніі №1, дзе адбывае пакаранне палітвязень, змясціла яго ў штрафны ізалятар на 20 сутак. Не выключана, што знаходжанне ў ізалятары асуджанага кандыдата на пасаду кіраўніка дзяржавы будзе працягнута, калі кіраўніцтва калоніі палічыць неабходным у выхаваўчых мэтах.
Падставай падобнага абыходжання з **Віктарам Дзмітрыевічам**, звязана з тым, што ён па рашэнні кіраўніка адміністрацыя калоніі Андрэя Пальчыка, стаіць на прафілактычным уліку, як асоба «схільная да захопу закладнікаў, нападу на адміністрацыю і хуліганскіх праяў».
Напярэдадні памяшкання ў ШІЗА, у сярэдзіне сакавіка, Бабарыка, была абвешчаная вымова. У кастрычніку 2021 года, палітык застаўся без адвакатаў - па рашэнні ўладаў усіх яго абаронцаў пазбавілі ліцэнзіі.

**07.05.2022**

У судзе Полацку і Полацкага раёну вынесены прысуд мясцоваму жыхару **Андрэю Бойку**. Яго абвінавацілі ў абразе прэзідэнта (ч.1 арт 368 Крымінальнага кодэксу). Суддзя Андрэй Дзергачоў прызнаў Бойку вінаватым і прызначыў яму пакаранне: 1,5 года «хіміі» з накіраваннем ва ўстанову адкрытага тыпу.
Андрэй Бойка – жыхар Полацку, працаваў у Баранавічах дзяжурным на чыгуначнай станцыі, мае на ўтрыманні двое дзяцей.
Згодна з абвінавачаннем, Бойка 19 жніўня 2020 года, «знаходзячыся па месцы жыхарства ў Полацку, выкарыстоўваючы ў якасці сродку здзяйснення злачынства мабільны тэлефон, наўмысна абраўшы спосаб распаўсюджвання звестак, разлічаных на азнаямленне шырокага нявызначанага кола асобаў, а менавіта глабальнай сеткі Інтэрнэт, у тэлеграм-канале «Супольнасць чыгуначнікаў Беларусі», разлічваючы на ўспрыманне іншымі асобамі абразлівай інфармацыі, усведамляючы публічны і зневажальных характар сваіх выказванняў, размясціў паведамленне, якое прыніжае гонар і годнасць прэзідэнта, якое супярэчыць агульначалавечай маралі, устаноўленым правілам зносін паміж людзьмі, якое змяшчае выказванне, выказанае ў ненарматыўнай форме маўленчага выказвання і змяшчае негатыўную ацэнку прэзідэнта».
Абвінавачаны сваю віну прызнаў. Ва ўчыненым раскайваецца, абавязуецца надалей падобнага не здзяйсняць.
Суд пастанавіў прызнаць Бойку вінаватым і прызначыць яму пакаранне ў выглядзе абмежавання волі ва ўстанове адкрытага тыпу з накіраваннем тэрмінам на 1 год і 6 месяцаў.

**08.05.2022**

Праваабарончая супольнасць прызнала палітзняволенымі жыхара Барані (мястэчка пад Воршай) **Арцёма Ляшнеўскага**, і жыхароў Воршы – **Вячаслава Лютынскага** і **Дзмітрыя Матусевіча**. Ляшнеўскі быў асуджаны за каментар пад фота супрацоўніка ДАІ ў сацсетках, ён адбывае 2,5 гады «хіміі» у папраўчай калоніі №29 у Ваўкавыску.
Суд над Арцёмам Ляшнеўскім, машыністам чыгункі, адбыўся 2 лютага ў судзе гораду Воршы і Аршанскага раёну. Суддзя Святлана Кузмічонак прызнала яго вінаватым ва ўчыненні злачынства паводле арт. 369 Крымінальнага кодэксу РБ (Абраза прадстаўніка ўлады) – за тое, што ў адной з сацсетак ён пакінуў абразлівы каментар на адрас гарадзенскага супрацоўніка ДАІ Вайцяшонка. На судовае пасяджэнне былі запрошаныя эксперт-лінгвіст і супрацоўнікі ГУБАЗіКа, якія праводзіліператрус у кватэры Ляшнеўскага.

**14.05.2022**

Пастаўскі раённы суд прызнаў ксяндза **Анджэя Бульчака** вінаватым у распаўсюдзе экстрэмісцкіх матэрыялаў. Суд прайшоў без падсуднага: Андрэй Бульчак пакінуў Беларусь 29 сакавіка, даведаўшыся, што супраць яго распачалі адміністрацыйную справу. Ксёндз заявіў, што не лічыць сябе вінаватым, і не будзе падтрымліваць рэжым штрафамі ў дзяржаўны бюджэт.
Разам з моладдзю пастаўскай парафіі Езуса Міласэрнага ксёндз выпускаў відэаролікі. Адзін з іх, пад назовам «Ліст», быў адрасаваны польскай моладзі. Паводле сюжэту, жыхарка Беларусі піша ліст у

Польшчу пра тое, што простыя беларускія людзі не падтрымліваюць вайну ва Украіне. У відэаролiку быў выкарыстаны фрагмент дакументальных здымак з лагатыпам «Белсат» і бел-чырвона-белым сцягам, гэта суд і прызнаў «распаўсюдам экстрэмісцкіх матэрыялаў».
Ксёндз Андрэй Бульчак – грамадзянін Польшчы. І ён быў вымушаны з'ехаць на Радзіму заўчасна, бо добра ўсведамляў, што працягваць служэнне ў Паставах яму не дазволяць. Дазвол на працу ў Беларусі ў яго мае скончыцца ў траўні. Тут, у прыватнасці, на Віцебшчыне, ксёндз Андрэй працаваў на працягу апошніх 14-ці гадоў. Падчас ягонага святарства быў збудаваны новы касцёл у Чашніках, а потым святара перавялі на працу ў Паставы, дзе ён таксама кіраваў будаўніцтвам новага касцёла, які сёння ўжо практычна гатовы.

**15.05.2022**

Вядома прынамсі пра тры выпадкі, калі ранкам 14 траўня супрацоўнікі МУС шукалі ў жыхароў Віцебску «экстрэмісцкія матэрыялы». Праваабаронцы паведамляюць, што ператрусы праходзілі і ў менскіх валанцёраў, якія збіралі подпісы за вылучэнне **Віктара Бабарыкі** ў кандыдаты на ўдзел у мінулых прэзідэнцкіх выбарах.
Як на ўмовах ананімнасці расказалі жыхары Віцебску, у якіх прайшлі ператрусы, міліцыянты паводзілі сябе ветліва і вэрхалу пасля сябе не пакінулі. Яны шукалі бел-чырвона-белую сімволіку, а таксама доказы таго, што нехта «зліваў» у сеціва асабістыя дадзеныя так званых сілавікоў. З гэтай мэтай падчас ператрусаў былі канфіскаваны мабільныя тэлефоны.
Пакуль ніхто з віцяблянаў, у якіх правялі ператрусы, не затрыманы. Асобна на допыты іх таксама не выклікалі.
Найверагодней, што міліцыянты прыходзілі з ператрусам паводле дадзеных у запісных кніжках, знойдзеных у кіраўнікоў рэгіянальных структур выбарчага штабу Віктара Бабарыкі – ператрусы ў іх адбыліся раней і ў Віцебску і ў Менску.

**16.05.2022**



Праваабарончая супольнасць выступіла з заявай аб прызнанні палітычнымі зняволенымі 10-ці актывістаў незалежнага прафсаюзнага руху. Сярод іх – **Васіль Берасneў**, кіраўнік аршанскай суполкі прафсаюзу РЭП, затрыманы 19 красавіка 2022 году ў шэрагу іншых прадстаўнікоў незалежных прафсаюзаў. Яго ўтрымліваюць у менскім СІЗА-1. Яму інкрымінуюць арт. 342 Крымінальнага кодэксу (Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, што груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх).
Для Васіля Бераснева гэта першая крымінальная справа, хаця падобнае абвінавачанне супраць яго было выстаўленае яшчэ за ўдзел у аршанскім «Маршы недармаедаў» у 2017-м годзе. Тады яго асудзілі паводле адміністрацыйнага артыкула 23.34, ён адбыў 14 сутак арышту ў ІЧУ Воршы. Яшчэ раней за ўдзел у так званым несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве Васіль Берасneў адбываў адміністрацыйны арышт у 2006-м годзе.
Спадар Берасneў – чалавек, якога добра ведаюць на Аршаншчыне. У 1980-я гады ён быў дырэктарам сельскагаспадарчай вучэльні ў Высокім (мястэчка пад Воршай) і нават кіраўніком Аршанскага райсавету. Аднак пасля таго, як да ўлады прыйшоў Аляксандр Лукашэнка, Берасneў пакінуў дзяржаўныя пасады і прыйшоў у дэмакратычны рух.
З 2016-га году ён кіраваў аршанскай прафсаюзнай суполкай РЭП, якая дзейнічала на тэрыторыі Дубровенскага, Талачынскага і Сенненскага раёнаў Віцебскай вобласці. Юрыдычная служба прафсаюзу дапамагала ў вырашэнні праблем з працаўладкаваннем, незаконнымі звальненнямі, нявыплатамі заробкаў, іншымі працоўнымі спрэчкамі. Апрача працы ў прафсаюзе, Васіль Берасneў займаўся праваабарончай дзейнасцю. У Аршанскім рэгіёне ён быў прадстаўніком Рэспубліканскага праваабарончага грамадскага аб'яднання «Беларускі Хельсінкскі камітэт», якое, па рашэнні Вярхоўнага суду Рэспублікі Беларусь, было ліквідаванае 30 верасня 2021 году.

**17.05.2022**

У судзе Полацка і Полацкага раёну вынесены прысуд **Андрэю Патрэбку**, жыхару пасёлка Фарынава,

што ў Полацкім раёне. Суддзя Віктар Баліка прызнаў яго вінаватым паводле ч.1 артыкула 368 Крымінальнага кодэксу – за шматразовыя абразы на адрас Аляксандра Лукашэнкі ў сацыяльных сетках. Паводле матэрыялаў справы, з 5.08.2020 па 11.08.2021 года падсудны неаднаразова размяшчаў тэксты і каментары ў «Одноклассниках» і «ВКонтакте», «маючы намер на публічнае прыніжэнне і абразу годнасці дзейнага прэзідэнта Лукашэнкі». Усяго ў справе фігуруюць 25 эпізодаў, хаця ў следчых падазрэнні выклікалі куды болей допісаў і каментароў Андрэя Патрэбкі. Аднак лінгвістычная экспертыза паказала, што частка выказванняў пра Аляксандра Лукашэнку, а таксама пра Наталлю Качанаву, хоць і ўтрымліваюць ненарматыўную лексіку, але не маюць негатыўных ацэнак. З 24 снежня 2021 г. Андрэя Патрэбку ўтрымлівалі за кратамі, і па сканчэнні працэсу ён быў вызвалены з-пад варты. Ягоны тэлефон, як сродак здзяйснення злачынства, канфіскаваны.

**19.05.2022**

За першыя 4 месяцы 2022 года судамі Віцебскай вобласці прызнаны 36 інфармацыйных рэсурсаў, якія распаўсюджваюць экстрэмісцкія матэрыялы. У рэпрэсіях супраць свабоды распаўсюджвання інфармацыі ў сетцы Інтэрнэт прынялі ўдзел суддзі 16 раённых судоў рэгіёна. У параўнанні з папярэднім годам, дынаміка прызнання матэрыялаў экстрэмісцкімі павялічылася ў паўтара раза.
Суд Кастрычніцкага раёну прыняў 14 рашэнне ў дачыненні да 15 тэлеграм-каналу. Суд Чыгуначнага раёну Віцебску вынес 5 рашэнняў у дачыненні да 7 медыярэсурсаў. Суд Першамайскага раёну зрабіў гэта адзін раз і прызнаў наяўнасць экстрэмісцкіх матэрыялаў у адным інтэрнэт-рэсурсе.
Калі казаць пра выніковасць, то далей ідуць раённыя суды Віцебскай вобласці, якія прынялі рашэнні па 16 рашэнняў у дачыненні да 16 ТГ.
Так, суд Сененскага  прызнаў экстрэмісцкімі матэрыяламі 3 рэсурса, а суд Докшыцкага раёну – 2.
Суды Лепельскага, Дубровенскага, Шумілінскага, Чашніцкага, Верхнедзвінскага, Расонскага, Браслаўскага, Ліёзненскага, Талачынскага, Глыбоцкага раёнаў і суд Наваполацку – па адным.
Ва ўсіх выпадках суды скарысталіся правам неадкладнага выканання сваіх рашэнняў, паколькі, на думку суддзяў, прамаруджванне ў выкананні рашэння можа прывесці да значнай шкоды для дзяржавы або зрабіць немагчымым самое выкананне.
Ініцыятарамі прыняцця судамі рашэнняў па прызнанні матэрыялаў экстрэмісцкімі былі 7 упраўленне (па Віцебскай вобласці) ГУБАЗіК Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь або органы пракуратуры.

**19.05.2022**




У Наваполацкім судзе прайшоў судовы працэс над **Максімам Пазняковым**, старшынём Беларускага Незалежнага прафсаюзу. Суд прызнаў яго вінаватым у незаконным пікетаванні за «аватаркі» у Фэйсбуку, на якіх быў жоўта-блакітны сцяг і лозунг «За незалежнасць».
Старшыню недзяржаўнага прафсаюзу пакаралі арыштам на 15 сутак. Двое сутак ён ужо адбыў за кратамі да суду: яго затрымалі ранкам 17 траўня каля дзіцячага садку, куды лідар недзяржаўнага прафсаюзу адводзіў сваіх дзяцей. Затрыманне праводзілі людзі ў цывільным, якія пад’ехалі на аўтамабілі без апазнавальных знакаў. Да сённяшняга дня родныя і сябры Максіма Пазнякова не ведалі прычынаў затрымання.
Гэта ўжо другое адміністрацыйнае пакаранне для прафсаюзнага лідара за апошні час: у верасні 2021 году яго затрымалі і асудзілі да штрафу памерам 30 базавых велічынь паводле ч.2 артыкула 19.11 КаАП («Распаўсюд інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці»). У віну Максіму Пазнякову паставілі рэпосты з «экстрэмісцкіх» інтэрнэт-рэсурсаў у сацыяльных сетках.

**20.05.2022**

У судзе Віцебскага раёну завяршыўся працэс над чатырма віцяблянамі, якіх асудзілі да розных тэрмінаў зняволення за ўдзел у «палітычных перформансах», знятых на відэа і распаўсюджаных па Тэлеграм-каналах. Два гады ў калоніі агульнага рэжыму – гэта мінімальны тэрмін, прысуджаны суддзём Міхаілам Зубенем адной з удзельніц, Ірыне Пярцовай, якая адна выхоўвае няпоўнагадовага сына, і ад

пачатку знаходжання ў віцебскім СІЗА пагадзілася супрацоўнічаць са следствам.
**Ірыну Пярцову** пакаралі зняволеннем па ч. 2 арт. 339 Крымінальнага Кодэксу (злоснае хуліганства). Паводле таго ж артыкула да 3-х з паловай гадоў пазбаўлення волі пакарана **Юлія Лабунова**. **Кацярына Макарэвіч** таксама асуджана да 3-х з паловай гадоў пазбаўлення волі, але па сукупнасці пакаранняў: паводле ч. 1 арт. 342 (актыўны ўдзел у групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак) і ч. 2 арт. 339 (злоснае хуліганства). Самы суровы вырак вынесены **Арцёму Латышаву** - 4 з паловай гады пазбаўлення волі па сукупнасці пакаранняў : па арт. 341( псаванне маёмасці ў грамадскіх месцах) і ч. 2 арт. 339 (злоснае хуліганства).
Усе чацвёра асуджаных правялі амаль 8 месяцаў у Віцебскім СІЗА-2, беларуская праваабарончая супольнасць лічыць іх палітычнымі зняволенымі.
Маладых людзей затрымалі паводле падазрэння ў псаванні банэра з выявай супрацоўнікаў ДАІ. Падчас следства былі высветлены яшчэ некалькі эпізодаў, якія сталі прадметам судовага разбору. Паводле Следчага камітэту, у чэрвені 2021 года «кампанія з мужчын і жанчын ва ўзросце ад 27 да 34 гадоў, аб'яднаных агульнай ідэяй падтрымання дэструктыўных заклікаў у інтэрнэце і сацыяльных сетках», зрабіла відэазапісы некалькіх перформансаў. Прыкладам, разбілі бейсбольнай бітай кінескоп тэлевізара з наклееным фотаздымкам журналіста Грыгорыя Азаронка, спалілі некалькі друкаваных дзяржаўных выданняў, інсцэніравалі на могілках памінкі па Аляксандру Лукашэнку.
Па версіі следства, дачыненне да крымінальнай справы, якую разбіралі ў судзе Віцебскага раёну, маюць яшчэ некалькі чалавек. Аднаго з іх, Паўла Сакалова, гэтымі днямі судзяць у Віцебскім абласным судзе, і пасяджэнні праводзяцца ў закрытым рэжыме.

**20.05.2022**



У судзе Полацку і Полацкага раёну двух гадоў зняволення ў калоніі агульнага рэжыму асудзілі жыхарку пасёлка Ветрына **Святлану Фірсаву**. У Наваполацкім гарадскім судзе да 4-х гадоў пазбаўлення волі быў асуджаны жыхар Полацку Міхаіл Лабань. Судовы працэс над ім праходзіў у закрытым рэжыме.
**Міхаіл Лабань** – гаспадар ювелірнай майстэрні «Самародак», займаўся вырабніцтвам упрыгожанняў для ўдзельнікаў рэканструктарскіх суполак, вывучаў гісторыю сярэднявечча. Жанаты, сям'я выхоўвае двух дзяцей. 17 лютага на старонцы «ВКонтакте» ягоная жонка паведаміла, што Міхаіл знаходзіцца за кратамі, бо ён пад следствам за «каментар у непатрэбным месцы», і што майстэрня часова спыняе прыём замоваў. Міхаіла Лабаня абвінавацілі ў паклёпе на Аляксандра Лукашэнку (ч.1 арт. 367), абразе Аляксандра Лукашэнкі (ч.1 арт. 368) і абразе прадстаўніка ўлады (арт. 369 Крымінальнага кодэксу). Падрабязнасці справы не вядомыя, бо суд праходзіў у закрытым рэжыме. Вырак – чатыры гады калоніі агульнага рэжыму і штраф памерам 3200 рублёў (100 базавых велічыняў) – абвясціў суддзя Віталь Лапко.

Жыхарку Ветрына Святлану Фірсаву ў судзе Полацку і Полацкага раёну судзіў Уладзімір Бясецкі. Паводле матэрыялаў следства, яна двойчы – – 30 жніўня 2020 году і 30 ліпеня 2021году – размясціла ў «экстрэмісцкіх» тэлеграм-каналах каментары з абразамі на адрас Аляксандра Лукашэнкі. Таксама на судзе была згадана ранейшая крымінальная справа, распачатая супраць дзяўчыны за «апаганьванне збудаванняў і псаванне маёмасці». Паводле артыкула 341 Фірсавай прысудзілі штраф памерам 200 базавых велічыняў за «апазіцыйныя» надпісы і малюнкі, зробленыя белай і чырвонай фарбай. Яна не паспела сплаціць гэтыя грошы, бо была затрыманая і змешчаная ў СІЗА-2. Цяпер суддзя Уладзімір Бясецкі пастанавіў выплаціць гэтыя грошы, а таксама паводле ч.1 арт.368 прысудзіў Святлане Фірсавай пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на два гады ў калоніі агульнага рэжыму.

**21.05.2022**

У Віцебскім абласным судзе ў закрытым судовым працэсе да чатырох з паловай гадоў асудзілі 36-гадовага палітзняволенага **Паўла Сакалова**. Суддзя Яўген Буруноў прызнаў яго вінаватым па двум артыкулам Крымінальнага кодэкса: ч. 3 арт. 293 (навучанне ва ўдзеле ў масавых беспарадках) і арт. 361-1 (стварэнне экстрэмісцкага фармавання). За кратамі Павел утрымліваецца восем месяцаў.

36-гадовага жыхара Віцебска Паўла затрымалі 20 верасня мінулага года. Да гэтага часу мужчына ўтрымліваецца ў СІЗА №2 у Віцебску. Даведацца падрабязнасці справы палітвязня амаль немагчыма: адвакат і жонка знаходзіцца пад падпіскай аб неразгалошванні, а суд праходзіў у закрытым рэжыме. Падчас следчых дзеянняў у тэлефоне Паўла знайшлі закрыты дваровы тэлеграм-чат, у якім знаходзіліся ўсяго тры чалавекі. У адным са сваіх паведамленняў мужчына зрабіў рэпост відэа, якое было прызнанае экстрэмісцкім, але ўжо пасля яго затрымання.
У выніку, мужчыну асудзілі па двум артыкулам Крымінальнага кодэкса.

**22.05.2022**

У дачыненні да віцябляніна Сяргея Каваленкі распачатая крымінальная справа за «знявагу дзяржаўных сімвалаў». Пра гэта жонцы віцебскага актывіста стала вядома ў кастрычніку 2021 году. Тады да яе прыходзілі зператрусам і распытвалі, дзе знаходзіцца яе муж. Днямі да Алены Каваленкі зноў прыходзілі міліцыянты.
Не заспеўшы Алену Каваленку ўдома, супрацоўнікі МУС апыталі суседзяў, ці даўно тыя бачылі Сяргея Каваленку, хаця той ужо тры гады жыве ў Польшчы.
Паводле жонкі актывіста, міліцыянты прыходзілі і да ягонай маці, спадарыні Святланы.
Сяргей Каваленка з’ехаў у Польшчу тры гады таму, бо ў Беларусі пачуваў сябе ў небяспецы. У Віцебску засталася ягоная жонка і двое дзяцей. Падставай для крымінальнай справы стала відэа, размешчанае ў Тэлеграм-каналах. На ім зафіксавана, як Сяргей Каваленка падпаліў дзяржаўны беларускі сцяг падчас адной з акцыяў у падтрымку палітвязняў у Варшаве. Следчы камітэт у Беларусі адрэагаваў на гэты ўчынак, распачаўшы крымінальную справу.

**26.05.2022**



Смольнінскі раённы суд гораду Санкт-Пецярбургу разгледзеў пазоў да мясцовага главка паліцыі, які адмовіў **Яне Пінчук** у прадастаўленні часовага прытулку на тэрыторыі суседняй краіны. Дзяўчына прасіла прызнаць незаконным рашэнне ў адмове атрымання ёй палітычнага прытулку. Суд яе довады не падтрымаў. У хуткім часе расейскія ўлады экстрадуюць яе ў Беларусь.
Актывістка была затрымана 1 лістапада 2021 года ў Санкт-Пецярбургу па запыце беларускіх сілавікоў. А 3 лістапада мясцовы раённы суд абраў для яе меру стрымання ў выглядзе ўтрымання пад вартай, якая потым была працягнутая. На радзіме за адміністраванне тэлеграм-каналу «Віцебск 97%» супраць яе былі выстаўлены абвінавачанні адразу па 5 крымінальных артыкулах, сярод якіх распальванне нацыянальнай варожасці (ч. 3 артыкула 130), заклікі да дзеянняў супраць нацыянальнай бяспекі (ч. 3 артыкула 361), паклёп (артыкул 188) і іншыя.

**27.05.2022**

У Наваполацку з офіса высялялі нізавую ячэйку Беларускага незалежнага прафсаюзу "Нафтана". Але праўладныя прафсаюзныя структуры працягваюць сваю дзейнасць па абароне працоўных правоў работнікаў прадпрыемства.
Перад гэтым арганізацыю пазбавілі рэгістрацыі. Прадстаўнікі прафсаюза кажуць, што яны планавалі абскарджваць гэтае рашэнне ў судзе, таму пакідаць памяшканне не збіраліся.
Тым часам "Нафтан" працягвае працаваць у штатным рэжыме і працаўнікі прадпрыемства баставаць не збіраюцца.
Адзін з работнікаў паведаміў, што загрузка магутнасцей зараз мінімальная. Збыт асноўнай наменклатуры ёсць, але вельмі маленькі. Практычна ўсе рэзервуары з сыравінай запоўнены.
Зарплата, асабліва не змяніліся. Праўда зменшыўся памер прэміі і «прыпынілі выплату матэрыяльнай дапамогі да водпуску, а таксама прафсаюзныя выплаты на патрэбы, хоць унёскі прафсаюзныя як і раней утрымліваюць».

**30.05.2022**

У Санкт-Пецярбургу затрымалі беларуса **Андрэя Рускіх**. Мужчына быў у фэдэральным вышуку за камэнтары ў сацсетках, паведамляецца на ягонай старонцы ў Інстаграм.
Паводле папярэдняй інфармацыі, яго плянуюць экстрадаваць у Беларусь. Цяпер ён знаходзіцца ў СІЗА № 5 Санкт-Пецярбургу.
Андрэй Рускіх — псыхоляг-сэксоляг, псыхатэрапэўт, трэнэр у сфэры трывожных-фабічных і сэксуальных разладаў, якія маюць псыхалягічную аснову. Ён аўтар некалькіх кніг па практычнай псыхалёгіі, таксама ён вядзе сайт і старонкі ў сацсетках, дзе публікуе парады па розных псыхалягічных праблемах.

**31.05.2022**

У судзе Аршанскага раёна вынесены прысуд мясцоваму жыхару **Антону Баброву**. Яго абвінавацілі ў абразе прэзідэнта згодна з ч.1 арт. 368 Крымінальнага кодэкса. Антона затрымалі да суда 21 сакавіка і ўвесь час ён змясціўся ў Віцебскім абласным СІЗА №2.
Прысуд вынесла суддзя Святлана Кузьмічонак, якая за апошнія непоўных два гады, разгледела больш за некалькі дзесяткаў спраў звязаных з абразай міліцыянтаў, чыноўнікаў і прэзідэнта.
Па матэрыялах абвінавачання, Баброў у адным з тэлеграм-каналаў двойчы пакінуў абразлівыя каментары ў бок прэзідэнта Беларусі, якія лінгвістычная экспертыза палічыла ненарматыўнай формай маўленчага выказвання. Сваю віну Антон Баброў у судзе прызнаў цалкам і раскаіўся ў здзейсненым учынке.
Незвычайным было тое, што працэс прайшоў за адзін дзень. Баброва пакаралі пазбаўленнем волі ў калоніі агульнага рэжыму тэрмінам на два гады.

## Чэрвень 2022

**02.06.2022**



Жыхар Полацка і былы ўдзельнік забастоўкі **Уладзімір Крысёнак** 30 мая скончыў жыццё самагубствам. Перад гэтым яго затрымлівалі сілавікі: прымушалі даць паказанні і пагражалі вялікім тэрмінам у калоні.
Уладзімір жыў у Полацку, працаваў на навапалацкім «Нафтане» аператарам установкі дэпарафанізацыі. Да 2020 года палітычнай актыўнасці не праяўляў. Але ўвосень пасля выбараў далучыўся да стачкі, затым стаў актыўным удзельнікам незалежнага прафсаюза, нават быў на пасадзе старшыні.
Пасля сыходу з «Нафтана» нейкі час Крысёнак ездзіў на працу ў Расію.
Чаму і дзе затрымалі Уладзіміра, дакладна не вядома. Але кажуць, што сілавікі на яго ціснулі: прымушалі даць на кагосьці паказанні. Калі адмовіцца, пагражалі, што сядзе на 12 гадоў. Але мужчына не хацеў паклёпнічаць». У выніку Уладзімір выйшаў пад падпіску аб нявыездзе.
Праз дзень пасля выхаду ён павесіўся на матчыным лецішчы ў вёсцы Глінішча. Уладзіміру Крысёнку быў 41 год. Без бацькі засталіся дзве дачкі, адна з іх непаўналетняя.

**08.06.2022**

5 чэрвеня ў полацкай кватэры Палынскіх прайшоўператрус. Непасрэднай прычынай інтарэсу сілавікоў да **Ціны Палынскай** сталі яе допісы ў Фэйсбуку напярэдадні візіту ў Полацк Патрыярха Кірыла.
6 чэрвеня, падчас сустрэчы палачанаў з кіраўніком Рускай праваслаўнай царквы ў Беларусі, журналістку затрымалі міліцыянты, якія заўважылі ў яе на сумцы і на фотаапараце жоўтыя і блакітныя стужкі.
7-га чэрвеня адбыўся суд, і Ціну Палынскую аштрафавалі за нібыта несанкцыянаванае пікетаванне на 100 базавых велічыняў (3 200 беларускіх рублёў).
Сума штрафу, прыблізна роўная 1000 еўра, стала шокам для ўсёй сям'і. Апрача гэтага, пасля ператрусу з кватэры Палынскіх былі канфіскаваны кампутар і мабільны тэлефон журналісткі, а падчас затрымання на сустрэчы з Патрыярхам Кірылам у Ціны Палынскай забралі фотаапарат. Паводле яе словаў, міліцыянты забралі яго ў кошт пагашэння штрафу, не маючы нікіх сумнёваў адносна менавіта

такога судовага рашэння.
Кампутар і тэлефон Ціны Палынскай застаюцца ў СК, змест яе допісаў у сацыяльных сетках на працягу месяца будуць вывучаць эксперты-лінгвісты. Экспертыза павінна зрабіць высновы, ці ёсць у гэтых допісах абразы, паклёп або заклікі да супрацьзаконных дзеянняў.
Калі падазрэнні СК пацвердзяцца, супраць журналісткі распачнуць крымінальную справу.

**08.06.2022**

У судзе Першамайскага раёна Віцебска вынесены прысуд **Валерыю Елісееву** за абразу супрацоўніка ДАІ Ігара Вольніча. Суд прызнаў Валерыя вінаватым паводле арт. 369 (Абраза прадстаўніка ўлады) Крымінальнага кодэкса і асудзілі да 1,5 гадоў абмежавання волі з накіраваннем у ПУАТ. Асуджаны таксама мусіць часткова кампенсаваць пазоў пацярпелага міліцыянта і выплаціць яму 100 рублёў у якасці кампенсацыі маральнай шкоды.
Згодна абвінавачанню, 21 чэрвеня 2020 года, знаходзячыся ў Расіі, Елісееў пакінуў каментар “Повесить гада” у бок ганцавіцкага супрацоўніка Вольніча.
У сацсетцы “Аднакласнікі” ён размясціў на старонцы Вольгі Карач тэкст і каментар, якія утрымлівалі лаянкавыя нецэнзурныя выказванні ў адносінах да Войніча, якія ацэньвалі яго негатыўна і зневажалі гонар і годнасць.
Ён распавёў, што ў чэрвені 2022 года жыў на лецішчы ў Расіі, адкуль і пакінуў каментар. Мужчына зайшоў у інтэрнэт і ўбачыў у стужцы навіну пра затрыманне чалавека, якому Вольніч наступіў на галаву.
Чаму ён пакінуў каментар, ужо не памятае. Елісееў разумеў, што ягоны лаянкавы каментар адносіўся да супрацоўніка міліцыі. Таму ён прызнаў сябе вінаватым і папрасіў прабачэння ў супрацоўніка ДАІ і суда.
Пракурор Аляксей Бізуноў прасіў у судапрызначыць Елісееву пакаранне ў выглядзе двух гадоў абмежавання волі з накіраваннем у ПУАТ, а таксама спагнаць з абвінавачанага яшчэ тысячу рублёў на карысць пацярпелага.
Але суддзя Алена Жук асудзіла Елісеев да 1,5 гадоў абмежавання волі з накіраваннем у ПУАТ – “хіміі” і ацаніла пакуты Вольніча ў 100 рублеў замест 1500, якія папрасіў міліцыянт. А знаходжанне асуджанага пад вартай з 5 па 8 красавіка 2022 года, залічыла ў тэрмін пакарання.
Бок абвінавачання разглядае пытанне вынясення пракурорскага пратэсту, з-за мяккасці пакарання.

**09.06.2022**



Жыхары Віцебска **бацька і сын Кузнечыкі**, якія жылі ў амбасадзе Швецыі ў Мінску, уцяклі ў Латвію. Віталь і Уладзіслаў знаходзіліся на тэрыторыі амбасады з пачатку верасня 2020 года. Яны хацелі атрымаць палітычны прытулак у Швецыі, бо іх пераследавалі сілавікі за актыўны ўдзел у пратэстах, за што была заведзеная крымінальная справа. Рэлакацыя заняла крыху болей адных сутак.
Амбасада Швецыі ў Мінску не магла распачаць працэдуру бежанства, таму бацька з сынам проста жылі 21 месяц ў амбасадзе, каб знаходзіцца ў бяспецы.
1 чэрвеня Кузнечыкаў амбасадаўцы вывезлі ў горад на дыпламатычным аўтамабілі. Была рызыка, што палітуцякачоў «засякуць» сілавікі з дапамогай камер назірання якія былі растаўленыя па перыметры тэрыторыі амбасады. Але ўдача ад Кузнечыкаў не адвярнулась.
Калі бацка і сын апынуліся далёка ад амбасады, яны раздзяліліся і працягнулі па асобку свой шлях да свабоды. На аўтобусах і электрычках сваякі дабрацца у Віцебскую вобласць, таемна перашлі мяжу і апынулісь у Латвіі.

**09.06.2022**

28-гадовы палітвязень **Мікіта Палеонак** быў затырманы 16 студзеня ў Віцебску. За кратамі ён знаходзіцца амаль пяць месяцаў. Яго абвінавачваюць у абразе прэзідэнта (арт. 368 КК) і прадстаўнікоў улады (арт.369 КК).

Родныя палітвязня паведамляюць, што Мікіце передаюць лісты толькі ад сваякоў. Па загадзе кіраўніцтва СІЗА лісты ад іншых асобаў блакуюць, што ёсць адным з многіх спосабаў негатыўнага ўздзеяння на псіхічны стан абвінавачанага па палітычных матывах.
Беларускія праваабаронцы патрабуюць неадкладна вызваліць палітвязня Мікіту Палеёнка і спыніць крымінальны пераслед у дачыненні яго.

**09.06.2022**

Разгляд справы, распачатай паводле ч. 1 арт. 361-1 КК («Стварэнне экстрэмісцкага фармавання або ўдзел у ім») адбыўся 8 чэрвеня ў Магілёўскім абласным судзе. Суддзя Ігар Шведаў прызнаў журналіста вінаватым і прызначыў пакаранне ў выглядзе зняволення ў калоніі ўзмоцненага рэжыму на тэрмін 6 гадоў. Суд праходзіў у закрытым рэжыме.
**Андрэй Кузнечык** быў затрыманы 25 лістапада 2021 году. У ягонай кватэры ў Менску адбыўся ператрус. Пасля затрымання фрылансера сілавікі ненадоўга здолелі захапіць кантроль над тэлеграм-каналам «Радыё Свабода», з якой журналіст супрацоўнічаў у якасці фрылансера. На наступны дзень Андрэя Кузнечыка асудзілі судом Заводскага раёну Менску па адміністрацыйнай справе на 10 сутак, аднак 5 снежня на волю ён не выйшаў – быў зноў асуджаны тым самым судом яшчэ на 10 сутак. Але і 15 снежня яго не вызвалілі. Толькі 23 снежня сваякам стала вядома, што супраць Андрэя Кузнечыка распачалі ўжо і крымінальную справу. Падставы абвінавачання родным ніхто не паведаміў.
Журналіст-фрылансер нарадзіўся ў Віцебску і заўжды цікавіўся гісторыяй роднага гораду. Цяпер яму 43 гады, ён выпускнік ліцэю БДУ, скончыў філалагічны факультэту БДУ, а пазней аспірантуру. Віцебск, з якога з’ехаў у ранняй маладосці, ён не забываў ніколі: публікаваў фотаздымкі з малой радзімы, займаўся краязнаўствам.

**11.06.2022**

Судом Воршы і Аршанскага раёну вынесены прысуд па крымінальнай справе палітвязняў **Вячаслава Лютынскага** і **Дзмітрыя Матусевіча**. Іх абвінавацілі ў здзеку над дзяржаўным сімвалам. Кожны падсудны, ў рамках арт. 370 Крымінальнага кодэкса, быў пакараны 2 гадамі абмежавання волі з накіраваннем ва ўстанову адкрытага тыпу. Судовым працэсам кіраваў суддзя Дзмітрый Разумовіч.
Сяброў затрымалі 18 студзеня 2022 года па падазрэнні ў падпале дзяржаўнага сцяга Беларусі. Да суда абодва былі змешчаныя ў СІЗА № 2 Віцебска.
Паводле матэрыялаў абвінавачвання, у адзін са студзеньскіх вечароў 2021 года прыяцелі набылі ў краме дзяржаўны сувенірны сцяжок і на выхадзе спрабавалі яго спаліць. Гэта заўважыў ахоўнік крамы і выклікаў міліцыю.
Дзмітрый Матусевіч — з шматдзетнай сям'і. З малых гадоў дапамагаў гадаваць брата і сястру, паколькі дзеці былі без бацькі.
Матусевіч і Лютынскі прызналі сваю віну. Але не гледзючы на яе прызнанне суддзя Разумовіч прысудзіў кожнаму пакаранне ў выглядзе двух гадоў абмежавання волі з накіраваннем на “хімію”.

**13.06.2022**



**Паўла Севярынца** пазбавілі доўгатэрміновага спаткання з сям’ёй. Пасля гэтага, у красавіку, лідара Беларускай Хрысціянскай дэмакратыі, які адбывае пакаранне ў шклоўскай ПК №17, прызналі злосным парушальнікам рэжыму, скарацілі дазволеную колькасць тэлефанаванняў дадому і грашовых пераводаў.
Нядаўна Павел Севярынец паведаміў родным, што яго пазбавілі і доўгатэрміновага спаткання.
Палітыка і пісьменніка Паўла Севярынца ўтрымліваюць за кратамі ўжо больш за два гады. Ён быў затрыманы супрацоўнікамі МУС 7 чэрвеня 2020 году проста на вуліцы. Паўлу прысудзілі тры пакаранні арыштамі па 15 сутак за нібыта адміністрацыйныя правапарушэнні – за ўдзел у перадвыбарчых пікетах і заклікі да ўдзелу ў несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах. Аднак пасля 75 сутак адміністрацыйнага арышту Паўла Севярынца не выпусцілі на свабоду, а перавялі ў СІЗА №1 у статусе падазраванага паводле арт. 293 КК (Арганізацыя масавых беспарадкаў).

**15.06.2022**

Раніцай 13 чэрвеня затрымалі выкладчыцу гісторыі у СШ №2 г. Наваполацка **Алену Зубраву**. На наступны дзень судом Новаполацка яна была прызнана вінаватай па частцы 2 артыкула 19.11 КаАП Рэспублікі Беларусь і пакарана за распаўсюджванне інфармацыйнай прадукцыі, уключанай у рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў, адміністрацыйным арыштам тэрмінам на 15 сутак.
У судзе быў разгледжаны пратакол, паводле якога, у траўні месяцы Зубрава зрабіла рэпост з сайта «Радыё Свабода» у якім былі навіны пра Станіслава Шушкевіча.
Паколькі яшчэ ў снежні 2021 года суд Цэнтральнага раёну Мінску паводле матэрыялаў ГУБАЗіК МУС прызнаў тэлеграм-канал і сацсеткі Радыё Свабода «экстрэмісцкімі», то міліцыя выявіла ў дзеяннях склад адміністрацыйнага правапарушэння па арт. 19.11 КаАП.

**16.06.2022**

У Наваполацку на працоўным месцы затрымалі 32-гадовага супрацоўніка «Нафтана» **Барыса Жахоўскага**. Першы суд на Барысам адбыўся 16 траўня. Суддзя Вольга Баліка асудзіла яго да 15 сутак арышту за «распўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў» (арт. 19.11 КаАП). Але на волю ён не вышаў — быў складзены новы пратакол па арт. 19.11 КаАП. Вынікам сталі чарговыя 15 сутак.
15 чэрвеня Жахоўскага асудзілі трэці раз запар. Гэтым разам суддзя Зінаіда Балаболава прызнала Барыса вінаватым у «несанкцыянаваным пікетаванні» (арт. 24.23 КаАП) і арыштавала яго зноў на 15 сутак. Агулам мужчыну будуць утрымліваць за кратамі 45 дзён.

**16.06.2022**



Лекар з Віцебску, **Яўген Павелка**, які прымаў актыўны ўдзел у пратэстах эвакуіраваны. Ён змог бяспечна дабрацца да Грузіі і хутка там адаптавацца. «Беларускі дом у Варшаве» дапамог Яўгену атрымаць гуманітарную візу.
У жніўні 2020 года Павелка браў актыўны ўдзел у віцебскіх пратэстах, а таксама ў шматлікіх публічных акцыях “Медыкі супраць гвалту”. Тады яму ўдалося пазбегнуць затрыманняў і арыштаў, але ён быў звольнены з ФК Віцебск.
З-за брутальных рэпрэсій уладаў у дачыненні да грамадзянскіх актывістаў, ён быў вымушаны спыніць удзел у масавых мерапрыемствах і ўвесь час знаходзіўся ў чаканні хуткага арышту і суда.
Аднак гэтага інцыдэнту яму прыйшлося чакаць доўга, цэлых паўтара гады. Гэта адбылося 25 сакавіка 2022 года, калі міліцыянты прыйшлі ў паліклініку, дзе працаваў актывіст. Прама на працоўным месцы ён быў затрыманы і па пастанове пракурора быў зроблены вобыскі на працы і дома.
Пасля следчых дзеянняў яго не арыштавалі, але пасля размовы з сілавікамі Яўген зразумеў, што заставацца ў Беларусі яму небяспечна Яго папярэдзілі, што вядзецца пошук доказаў і калі яну будуць знойдзены, то яму пагражаў крымінальны пераслед па арт. 342 (Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, або актыўны ўдзел у іх) Крымінальнага кодэкса. Пасля доўгіх ваганняў Павелка з’ехаў у Тбілісі.

**18.06.2022**

Супрацоўнік «Нафтана» **Барыс Жахоўскі** знаходзіцца пад арыштам, прысуджаным яму 15 чэрвеня за ўдзел у несанкцыянаваным пікетаванні. Гэта ўжо трэці арышт запар – Жахоўскага асудзілі агулам на 45 сутак. Напярэдадні апошняга суду, 6 дзён таму, ён абвясціў сухую галадоўку.
За кратамі Барыс Жахоўскі знаходзіцца з 14 траўня. Супрацоўнікі міліцыі затрымалі яго ў Наваполацку проста на працоўным месцы.
Па затрыманні навапалачанін быў асуджаны за распаўсюджванне экстрэмісцкіх матэрыялаў – за рэпост артыкулу з інтэрнэт-рэсурсу, прызнанага «экстрэмісцкім». Суддзя Наваполацкага гарадскога суду Вольга Баліка асудзіла работніка «Нафтана» на 15 сутак арышту паводле арт. 19.11 КаАП.
Па сканчэнні гэтага тэрміну яго зноўку асудзілі на 15 сутак паводле такога ж самага абвінавачвання:

на яго склалі новы пратакол па арт. 19.11 КаАП. 15 чэрвеня Жахоўскага асудзілі трэці раз. Гэтым разам Наваполацкі гарадскі суд прызнаў яго вінаватым у несанкцыянаваным пікетаванні. Суддзя Зінаіда Балаболава пастанавіла пакараць Барыса Жахоўскага арыштам на чарговыя 15 сутак паводле арт. 24.23 КаАП.

**20.06.2022**



Навапалачанін **Данііл Раманаў** трапіў на «хімію» за «абразу» Дзмітрыя Балабы.
Уначы з 16 на 17 лістапада 2020-га году хлопец напісаў каментар пад фотаздымкам камандзіра АМАП Менгарвыканкаму Дзмітрыя Балабы. Змест каментару быў расцэнены як абражальны, і 18 траўня ў судзе Наваполацку Данііл Раманаў быў асуджаны на паўтара года «хіміі» «за абразу прадстаўніка ўлады» (арт. 369 КК).
Суддзя Віталь Лапко пакараў падсуднага абмежаваннем волі на паўтара года. Цяпер Данііл Раманаў адбывае пакаранне ў менскай ПУАТ-55. Таксама суд абавязаў яго выплаціць камандзіру АМАПу 1 500 рублёў у якасці матэрыяльнай кампенсацыі маральнай шкоды.
Крымінальную справу супраць жыхара Наваполацку распачалі праз год пасля з’яўлення каментара. 16 лістапада 2021-га году былі праведзеныя аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы, падчас якіх вывучаўся акаўнт і профіль, з якога быў напісаны каментар. 16 сакавіка 2022 году прыйшлі да высноваў, што акаўнт належыць Даніілу Раманаву. Высветлілася, што ён з’яўляецца ўдзельнікам і некалькіх Telegram-супольнасцяў, у тым ліку прызнаных «экстрэмісцкімі».

**20.06.2022**

У Полацку завяршыўся судовы працэс над 23-гадовай **Вольгай Кавалёвай**, якую абвінавацілі ў апаганьванні збудаванняў і псаванні маёмасці (арт. 341 Крымінальнага кодэксу). Матэрыяльны ўрон, нанесены жыллёва-камунальнай гаспадарцы гораду і ўжо кампенсаваны, склаў 161 рубель. Штраф, прысуджаны суддзём Уладзімірам Бясецкім, аказаўся ў 20 разоў большым – 3 200 рублёў (100 базавых велічынь).
У віну палачанцы паставілі тое, што 4 сакавіка яна зрабіла 5 надпісаў «Х.. вайне» з выкарыстаннем аэразольнага балончыка ружовага колеру на сценах камунальных збудаванняў.
Фотаздымкі некаторых надпісаў следчыя знайшлі ў ейным мабільным тэлефоне. Па матэрыялах абвінавачання, надпісы абражалі пачуцці грамадзян і наносілі ім маральныя пакуты. Зрэшты, гэты лозунг ніяк не быў вынаходніцтвам Вольгі Кавалёвай: яго візуальнае ўвасабленне ўпершыню выкарысталі ўдзельніцы расейскай групы «ТАТУ» яшчэ ў 2003 годзе, напярэдадні вайны ў Іраку. У той часы шмат якія дзеячы поп-культуры выказвалі пратэст супраць вайсковай агрэсіі…
Сведкамі на судовым працэсе, дзе разбіралі справу Вольгі Кавалёвай, былі яе сяброўкі і маці. Маці пазнала дачку па запісах з відэакамер яшчэ на этапе следства і пацвердзіла гэта ў судовым працэсе.

**22.06.2022**

З-за крымінальнага прыследу актывіст з Віцебска **Яўген Гуцалаў** эміграваў і жыве ў Турцыі. Не так даўно пра Гуцалава актыўна пісалі дзяржаўныя СМІ. Яшчэ б! Ён — той самы беларус, які за 10 дзён перасёк родную краіну з поўначы на поўдзень, прабегшы 650 кіламетраў. Усё змянілася пасля выбараў 2020 года.
За парушэнне рэжыму адбыцця пакарання адміністрацыя Наваполацкай папраўчай калоніі №1 змясцілі палітыка ў штрафны ізалятар. Афіцыйная версія заключаецца ў тым, што палітвязень нібыта ўступіў у канфлікт з сукамернікам, які заключаўся ў размове на падвышаных танах.
Віктар Дзмітрыевіч маральна ў парадку, ён стойка пераносіць усе нягоды жыцця ва ўмовах зняволення. Раней, зімой і вясной, былі праблемы, звязаныя з нізкімі начнымі тэмпературамі. Але зараз гэта менш актуальна, бо летам стала цяплей у памяшканнях калоніі.
Гэта ўжо не першы выпадак, калі Бабарыка караецца зняволеннем у камеру ШІЗА. У маі бягучага года ён быў пакараны суткамі за надуманыя парушэнне дысцыпліны. Доўгі час Бабарыка не атрымліваў лістоў, іх магчыма, перададуць пасля выхаду з ізалятара.

**25.06.2022**

Вядомы беларускі палітык **Мікалай Статкевіч** быў асуджаны да 14-ці гадоў зняволення ў калоніі асаблівага рэжыму паводле ч. 1 арт. 293 Крымінальнага кодэксу (Арганізацыя масавых беспарадкаў). Да 23 чэрвеня Статкевіча трымалі ў Гомельскім СІЗА. Стала вядома, што яго этапавалі ў Глыбоцкую ПК №13.
Мікалай Статкевіч быў затрыманы 31 траўня 2020 году ў Менску, калі збіраўся наведаць перадвыбарчы пікет Святланы Ціханоўскай. Па затрыманні яго двойчы каралі арыштамі па адміністрацыйных справах, і на волю ён больш не выйшаў. Больш за год цягнулася следства, і прысуд палітыку быў вынесены толькі 14 снежня 2021 году. Праваабарончая супольнасць Беларусі прызнала яго палітычным зняволеным. Да 23 чэрвеня Статкевіча трымалі ў Гомельскім СІЗА. Потым яго этапавалі ў Глыбоцкую ПК №13.

**29.06.2022**



**Дзмітрыя Сушчыка,** асуджанага да пазбаўлення волі на паўтара года, сёлета ў красавіку накіравалі ў аршанскую калонію № 8. У чэрвені 2022-га яго змясцілі ў ПКТ і на дзевяць месяцаў пазбавілі спатканняў і тэлефанаванняў.
На ім Дзмітрый прызнаецца, што «распаўсюджваў экстрэмісцкія матэрыялы і абражаў прэзідэнта». Супраць Дзмітрыя Сушчыка завялі крымінальныя справу па ч. 1 арт. 368 (Абраза Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь) і арт. 370 (Здзек з дзяржаўных сімвалаў). Падставай сталі рэпосты матэрыялаў, прызнаных у Беларусі экстрэмісцкімі, а таксама за каментары, якія ён размяшчаў у інтэрнэце.
З Дзмітрыя Сушчыка ўзялі падпіску аб нявыездзе. 17 лютага 2022 году ён быў затрыманы расейскімі памежнікамі, калі спрабаваў выехаць з Беларусі. 2 сакавіка 2022 году суд Навагрудскага раёну прызнаў Дзмітрыя вінаватым у здзяйсненні злачынства паводле ч. 1 арт. 368 («Абраза прэзідэнта Рэспублікі Беларусь») і прысудзіў яму 1,5 года пазбаўлення волі. Таксама суд прызнаў яго вінаватым у апаганьванні сцяга і герба Беларусі, прысудзіўшы па гэтым артыкуле 1 год пазбаўлення волі. Па сукупнасці пакаранняў шляхам паглынання менш строгага пакарання больш строгім у канчатковым выніку Дзмітрыю прысудзілі 1,5 года калоніі агульнага рэжыму.
У аршанскай калоніі № 8, куды ён быў накіраваны адбываць пакаранне, для палітвязня стварылі цяжкія ўмовы існавання. Блізкія просяць падтрымаць Дзмітрыя Сушчыка лістамі: нават калі яны не трапяць да яго цяпер, адміністрацыя абавязана аддаць іх пазней.

**29.06.2022**

У Наваполацку на працоўным месцы быў затрыманы машыніст кампрэсарных установак ВА "Нафтана" **Сяргей Бадуноў**. У Наваполацкім АУС, куды адвезлі затрыманага, супрацоўнікі міліцыі склалі на яго адміністрацыйны пратакол па частцы 2 арт. 19.11 КаАП "Распаўсюджванне інфармацыйнай прадукцыі, уключанай у рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў".
Падставай для затрымання стала падпіска на "Радыё Свабода". 3 сьнежня 2021 года суд Цэнтральнага раёну Менску паводле матэрыялаў ГУБАЗіК МУС прызнаў тэлеграм-канал і сацсеткі Радыё Свабода «экстрэмісцкімі».
24 чэрвеня суддзя суда Наваполацка Зінаіда Балаболава прызнала Бадунова вінаватым у распаўсюджванні экстрэмісцкіх матэрыялаў і арыштавала яго на 10 сутак нягледзячы на тое, што ў Сяргея пад апекай знаходзяцца двое непаўналетніх дзіцяці.

## Ліпень 2022

**02.07.2022**

Наваполацкаму грамадскаму актывісту прысудзілі другі арышт запар. Ён быў затрыманы 15 чэрвеня і асуджаны на 15 сутак за «распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў». 1 ліпеня яго асудзілі другі раз – за

несанкцыянаванае пікетаванне. Цяпер **Андрэй Галавырын** мусіць адбыць два арышты па 15 сутак запар, нягледзячы на праблемы са здароўем.
Бацькі Андрэя даведаліся, што падчас першага арышту ў наваполацкім ЦІПе ў яго здарыўся гіпертанічны крыз, і ўвогуле трымаецца высокі ціск. Пра гэта стала вядома падчас другога судовага працэсу, які праходзіў праз скайп. Пасля арышту, прысуджанага паводле артыкула 19.11 КаАП, Андрэй Галавырына асудзілі паводле артыкула 24.23 КаАП за жоўта-блакітны сцяг на аватарцы ў сацыяльных сетках. Суд расцаніў гэта як несанкцыянаванае пікетаванне.
Андрэй Галавырын – даўні ўдзельнік дэмакратычнага руху ў Наваполацку. У пачатку 2000-х ён далучыўся да «Моладзі БНФ» і неаднойчы быў затрыманым за распаўсюд улётак і г.д.

**02.07.2022**



Вакалістку полацкага гурта «Варган» **Ксенію Глот** асудзілі на 15 сутак арышту. Дзяўчыну затрымалі 30 чэрвеня. На яе склалі пратакол адміністрацыйнага правапарушэння па ч. 2 арт. 19.11 (Распаўсюджванне, выраб, захоўванне, перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або якая прапагандуе такую дзейнасць) КаАП Рэспублікі Беларусь.
Пасля разгляду пратакола суд Полоцкага раёна прызнаў Ксенію вінаватай у «распаўсюдзе экстрэмісцкіх матэрыялаў» і яна была пакарана 15 суткамі адміністратыўнага арышту.

**04.07.2022**

Суд Оршы і Аршанскага раёна 4 ліпеня вынес прысуд мясцоваму жыхару **Аляксею Чэкелю**, якога абвінавацілі ў абразе прэзідэнта Беларусі, згодна ч. 1 арт. 368 Крымінальнага кодэкса. Суддзя Вяршыніна прызнала віну Чэкеля даказанай і прысудзіла яму пазбаўленне волі ў калоніі агульнага рэжыму тэрмінам на паўтара года.
Па матэрыялах абвінавачання Аляксей пакінуў два абразлівыя каментары (адзін з іх — "Пр…") пад пастамі пра Аляксандра Лукашэнку ў групах "Вікінг" і "Мая краіна Беларусь".
Суд палічыў змякчальнымі абставінамі наяўнасць у абвінавачанага на выхаванні непаўнагадовага сына, а таксама ўлічыў станоўчую характарыстыку з месца працы Чэкеля - Аршанскай дыстанцыі шляху Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі.

**05.07.2022**

У судзе Кастрычніцкага раёна Віцебска вынесены прысуд 35-гадовага **Віктару Власенку**. Яго прызналі вінаватым па двух артыкулах — арт. 368 і арт. 369 Крымінальнага кодэкса, — а таксама паводле арт. 328 Крымінальнага кодэкса (пры вобшуку ў яго дома была знойдзеная марыхуана для ўжывання). Канчатковае пакаранне ў выглядзе чатырох гадоў пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму прызначанае шляхам частковага складання пакаранняў па трох артыкулах.
Прысуд вынесла суддзя Сняжана Кіндзеева. Бок дзяржабвінавачання падтрымаў старшы памочнік пракурора Андрэеў.
Пацярпелымі па справе прызнаныя намеснік міністра МУС Мікалай Карпянкоў, якому Власенка выплаціў тысячу рублёў маральнай шкоды і Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Наталля Качанава.
У 2021 годзе ў суполцы "Беларусь головного мозга" і "Каратели Беларуси" Власенка пакінуў каментары, якія зневажаюць гонар і годнасць і ўтрымліваюць негатыўную ацэнку прадстаўнікоў улады. Гэта было пацверджана лінгвістычнай экспертызай.
С месца працы мужчыны быў дасланы ліст, у якім арганізацыя прасіла суд прызначыць для Власенка пакаранне, не звязанае з пазбаўленнем волі: у гэтым выпадку яны гарантавалі яму працоўнае месца. Але гэты зварот суд праігнараваў пры вынявенні прысуду, бо была абцяжарваючыя пакаранне акалічнасць - раней абвінавачаны быў судзімы.

**05.07.2022**

Раённы суд С. Пецярбурга падоўжыў на 4,5 месяцы меру стрымання аршанцу **Андрэю Рускіх.**
Беларус быў затрыманы 28 траўня па абвінавачваннях у абразе Лукашэнкі і распальванні расавай, нацыянальнай, рэлігійнай або іншай сацыяльнай варожасці ці варожасці. Прычынай абвінавачання сталі некалькі каментароў у сацыяльных сетках. З Беларусі ўжо паступіла патрабаванне аб выдачы Андрэя. Ён прабудзе ў СІЗА да 27 лістапада.
Пракурор лічыць, што Андрэй Рускіх можа ўцячы, што перашкодзіць пракуратуры выканаць свае міжнародна-прававыя абавязацельствы перад Рэспублікай Беларусь. Бок абароны сцвярджае, што ўтрыманне пад вартай празмернае і неабгрунтаванае. Усе прадстаўленыя беларускім бокам працэсуальныя матэрыялы не завераны належным чынам.
У Расійскай Федэрацыі Рускіх знаходзіцца на законных падставах, мае часовую рэгістрацыю ва Уладзіміры. У Санкт-Пецярбургу ў яго жыве дзяўчына.
Праз адміністрацыю СІЗА Андрэй падаў заяву аб прызнанні яго бежанцам (асоба са статусам бежанца не можа быць выдадзена без яго згоды), але яшчэ не атрымаў уваходны нумар. Адвакат Фадзеева паабяцала ў бліжэйшы час даведацца пра лёс гэтай заявы.
Таксама адвакатка Фадзеева звярнула ўвагу суда на невыкананне правоў чалавека ў Беларусі і прадставіла даведку, падрыхтаваную камітэтам «Грамадзянскае садзейнічанне», аб сітуацыі з правамі чалавека ў рэспубліцы.

**07.07.2022**



**Мікалай Статкевіч** напісаў заяву на адзіночнае ўтрыманне ў Глыбоцкай калоніі. Гэта стала вядома з лістоў палітвязня, якога этапавалі адбываць пакаранне ў папраўчую калонію асаблівага рэжыму №13 у Глыбокім. Паводле Марыны Адамовіч, жонкі зняволенага апазіцыйнага палітыка, гэта не стала нечаканасць, бо глыбоцкая ПК – гэта адзіная калонія ў Беларусі, дзе ўтрымліваюцца асуджаныя да асаблівага рэжыму, асуджаныя да пажыццёвага ўтрымання або паўторна за цяжкія злачынствы.
Да 22 чэрвеня Статкевіча трымалі ў Гомельскім СІЗА, потым этапавалі ў Глыбокае праз Віцебск, пэўны час ён знаходзіўся ў віцебскім СІЗА-2. З 24 чэрвеня ён знаходзіцца ў каранціне глыбоцкай калоніі. У першы ж дзень яго паставілі на ўлік, як схільнага да экстрэмізму.

**07.07.2022**

**Аляксандр Вольскі** асуджаны за допіс «ВКонтакте» паводле арт. 130 Крымінальнага кодэксу (Распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай або сацыяльнай варожасці) да 3-х гадоў «хіміі».
Віктар Уласенка асуджаны да 4-х гадоў калоніі агульнага рэжыму адразу па трох крымінальных артыкулах, у тым ліку за абразу Лукашэнкі і прадстаўнікоў улады. Аляксандра Вольскага асудзілі за каментар, змест якога не разгалошваецца, «напісаны з прычыны інфармацыі пра супрацьпраўныя дзеянні супрацоўнікаў МУС у дачыненні да мірных пратэстоўцаў».
Што да Віктара Уласенкі, асуджанага ў тым ліку і за захоўванне марыхуаны для асабістага ўжывання, то менавіта палітычны складнік абвінавачання (арт. 368 і арт. 369 КК) ставіць яго ў горшае становішча ў параўнанні з іншымі асуджанымі ў падобнай сітуацыі без палітычнага матыву, лічаць праваабаронцы

**07.07.2022**

**Уладзіміра Булаўскага** асудзілі да 30 сутак арышту. Судовы працэс прайшоў у судзе Чыгуначнага раёну, але трапіць туды сябры Булаўскага не здолелі. Да апошняга моманту не было вядома, калі адбудзецца суд, і ці будзе ён увогуле. Даведацца ўдалося толькі пра вынік: 30 сутак арышту за парушэнне парадку арганізацыі і правядзення масавых мерапрыемстваў (арт 24.23 КаАП).
За якое канкрэтна парушэнне асуджаны Уладзімір Булаўскі, не ведаюць нават тыя ягоныя сябры, якія бачылі ягонае затрыманне. Яно адбылося 6 ліпеня ў райцэнтры Сянно, дзе віцебскі музыка і арт-мэнеджэр планаваў выступіць на канцэрце «Купальскае кола».

**11.07.2022**

Суддзя суда Віцебскага раёна Ганна Ігнаценка разгледзела крымінальную справу **Аляксея Вячэрняга**, абвінавачанага ў абразе прэзідэнта ў рамках артыкула 368 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Вынікам разгляду стаў прысуд, згодна якога, Вячэрні правядзе адзін год і дзевяць месяцаў у калоніі агульнага рэжыму.
Вячэрні – грамадзянін Беларусі, але украінец, які нарадзіўся ў Чаркаскай вобласці. Удзельнічаў у рэспубліканскіх фестывалях народнай творчасці ў Беларусі. Выхоўвае 16-гадовага сына.
Пасля пачатку абстрэлу Украіны з тэрыторыі Беларусі на эмацыйнай хвалі напісаў верш, запісаў яго на відэа і выклаў у Tik-Tok. У вершы прысутнічалі словы, якія абразілі прэзідэнта, прынізілі ягоныя гонар і годнасць.
Па матэрыялах абвінавачання Вячэрні 20 сакавіка 2022 года, знаходзячыся па месцы жыхарства ў аграгарадку Вымна Віцебскага раёна пры дапамозе мабільнага тэлефона ў сервісе Tik-Tok размясціў выраблены ім відэазапіс, у якім дапусціў у непрыстойнай і зняважлівай форме публічную абразу прэзідэнта. Старонка была прагледжаная не меней чым 244 разы.
Сваю віну ў судзе прызнаў цалкам.
Абвінавачанне запрасіла для Вячэрняга пазбаўленне волі ў калоніі агульнага рэжыму тэрмінам на два гады. Суд вырашыў зменшыць прапанаваны пракурорам тэрмін на тры месяцы і пакараў Аляксея Вячэрняга 21 месяц у калоніі агульнага рэжыму.

**13.07.2022**

Двое аршанцаў, прыгавораныя да абмежавання волі, змаглі з'ехаць за мяжу Жыхары Оршы **Дзмітрый Матусевіч** і **Вячаслаў Лютынскі павінны** былі ў нядзелю, 10 ліпеня прыбыць да месца пачатку адбывання пакарання ў выглядзе "хіміі", але замест гэтага апынуліся ў іншай краіне, дзе яны апынуліся ў недасяжнасці беларускай пенітэнцыярнай сістэмы.
Сяброў затрымалі 18 студзеня 2022 года па падазрэнні ў падпале дзяржаўнага сцяга Беларусі. Да суда абодва былі змешчаныя ў СІЗА № 2 Віцебска.
Паводле матэрыялаў абвінавачвання, у адзін са студзеньскіх вечароў 2021 года прыяцелі набылі ў краме дзяржаўны сувенірны сцяжок і на выхадзе спрабавалі яго спаліць. Гэта заўважыў ахоўнік крамы і выклікаў міліцыю.
Дзмітрый Матусевіч — з шматдзетнай сям'і. З малых гадоў дапамагаў гадаваць брата і сястру, паколькі дзеці былі без бацькі.
Матусевіч і Лютынскі прызналі сваю віну. Але не гледзючы на яе прызнанне суддзя Разумовіч прысудзіў кожнаму пакаранне ў выглядзе двух гадоў абмежавання волі з накіраваннем на “хімію”.

**13.07.2022**

Па заяве пракурора Віцебскай вобласці 13 ліпеня старонка віцябляніна **Сяргея Сесіцкага** ў сацыяльнай сетке Фейсбук (https://www.facebook.com/sergey.sesitsky) прызнана экстрэмісцкімі матэрыяламі. Гэта чарговая спроба выдаліць інфармацыйны рэсурс Сяргея з публічнага абарота.
Яшчэ ў красавіку 2019 года Сяргея апыталі наконт зместу ягонай старонкі ў сацыяльнай сетцы “Фэйсбук” і забралі мабільны тэлефон. Тады прадстаўнік крымінальнага вышуку паведаміў мужчыне, што следчыя праводзяць праверку на наяўнасьць прапаганды экстрэмізму або распальваньня міжнацыянальнай варожасьці.
У жніўні 2017 года прыхільнікі “русского мира” спрабавалі скардзіцца на Сяргея ў Следчы камітэт Расейскай Фэдэрацыі, але вынікаў гэта ня мела.

**13.07.2022**



Маскоўская Хельсінкская група паведаміла 12 ліпеня аб адказе № 4182/2022 з Камітэта па правах чалавека адносна беларускі **Яны Пінчук**. Камітэт прызнаў абгрунтаванымі рызыкі непапраўнай шкоды ў выпадку экстрадыцыі Яны ў Беларусь і папрасіў урад Расеі ўстрымацца ад выдачы, каб даць Пінчуку доступ да ўнутраных працэдур атрымання прытулку. Ці спыніць рашэнне Камітэта экстрадыцыю, невядома.
МХГ звярнуліся ў КПЧ ААН 4 ліпеня з просьбай

прымяніць часовыя меры і спыніць працэс экстрадыцыі Яны да разгляду яе індывідуальнага паведамлення (скаргі) у Камітэт па сутнасці.
Камітэт знайшоў абгрунтаванымі рызыкі непапраўнай шкоды ў выпадку экстрадыцыі і папрасіў Урад Расіі ўстрымацца ад выдачы Яны каб даць ёй доступ да ўнутраных працэдур прадастаўлення прытулку; забяспечыць яе неадкладны доступ да прадметаў першай неабходнасці; і забяспечыць абарону яе жыцця, фізічнай і псіхічнай недатыкальнасці, пакуль яе справа знаходзіцца на разглядзе Камітэта.
Згодна з пунктам 2 правіла 94 Правілаў працэдуры Камітэта непрыняцце такіх мер несумяшчальна з абавязацельствам добрасумленна выконваць працэдуру разгляду індывідуальных паведамленняў згодна з Факультатыўным пратаколам Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах.
Разгляд апеляцыі беларускі па пытанні яе экстрадыцыі адкладзены на 21 ліпеня.

**14.07.2022**

Палітвязень, асуджаны да 14-ці гадоў зняволення ў калоніі асаблівага рэжыму паводле ч. 1 арт. 293 Крымінальнага кодэксу (Арганізацыя масавых беспарадкаў), з 24 чэрвеня знаходзіцца ў глыбоцкай ПК-13. У апошніх лістах да жонкі ён паведамляе пра штодзённы ціск на яго з боку адміністрацыі. Праваабаронцы адзначаюць, што ўмовы ўтрымання ў гэтай калоніі (народная назва «Беразвечча») надзвычай жорсткія, што да стаўлення да зняволеных.
На сваёй старонцы ў Фэйсбуку **Марына Адамовіч**, жонка зняволенага апазіцыйнага палітыка, цытуе ліст ад мужа з-за кратаў: « 5-га ліпеня – абвешчана вымова, 6-га ліпеня быў пазбаўлены перадачы (адзінай на год згодна з рэжымам), 7-га ліпеня – адпраўлены ў ШІЗО на восем сутак, 12-га ліпеня – пазбаўлены спаткання.15-га ліпеня павінен выйсці з ШІЗО. Верагодна, будзе працяг, як лічыць сам Мікалай».
З лістаў Мікалая Статкевіча вядома, што адразу ж па прыбыцці ў глыбоцкую калонію ён напісаў заяву на адзіночнае ўтрыманне ў сувязі з пагрозамі ад сукамернікаў і адміністрацыі. Аднак гэтую заяву не задаволілі, як вынікае з чарговага ліста палітвязня.

**15.07.2022**

У судзе Полацку і Полацкага раёну да 15-ці сутак арышту асудзілі старшыню Свабоднага прафсаюзу Беларускага **Мікалая Шараха**. Суддзя Раіса Штуро разбірала дзве адміністрацыйныя справы, распачатыя за незаконнае пікетаванне – за жоўта-блакітны сцяг на аватарцы ў Фэйсбуку ( арт. 24.23.КаАП) і за распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў праз старонку ВКонтакте (арт.19.11 КаАП). Перад пачаткам пасяджэння Мікалай Шарах заявіў пра неабходнасць пазнаёміцца з матэрыяламі справаў, і ў дакументах ўбачыў дзве ўжо гатовыя судовыя пастановы – два разы па 15 сутак. Аднак падчас працэсу ўсё пайшло не так, як было запланавана.
Мікола Шарах адразу заявіў, што лічыць суд не аб’ектыўным – раз пастановы ўжо напісаныя. Але суддзю Раісу Штуро гэта не збянтэжыла: яна вырашыла працягваць працэс.
Разбор справы пра распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў адразу зайшоў у тупік: Мікалай Шарах не мае старонкі «ВКонтакте», таму абвінавачванні ў распаўсюдзе чагосьці праз гэтую сацыяльную сетку лічыць беспадстаўнымі. Больш за тое: 5 месяцаў таму ён звяртаўся ў міліцыю з заявай пра тое, што нехта ад ягонага імя стварыў старонку пад ягоным імем і з ягоным фотаздымкам. Міліцыя не знайшла «аўтара» фэйку, але нават на гэтай старонцы апошняя актыўнасць датуецца мінулым годам. Пасля абвешчанага перапынку, які працягваўся больш за гадзіну, суддзя Раіса Штуро пастанавіла вярнуць справу на дапрацоўку ў міліцыю.

**15.07.2022**

2 гады калоніі прысудзілі жыхарцы Докшыц «за фінансаванне пратэстнай дзейнасці». Справу **Вольгі Ялцэвіч** разбіраў суд Маскоўскага раёну Брэста ( па месцы рэгістрацыі жанчыны).
Суддзя Яўген Брэган прызнаў Вольгу Ялцэвіч вінаватай паводле ч. 2 артыкула 342 Крымінальнага кодэксу). Згодна з матэрыяламі следства, ад імя замежнага фонду яна публікавала інфармацыю аб зборы грошай «для падтрымкі грамадзян, якія прымалі ўдзел у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь».
Суддзя Яўген Брэган прызнаў Вольгу Ялцэвіч вінаватай паводле ч. 2 артыкула 342 Крымінальнага кодэксу). Згодна з матэрыяламі следства, ад імя замежнага фонду яна публікавала інфармацыю аб зборы грошай «для падтрымкі грамадзян, якія прымалі ўдзел у несанкцыянаваных масавых мерапрыемствах на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь».

Суд паставіў жанчыне ў віну тое, што сумесна з яго кіраўніком фонду і іншымі асобамі з 13 жніўня па 19 снежня 2020 года яна нібыта аплочвала сумы накладзеных на правапарушальнікаў грашовых спагнанняў, паслугі адвакатаў, дзяржаўную пошліну за падачу скаргаў, аказанне іншай матэрыяльнай дапамогі, а таксама зрабіла пералік сродкаў у кошт пакрыцця шкоды, нанесенай дзяржаве супрацьпраўнымі дзеяннямі. Гэтым яна нібыта «матэрыяльна забеспячвала асобаў для ўдзелу ў групавых дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак, спалучаных з відавочным непадпарадкаваннем законным патрабаванням прадстаўнікоў улады».

**16.07.2022**

На 3 гады "хіміі" асуджаны жыхар Полацка за абразы супрацоўнікаў міліцы. Такі прысуд вынесла суддзя суда Полацка і Полацкага раёна Раіса Штуро 13 ліпеня Ігару Іванову, які абвінавачваўся ў абразе супрацоўнікаў міліцыі і Дэпартамента выканання пакаранняў у межах артыкула 369 Крымінальнага кодэкса. Таксама суд задаволіў патрабаванні чатырох пацярпелых у кампенсацыі маральнай шкоды ў памерах 1 000 рублёў кожнаму.
Па матэрыялах абвінавачання, Ігар 8 верасня 2021 года ў глабальнай сетцы інтэрнет у тэлеграм-чаце "Шалтай-Балтай" размясціў абразлівыя каментары ў адрас першага намесніка Дэпартамента выканання пакаранняў МУС. Ён жа 27 верасня ў іншых каналах абразіў некалькі супрацоўнікаў міліцыі, размясціўшы фотаздымкі з ненарматыўнымі надпісамі.
Пад час судовага следства высветлілася, што 7 чэрвеня 2022 года, судом Полацка і Полацкага раёна, за абразу прадстаўнікоў улады, абвінавачаны быў асуджаны на два з паловай гады хатняй "хіміі". Справу тады разглядаў суддзя Уладзімір Бясецкі.
Ігар Іваноў у судзе прызнаў сваю віну, патлумачыў, што зрабіў гэта на эмоцыях, паддаўшымся агульнаму настрою ўдзельнікаў чату.
Пацярпелыя на суд не з'явіліся, у судзе зачыталі іх паказанні на этапе следства. Яны вылучылі таксама матэрыяльныя прэтэнзіі маральнай шкоды.
Абвінавачанне запрасіла для Іванова абмежаванне волі з накіраваннем ва ўстанову адкрытага тыпу тэрмінам на тры гады, улічваючы папярэдні прысуд.
Суд пастанавіў прызнаць Іванова вінаватым і пакараў яго трымя гадамі "хіміі" і штрафу ў памеры 2 880 рублёў (недаплочаная сума па першаму прысуду).

**18.07.2022**

Ксёндз **Андрэй Вашчук** асуджаны да 15 сутак арышту. Працэс прайшоў у судзе Першамайскага раёну Віцебску, афіцыйных абвестак пра яго ў раскладзе працы суду не было, хаця вернікі хацелі падтрымаць святара падчас судовага разбору. Ксёндз Андрэй Вашчук асуджаны паводле арт. 24.23 КаАП за нібыта парушэнне заканадаўства аб масавых мерапрыемствах.
Ксёндз Андрэй Вашчук ужо некалькі гадоў служыць пробашчам у віцебскай парафіі Святога Духа. Ён шмат працуе з моладдзю, не губляе сувязяў, што да рэлігійных справаў, і са сваёй малой радзімай – Браслаўшчынай.

**20.07.2022**

За першыя 6 месяцы 2022 года судамі Віцебскай вобласці прызнаны 73 інфармацыйных рэсурсаў, якія распаўсюджваюць экстрэмісцкія матэрыялы. У рэпрэсіях супраць свабоды распаўсюджвання інфармацыі ў сетцы Інтэрнэт прынялі ўдзел суддзі 20 раённых судоў рэгіёна. У параўнанні з пачаткам года, штомесячная колькасць прызнання матэрыялаў экстрэмісцкімі засталася на адным и тым жа ўзроўні.
Суд Кастрычніцкага раёну прыняў 21 рашэнне ў дачыненні да 30 тэлеграм-каналу. Суд Чыгуначнага раёну Віцебску вынес 12 рашэнняў у дачыненні да 16 медыярэсурсаў. Суд Першамайскага раёну зрабіў гэта адзін раз і прызнаў наяўнасць экстрэмісцкіх матэрыялаў у двух інтэрнэт-рэсурсах.
Калі казаць пра выніковасць, то далей ідуць раённыя суды Віцебскай вобласці, якія прынялі 23 рашэння у дачыненні да 23 ТГ.
Так, суд Наваполацка прызнаў экстрэмісцкімі матэрыяламі на трох рэсурса, а суды, Верхнедзвінскага, Ушацкага, Шаркоўшчынкага Докшыцкага раёнаў на двух.
Суды Лепельскага, Дубровенскага, Шумілінскага, Полацкага, Браслаўскага, Ліёзненскага, Сенненскага, Расонскага, Бешанковіцкага, Аршанскага, Чашніцкага і Глыбоцкага раёнаў – па адным.
Ва ўсіх выпадках суды скарысталіся правам неадкладнага выканання сваіх рашэнняў, паколькі, на думку суддзяў, прамаруджванне ў выкананні рашэння можа прывесці да значнай шкоды для дзяржавы або зрабіць немагчымым самое выкананне.

**21.07.2022**



У Віцебску, у судзе Чыгуначнага раёну Віцебску прайшоў працэс над фігурантам берасцейскай «карагоднай справы» **Сяргеем Наліўкам**. Суддзя Дзяніс Аляксеенка пастанавіў перавесці палітвязня з "хіміі" у папраўчую калонію тэрмінам на шэсць месяцаў і адзін дзень. Дагэтуль, паводле рашэння суду Маскоўскага раёну Берасця, палітзняволены Сяргей Наліўка адбываў прысуджаны ў красавіку 2021г. тэрмін абмежавання волі (два гады хіміі) у віцебскай ПУАТ №9.

Што канкрэтна стала прычынай ужывання да Сяргея Наліўкі больш суровага пакарання, пакуль не вядома. Паводле інфармацыі праваабаронцаў, з 18 красавіка па 18 мая Сяргея ўтрымлівалі ў ШІЗА за парушэнне рэжыму.

**22.07.2022**

Суддзя суда Полацкага раёна і Полацка Яніна Марцулевіч 19 ліпеня адмовілася аднавіць на працы **Юрыя Шчарбакова** звольненага з ААТ «Полацак-Шкловалакно» пасля адбывання 30 сутак адміністратыўнага арышту.

У судовым паседжанні працоўны Шчарбакоў заявіў аб тым, каб кіраўніцтва прадпрыемства спыніла яго дыскрымінацыю па палітычных матывах, выплаціла маральную шкоду ў памеры дзесяць тысяч рублёў і аднавіла на працу на ранейшай пасадзе.

Сваё звальненне Юры лічыць незаконным, бо ён да 27 траўня і на працягу трыццаці дзён не працаваў з прычыны трыццаці сутачнага арышту, прызначанага тым жа полацкім судом. Тады судзьдзя Андрэй Дзергачоў прызнаў, што Шчарбакоў парушыў арт. 24.23 КаАП РБ, калі ў сацсетцы Фэйсбука размясціў некалькі карыкатур, якія высмейваюць фашызм і рэпосты з Белсату і ТУТ.бай.

З свайго боку Юрый прапанаваў наймальніку заключыць міравое пагадненне. Ён адмаўляецца ад выплаты маральнай шкоды і страт у зарплаце за вымушаны прагул, а наймальнік заключае з ім новы кантракт тэрмінам на пяць гадоў, таму што Юрыю застаецца 6 гадоў да пенсіі.

**24.07.2022**



Ксяндза **Андрэя Вашчука** асудзілі ў зняволенні яшчэ раз. Пробашчу віцебскай парафіі Святога Духа прысудзілі ўжо другі арышт на 15 сутак. Суд адбыўся ў часе першага арышту ксяндза Андрэя, які быў затрыманы 15 ліпеня, асуджаны 18 ліпеня, і цяпер утрымліваецца ў віцебскі ІЧУ.

Ні на першы суд, ні на другі нікому трапіць не ўдалося, таму дакладных звестак, за што асудзілі Андрэя Вашчука, дагэтуль няма. Паводле розных версій, першы раз ён быў асуджаны паводле артыкула 24.23 КаАП за нібыта арганізацыю несанкцыянаванага масавага мерапрыемства. Што да другога суду, які мог адбыцца ў мінулую пятніцу, то гапярэдадні ў праўладных пабліках з’явілася інфармацыя пра тое, што святара падазраюць у распаўсюджанні так званых экстрэмісцкіх матэрыялаў. І што ўвогуле сілавыя структуры млгуць звінаваціць яго ў закліках да масавых пратэстаў супраць вынікаў мінулых прэзідэнцкіх выбараў.

**26.07.2022**

У Наваполацкім гарадскім судзе адбыўся працэс над **Кацярынай Вінакуравай**, якую прызналі вінаватай паводле артыкула 19.11 КаАП. Маладую жанчыну аштрафавалі за рэпост артыкула пра смерць

паэта і мастака Міхала Анемпадыстава, які сышоў у лепшы свет у 2018 годзе. Пра гэта шырока паведамлялася ў незалежным друку, і жыхарка Наваполацку тады ж зрабіла рэпост з аднаго з найстарэйшых беларускіх выданняў, якое праз некалькі год прызналі экстрэмісцкім.
Паводле Кацярыны Вінакуравай, 11ліпеня да яе дадому прыйшлі міліцыянты і запатрабавалі, каб яна разам з імі паехала ў пастарунак для складання пратаколу за распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў. Кацярына адмовілася, бо гадуе грудное дзіця, і тады аднаго міліцыянта пакінулі яе «вартаваць», а астатнія паехалі на працу, каб прывезці паперы.
Жанчына вельмі здзівілася, даведаўшыся, за што яе вінавацяць. На яе думку, цяпер міліцыянты вельмі старанна праглядаюць старонкі актывістаў у сацыяльных сетках, шукаючы прыкметаў або «незаконнага пікетавання», калі ў чалавека на аватарцы, да прыкладу, украінскі сцяг, або вось такіх, хай сабе і даўніх, рэпостаў з незалежных СМІ, абвешчаных «экстрэмісцкімі».
Прызнаўшы Кацярыну Вінакураву вінаватай, суд аштрафаваў яе на 25 базавых велічынь (800 рублёў). Ад арышту жанчыну ўратавала толькі наяўнасць малога дзіцяці, бо за падобныя правапарушэнні на Полаччыне апошнім часам караюць суткамі зняволення, як гэта было з удзельніцай гурту «Варган» Ксеніяй Глот або наваполацкім грамадскім актывістам Андрэем Галавырыным ці «нафтанаўцам» Сяргеем Бадуновым.

**27.07.2022**

Адміністрацыя калоніі трымае палітзняволенага праваабаронцу Судаленка ў інфармацыйнай ізаляцыі. Зняволены з 27 студзеня знаходзіцца ў папраўчай калоніі №3, якая месціцца ў пасёлку "Віцьба" Віцебскага раёна Віцебскай вобласці. Там ён адбывае трох гадовы тэрмін пазбаўлення волі ў калоніі з агульным рэжымам адбывання пакарання у рамках прысуду па арт. 342 Крымінальнага кодэкса (групавыя дзеянні, якія груба парушаюць грамадскі парадак).
Не так даўно з праваабаронцам сустракаліс сваякі, якія паведамілі грамадскасці пра тое, што здароўе Леаніда ў норме. А вось ўсе лісты з волі да яго практычна не даходзіць.
Таму можна казаць пра тое, што адміністрацыя калоніі стварыла татальную ізалацыю палітзэка. Пра многія рэчы, якія адбываюцца ў Беларусі і за яе межамі, ён дазнаецца пад час зносін з выпадковыя людзямі. Напрыклад, пра вайну ва Украіне паведамілі яму пад час сустрэчы ягоныя родныя.
Калі распавялі пра трагедыю знішчанага расейскімі войскамі Марыупаля, Леанід спярша не паверыў, падумаў, што нешта сваякі пераблыталі.

**27.07.2022**



Журналіст Радыё Свабода **Ігар Лосік** знаходзіцца за кратамі ўжо больш за два гады: 25 чэрвеня 2020 г. ён быў затрыманы, а ў снежні 2021 г. быў асуджаны да 15 гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму. Гомельскі абласны суд прызнаў яго вінаватым паводле ч. 1 арт. 293 Крымінальнага кодэксу («Арганізацыя масавых беспарадкаў») і паводле арт. 130 Крымінальнага кодэксу («Распальванне варожасці ці варажнечы»). Сёлета 22 чэрвеня Ігара Лосіка накіравалі ў наваполацкую ПК №1, а да яго дадому днямі прыйшлі судовыя выканаўцы ды арыштавалі маёмасць.
Палітвязень Ігар Лосік родам з Баранавічаў, там цяпер засталася ягоная сям’я – жонка Дар’я і дачка Паўліна. Да іх і прыйшлі судовыя выканаўцы, шукаючы, што б можна было апісаць.
Мяркуецца, што за грошы з продажу маёмасці будзе пагашана сума шкоды, нанесенай дзяржаве дзейнасцю Ігара Лосіка і іншых фігурантаў ягонай справы. Паводле версіі суду, яна складае 2,5 мільёна рублёў, да гэтага дадаюцца каля 130 тысяч рублёў судовых выдаткаў. Усе гэтыя грошы дзяржаўныя органы збіраюцца спагнаць з родных асуджаных. Паводле заканадаўства, Ігар Лосік можа і сам выкупіць уласную маёмасць, але на гэты ён павінен атрымаць дазвол у Аддзеле прымусовага выканання.

**30.07.2022**

Суд Санкт-Пецярбурга падоўжыў на тры месяцы ўтрыманне ў СІЗА **Яны Пінчук**, якую хочуць выдаць уладам Беларусі з-за абвінавачання ў вядзенні апазіцыйнага Telegram-канала.

Васілевостраўскі раённы суд Санкт-Пецярбурга, 29 ліпеня, працягнуў на тры месяцы арышт 25-гадовай жыхаркі Віцебска Яны Пінчук. На працягу ўтрымання дзяўчыны ў СІЗА настойвала пракуратура, бо гэта неабходна "для ўзгаднення месца і часу перадачы яе кампетэнтным органам Рэспублікі Беларусь".
Раней расейскі суд пакінуў у сіле рашэнне аб экстрадыцыі Пінчук у Беларусь, дзе яе абвінавачваюць у адміністраванні ТК "Віцебск 97%", які беларускі суд прызнаў "экстрэмісцкім".
Дзяўчыну затрымалі ў Расіі восенню 2021 года па запыце Беларусі, з лістапада яна знаходзіцца ў СІЗА і некалькі разоў скардзілася на ўмовы ўтрымання. Віну яна не прызнала. Адвакаты спрабавалі абскардзіць пастанову Генеральнай пракуратуры РФ аб экстрадыцыі Пінчук, а Камітэт па правах чалавека ААН выказваў пярэчанні ў сувязі з гэтым рашэннем, але расейскі суд пакінуў яго ў сіле.

## Жнівень 2022

**01.08.2022**

Віцебскі абласны суд прыняў рашэнне ліквідаваць грамадскае аб'яднанне "Полацкі яўрэйскі культурны цэнтр". Без малога 30 гадоў сябры гэтай арганізацыі садзейнічалі развіццю яўрэйскай культуры. Ініцыятарам закрыцця грамадскай арганізацыі стала кіраўніцтва Упраўлення юстыцыі па Віцебскай вобласці. Такім чынам, магчыма, уладамі дадзены старт працэсу разгрому габрэйскага сацыяльна-культурнага асяроддзя на Віцебшчыне.
У 1992 годзе на тэрыторыі Беларусі пачалі аднаўляць сваю дзейнасць міжнародныя яўрэйскія арганізацыі. Дзякуючы іх дапамозе і ў Полацкім рэгіёне ўзніклі яўрэйскія арганізацыі.
Асноўная роля ў фінансаванні адраджэння яўрэйскага жыцця належала Амерыканскаму яўрэйскаму аб'яднанаму размеркавальнаму камітэту “Джойнт” і Сусветнаму яўрэйскаму Агенцтву для Ізраіля “Сахнут”.
Дзякуючы дапамозе яўрэяў з-за мяжы кіраўніцтву арганізацыі ўдалося атрымаць памяшканне і стварыць Полацкі яўрэйскі культурны цэнтр, дабрачынны цэнтр “Хэсэд-Эфраім”, вакальна-інструментальны ансамбль, нядзельную школу, абшчынны цэнтр, тры рэлігійныя абшчыны – хасідская, прагрэсіўнага юдаізму і артклуб ветэранаў, жаночы клуб, курсы па вывучэнні іўрыта і маладзёжны клуб Яўрэйскага Агенцтва "Сахнут", сямейны клуб і многае іншае.
І вось зараз, паводле рашэння беларускіх уладаў, Цэнтр спыніў сваё існаванне. І хутчэй за ўсё, разам з ліквідацыяй ПЯКЦ, ягоны лёс падзеляць усе астатнія габрэйскія арганізацыі Полацкага рэгіёну.

**01.08.2022**



Наваполацкага актывіста **Андрэя Галавырына** асудзілі чацвёрты раз запар на 15 сутак. У Наваполацкім ЦІПе ён знаходзіцца з 15 чэрвеня.Паводле апошняй пастановы суддзі Зінаіды Балаболавай, ягоны арышт мае расцягнуцца на 2 месяцы – да 14 жніўня. У гарадскім судзе Наваполацку яго чацвёрты раз прызналі вінаватым паводле арт. 19.11 КаАП – за рэпост з «экстрэмісцкага» канала. Праваабаронцам стала вядома, што два ранейшыя арышты актывісту былі прысуджаныя нават не за рэпосты, а толькі за падпіску на «экстрэмісцкія» інфармацыйныя рэсурсы.
Яшчэ адзін з ранейшых арыштаў Андрэю Галавырыну прысудзілі за нібыта несанкцыянаванае пікетаванне (ч.1 арт. 24.23 КаАП) – за жоўта-блакітны сцяг на аватарцы ў сацыяльных сетках. Паводле сваякоў, у Наваполацкім ЦІПе актывіст перанёс гіпертанічны крыз, але гэта не паўплывала ні рашэнні суддзі Зінаіды Балаболавай, якая чатыры разы запар судзіла Галавырына.

**03.08.2022**

Працягваюцца рэпрэсіі ў дачыненні да жыхароў Віцебскай вобласці, якія актыўна выказвалі сваю пазіцыю пад час пратэстаў 2020-2021 гадоў. Асабліва цяжка даводзіцца тым грамадзянскім актывістам, якія знаходзяцца ў месцах адбыцця пакарання.
Палітвязня Яўгена Харашкевіча за тыдзень да дня народзінаў у калоніі змясцілі ў ШІЗА.
Палітвязень **Яўген Харашкевіч** перастаў выходзіць на сувязь са сваякамі, да яго не пусцілі адваката.

Па папярэдняй інфармацыі, Яўгена змясцілі ў штрафны ізалятар, але тэрмін і прычыны невядомыя.
8 жніўня Харашкевіч адзначыць 28-годдзе за кратамі, але, меркавана, у ШІЗА. Ягоная жонка прапаноўвае дасылаць віншаванні на тэлеграм-акаўнт @pozdravlenie_khoroshkevich, каб яна змагла перадаць мужу ўсе віншаванні.
Палітвязня Андрэя Новікава амаль да дня вызвалення змясцілі ў ПКТ
Стала вядома, што палітвязня Андрэя Новікава, у якогда сканчваецца тэрмін зняволення 29 кастрычніка, змясцілі ў памяшканне камернага тыпу (ПКТ) да 13 кастрычніка. Перад гэтым палітвязня ў калоніі чатыры месяцы ўтрымлівалі ў адзіночнай камеры, а ў сакавіку Андрэя закідвалі ў карцар на 39 дзён. Лісты да Андрэя не даходзяць, нават заказныя.

**03.08.2022**



Палітвязня **Паўла Вінаградава** перавялі ў аршанскую калонію, дзе ўтрымліваюць хворых на сухоты. Жыхар пасёлка Беразіно Менскай вобласці, блогер і актывіст Павел Вінаградаў быў асуджаны да 5-ці гадоў пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму. На пачатку ліпеня 2022 г.яго этапавалі ў ваўкавыскую ПК № 11, але неўзабаве ў палітвязня на рэнтгене знайшлі пляму ў лёгкіх. Ён прайшоў курс антыбіётыкаў, але гэта не прынесла плёну. 28 ліпеня 2022 г. Вінаградава перавялі ў аршанскую калонію № 12, так званую «сухотную». Паводле інфармацыі ад тых, каго там утрымлівалі, умовы ў гэтай калоніі небяспечныя для здароўя.
ПК 12 афіцыйна называецца калоніяй «для ўтрымання і лекавання асуджаных, хворых на актыўную форму сухотаў».
Некалькі гадоў таму па незалежных СМІ прайшла інфармацыя пра антысанітарныя ўмовы ў ПК 12 – пра адсутнасць рамонту, перавышэнне дапушчальнай колькасці хворых у палатах. Цяпер, як сцвярджае адміністрацыя, гэтыя недахопы выпраўленыя.
Вінаградаў адбывае тэрмін пакарання паводле адразу некалькіх крымінальных артыкулаў: арт. 342 («Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, што груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх»), арт. 130 («Распальванне варожасці ці варажнечы»), арт. 367 («Паклёп у дачыненні да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь»).

**03.08.2022**

У Віцебскім абласным судзе да 4,5 гадоў пазбаўлення волі ва ўмовах узмоцненага рэжыму асудзілі віцябляніна **Паўла Нікіценку**. У закрытым працэсе суддзя Яўген Буруноў разбіраў справу 35-гадовага супрацоўніка разліковага цэнтру, абвінавачанага адразу па 6-ці артыкулах Крымінальнага кодэксу: ч. 3 арт. 203-1 (парушэнне таямніцы перапіскі, тэлефонных перамоваў, тэлеграфных ці іншых паведамленняў), ч. 3 арт. 293 (навучанне і іншая падрыхтоўка асобаў для ўдзелу ў масавых беспарадках), арт. 342 (актыўны ўдзел у дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак), ч. 1 арт. 361-1 (кіраўніцтва экстрэмісцкім фарміраваннем), арт. 368 (абраза Лукашэнкі) і арт. 369 (абраза прадстаўніка ўлады).
Павел Нікіценка – выпускнік віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага каледжу, скончыў аддзяленне «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі», завочна навучаўся ў віцебскім тэхналагічным універсітэце і працаваў праграмістам. З 2017г. ягоным месцам працы быў абласны разлікова-даведачны цэнтр.
Згодна з матэрыяламі справы, Нікіценка ў перыяд з ліпеня 2020 г. па 15 лістапада 2021 г. незаконна сабраў і распаўсюдзіў інфармацыю аб прыватным жыцці і персанальных дадзеных службовых асоб дзяржаўных органаў, членаў іх сем’яў, іншых грамадзян – усяго скапіяваў з інфармацыйнай сістэмы дадзеныя амаль 1,5 мільёна грамадзян Беларусі. Таксама ён з’яўляўся адміністратарам дэструктыўнага Telegram-канала і размяшчаў заклікі і ўказанні, што да групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, інструкцыі па здзяйсненні супрацьпраўных дзеянняў у дачыненні да супрацоўнікаў праваахоўных органаў. А таксама публікаваў абразы на адрас Лукашэнкі і старшыні Цэнтральнай выбарчай камісіі.

**04.08.2022**

Супраць затрыманага прадпрымальніка, які прыехаў з Польшчы, распачалі крымінальную справу. **Барыс Элькін**, затрыманы 1-га жніўня жыхар Віцебску, падаў скаргу на супроць праўныя дзеянні – ён лічыць, што яго затрымалі незаконна. Скаргу разбіраў асабіста старшыня Першамайскага райсуду Андрэй Андрушэнка, і разбор адбываўся на закрытым пасяджэнні. Праваабаронцы мяркуюць, што акалічнасці справы, распачатай супраць Барыса Элькіна, таксама будуць максімальна засакрэчаны, і не выключаюць, што яе распачалі паводле «пратэстнага» артыкула 293 (ч.1) Крымінальнага Кодэксу – «арганізацыя масавых беспарадкаў».

Ураджэнец Віцебску Барыс Элькін ужо шмат гадоў жыве за межамі Беларусі, апошнія некалькі гадоў – у Польшчы. Там ён мае будаўнічы бізнес і з’яўляецца адным з сузаснавальнікаў кампаніі Bel.Pol.Bud.spzoo, якая наймае на працу беларусаў і дапамагае ўкраінскім уцекачам. Час ад часу прадпрымальнік прыязджае на Радзіму, дзе ў яго засталіся сваякі. Падчас апошняга прыезду яго затрымалі, калі ён выходзіў з аўтамабіля каля ўласнага дому. У Барыса Элькіна правяліператрус, забралі аргтэхніку. Прадпрымальніка трымаюць пад вартай, не гледзячы на праблемы са здароўем.

У родным горадзе Элькіна ведаюць як прыхільніка дэмакратычных пераменаў. Калі ў 2004-м годзе ў віцебскія прадпрымальнікі распачалі галадоўку супраць створаных мясцовымі ўладамі перашкодаў для гандлю, Барыс Элькін быў адным з яе арганізатараў.

**04.08.2022**

З ініцыятывы Галоўнага ўпраўлення юстыцыі Віцебскага аблвыканкама Віцебскі абласны суд 21 чэрвеня прыняў рашэнне ліквідаваць грамадскае аб'яднанне "Віцебскае музычнае таварыства". Раней улады ліквідаваны грамадскія арганізацыі культурна-асветніцкай накіраванасці: цэнтр урбаністычных праектаў і ініцыятыў «Прастора», сацыяльна-культурная ўстанова "Віцебск для мяне", сацыяльна-асветніцкая ўстанова ў галіне гісторыка-культурнай спадчыны «Уновіс-ФОРУМ», прыватная культурна-асветніцкая ўстановы «Лідар новай эпохі» і «Гендарны адказ».

Гэтая грамадская арганізацыя праіснавала ў якасці юрыдычнай асобы больш за 27 гадоў і, па сутнасці, была адным са старэйшых недзяржаўных грамадзянскіх аб'яднанняў. Сярод заснавальнікаў і сяброў арганізацыі былі музыкі Віцебскай абласной філармоніі і многія выкладчыкі музычных навучальных Віцебску.

На рахунку ВМТ лічыцца мноства праведзеных музычных конкурсаў, фестываляў і рэалізаваныя разнастайныя арт-праекты.

Так, у маі 2013 года "Віцебскае музычнае таварыства" сумесна з Віцебскім гарадскім выканаўчым камітэтам, арганізавалі і правялі Другі міжнародны этнафестываль "Мастацтва галасавой імправізацыі "ФАНТОН" - 2013", у якім прынялі ўдзел музычныя калектывы з Балгарыі, Беларусі і Расіі, а таксама вучоныя, музыказнаўцы і аматары этнічнай музыкі.

Не выклікае сумневу, ліквідацыі "Віцебскага музычнага таварыства" прывядзе да заняпаду музычнага фестывальнага руху ў Віцебскім рэгіёне, і да збяднення яго культурнай прасторы.

**05.08.2022**





На фестывалі Viva Braslav 2 жніўня работнікамі міліцыі быў затрыманы жыхар беларускай сталіцы **Міхаіл Тарлоўскі**. Яго затрымалі "за дэманстрацыю экстрэмісцкай сімволікі". Галоўнае ўпраўленне па супрацьдзеянні экстрэмізму (Цэнтр "Э") лічыць Тарлоўскага анархістам.

Затрыманы, знаходзіўся на фестывалі без майкі, таму былі бачныя яго татуіроўкі, сімвал анархізму - літара "А" ў крузе (літары "О"), герб "Пагоня" і сцяг "БЧБ".

У мясцовым райаддзеле міліцыі на Тарлоўскага быў складзены пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні па арт. 19.11 Кодэкса аб адміністрацыйнай адказнасці.

У адпаведнасці з санкцыяй указанага артыкула на фізічную асобу могуць накладацца: штраф у памеры ад дзесяці да трыццаці базавых велічынь, грамадскія працы, або адміністрацыйны арышт да 15 сутак, пры гэтым з абавязковай канфіскацыяй прадмета гэтага адміністрацыйнага правапарушэння.

**09.08.2022**

Больш за тыдзень таму адміністрацыя шклоўскай папраўчай калоніі № 17 "закінула" ў штрафны ізалятар на трое сутак палітвязня **Яўгена Харашкевіча**. Жонка палітвязня даведалася, што прычынай стаў ліст з віншаваннямі ад неабыякавых людзей перад днём нараджэння Яўгена, які яна дасылала мужу. Цэнзар разглядзеў у гэтым "палітычны падтэкст", таму ліст быў знішчаны, а палітвязня адправілі ў ШІЗА.

Таму дасылайць Яўгену трэба заказныя лісты, бо калі цэнзар палічыць тэкст не дапушчальным і не прапусціць яго, то палітвязень усё роўна пабачыць ад каго была вестачка.

Тут адрас, які актуальны для карэспандэнцыі: ПК №17, 213004, г. Шклоў, вул. 1-я Заводская, 8, Яўгену Аляксандравічу Харашкевічу.

Нагадаем, Яўгена затрымалі 18 студзеня 2021 у Наваполацку. Яго абвінавацілі адразу па трох артыкулах Крымінальнага кодэксу. Суд над Харашкевічам праходзіў у закрытым рэжыме. Віцебскі абласны суд 16 верасня асудзіў палітвязня да 4 гадоў калоніі.

**09.08.2022**

**Яну Пінчук** этапавалі з Санкт-Пецярбургу ў Беларусь. Ёй пагражае да 20 гадоў зняволення.

Інфармацыю пра тое, што яе падабаронная пакінула Расею пацвердзіла адвакат дзяўчыны Марыя Бяляева. Але канкрэтнае месца знаходжання Яны Пінчук пакуль не вядомае. У Беларусі віцяблянку абвінавачваюць па пяці крыминальных артыкулах: паклёп (артыкул 188 КК), незаконныя дзеянні з персанальнымі данымі іншай асобы (частка 3 часткі 203-1 КК), распальванне сацыяльнай варожасці (частка 3 артыкула 130 КК), стварэнне і кіраўніцтва экстрэмісцкім фармаваннем (частка 1 і 2 артыкула 361-1 КК), заклікі да дзеянняў супраць нацыянальнай бяспекі (частка 3 артыкула 361 КК).

Да 2018 г. дзяўчына жыла ў Беларусі, потым пераехала з Расею. Яе затрымалі ў Санкт-Пецярбургу ў лістападзе 2021 года на запыт беларускіх уладаў. Яне Пінчук пагражае пакаранне па справе аб адміністраванні 3-х тэлеграм-чатаў, прызнаных у Беларусі «экстрэмісцкімі».

**09.08.2022**



Пробашча лынтупскага касцёлу Святога Апостала Андрэя асудзілі да 17 сутак арышту. Ён быў асуджаны за парушэнне заканадаўства пра масавыя мерапрыемствы (арт. 24.23 КаАП).

Гэта ўжо другі арышт святара з Лынтупаў цягам гэтага году. 4 красавіка суд Пастаўскага раёну прысудзіў **Аляксандру Барану** 10 сутак арышту. Ксяндза прызналі вінаватым паводле двух адміністрацыйных артыкулаў – арт. 24.23 (несанкцыянаванае пікетаванне) – за бел-чырвона-белы сцяг на аватарцы ў сацыяльных сетках, і арт. 19.11 (распаўсюд «экстрэмісцкіх матэрыялаў) – за «лайкі» і каментары на інтэрнэт-рэсурсах, абвешчаных «экстрэмісцкімі». У адпаведнасці з судовай пастановай, Аляксандр Баран меўся выйсці на волю 8 красавіка – з улікам тэрміну, праведзенага пад вартай з моманту затрымання да да суду. Але ўвечары 6-га красавіка ён апынуўся на волі. Яго вызвалілі датэрмінова, не патлумачыўшы прычынаў.

**11.08.2022**

У рамках крымінальнай справы міліцыя затрымалі жонку палітвязня Міхаіла Чамуракі. Двое супрацоўнікаў міліцыі завіталі да жанчыны дамоў у першай палове дня і правяліператрус. Паведамілі, што ў межах крымінальнай справы, аднак — не сказалі якой.

**Людміла Чамурака**, якая мае анкалагічнае захворванне, некалькі разоў затрымлівалася разам з мужам, была адміністрацыйна пакараная. Раней улады пагражалі забраць у сям'і дзяцей.

Міхаіл Чамурака — актывіст з Дуброўна, асуджаны на тры гады абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу («хімія») па крымінальнай справе аб паклёпе (арт. 188 КК).

26 лістапада 2021 палітзняволены, які адбываў пакаранне ў ваўкавыскай папраўчай установе №29, здолеў уцячы з Беларусі. Цяпер Міхаіл Чамурака знаходзіцца за мяжой і ў бяспецы.

Нагадаем, што 4 траўня 2018 года ў кватэры Дубровенскага актывіста Аб'яднанай грамадзянскай

партыі Міхаіла Чамуракі прайшоўператрус, канфіскаваны ноўтбук і сыстэмны блёк кампутара. Аднačасова другая брыгада, якая складалася з двух мясцовых супрацоўнікаў і аднаго зь Віцебску ў цывільным, апісала маёмасьць у дома, дзе пражывае маці актывіста.
Тады, Міхаілу быў прад'ялены дакумэнт, зь якога вынікала, што ператрус праводзіцца ў сувязі з вядзеньнем крымінальна-працэсуальных дзеяньняў паводле арт. 188, ч. 2 і арт. 369 КК РБ. Сілавікі сказалі, што ладзіцца праверка заявы дубровенскага пракурора Пацеева пра абразу яго Міхаілам Чамуракам ў сетцы «Аднаклясьнікі».

**12.08.2022**

У наваполацкай калоніі №1 ціснуць на палітвязня **Дзмітрыя Кубарава**. 26-гадовага мінчука Дзмітрыя Кубарава з 5 жніўня змясілі ў памяшканне камернага тыпу на шэсць месяцаў. У наваполацкай ПК №1 ён адбывае пакаранне, прысуджанае паводле ч. 1 арт. 293 Крымінальнага кодэксу (Арганізацыя масавых беспарадкаў) і арт. 295-3 Крымінальнага кодэксу (Незаконныя дзеянні ў дачыненні да прадметаў, дзеянне якіх заснавана на выкарыстанні гаручых рэчываў). Хлопец асуджаны да 8-мі гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму. Прычым яго судзілі па «палітычных» справах двойчы.
Паводле матэрыялаў следства, з 9 па 11 жніўня 2020г. Дзмітрый Кубараў заклікаў людзей у інтэрнэце і афлайн да актыўнага ўдзелу ў масавых беспарадках. А таксама сам арганізоўваў масавыя беспарадкі і ўдзельнічаў у іх – «кідаў дошкі, палкі, піратэхнічныя вырабы, распыляў слезацечны газ, будаваў барыкады» і г.д. Акрамя таго, ён «меў намеры вырабіць «кактэйль Молатава».

**14.08.2022**

**Мікалая Статкевіча** на паўгода змясцілі ў адзіночную камеру. Вядомы апазіцыйны палітык, палітвязень Мікалай Статкевіч асуджаны да 14-ці гадоў зняволення ў калоніі асаблівага рэжыму паводле ч. 1 арт. 293 Крымінальнага кодэксу (Арганізацыя масавых беспарадкаў) з 24 чэрвеня знаходзіцца ў глыбоцкай ПК-13, на паўгода змешчаны ў якасці пакарання ў адзіночную камеру.
Варта зазначыць, што адразу ж па прыбыцці ў Глыбоцкую калонію, вядомую жорсткімі норавамі ўтрыманцаў і суворым стаўленнем адміністрацыі, Статкевіч сам напісаў заяву пра жаданне знаходзіцца ў адзіночнай камеры. Свой намер ён абгрунтаваў там, што адчувае асабістую небяспеку з сувязі з пагрозамі ад адміністрацыі і супрацоўнікаў. Але просьбу палітвязня не задаволілі. І ў адзіночную камеру ён трапіў толькі ў якасці пакарання. Апроч гэтага, 5-га ліпеня зняволенаму палітыку абвясцілі вымову, 6-га ліпеня ён быў пазбаўлены перадачы (адзінай на год згодна з рэжымам), 7-га ліпеня Статкевіч быў адпраўлены ў ШІЗО на восем сутак, 12-га ліпеня – пазбаўлены спаткання.

**15.08.2022**



28-гадовага жыхара Віцебску абвінавацілі адразу па чатырох артыкулах Крымінальнага кодэкса: арт. 368 (абраза Лукашэнкі), арт. 369 (прадстаўнікоў улады), ч. 3 арт. 361-1 (стварэнне экстрэмісцкага фарміравання альбо ўдзел у іх), ч. 1 арт. 130 (распальванне іншай сацыяльнай варожасці). Судовы працэс над ім праходзіў у Віцебскім абласным судзе ў закрытым рэжыме. Аднак вядома, што напярэдадні прадстаўнік пракуратуры прасіў пакараць **Мікіту Паляонка** чатырма з паловай гадамі пазбаўлення волі.
Суддзя Віцебскага абласнога суду Яўген Буруноў пастанавіў, што Паляонка варта пакараць 4-ма гадамі знаходжання ў калоніі -- па сукупнасці пакаранняў паводле чатырох артыкулаў:
па ч. 1 арт. 130 КК — тры гады калоніі; па арт. 368 КК — паўтара года калоніі; па арт. 369 КК — два гады "хіміі"; па ч. 3 арт. 361-1 КК — тры гады калоніі.
На момант вынясення прысуду Мікіта Паляноак ужо 7 месяцаў знаходзіцца ў Віцебскім СІЗА – яго затрымалі 16 студзеня гэтага году. Паводле версіі абвінавачвання, з сакавіка 2021 году па студзень 2022 году 28-гадовы жыхар Віцебску, "з'яўляючыся актыўным падпісчыкам экстрэмісцкіх Telegram-каналаў, заклікаў да гвалту ў дачыненні да праваахоўнікаў, абражаў міліцыянта і прэзідэнта". СК не называе, удзел у якім канкрэтна "экстрэмісцкім фарміраванні" ставіцца ў віну палітвязню.

**16.08.2022**

Пасля 60 сутак за кратамі на волю не выйшаў наваполацкі актывіст **Андрэй Галавырын** — на яго склалі новы пратакол. 16 жніўня над ім адбыўся чарговы суд і суддзя суда горада Наваполацка Зінаіда Балаболава пакарала яго 15-сутачным арыштам.
Андрэя затрымалі 15 чэрвеня і змясцілі ў Наваполацкі Цэнтр ізаляцыі правапарушальнікаў. Пасля гэтага над ім прайшлі чатыры суды за падпіску і рэпосты з «экстрэмісцкіх» каналаў (арт. 19.11 КоАП) і кожны раз суддзя Балаболава арыштоўвала актывіста на 15 сутак. Агулам Андрэя будуць утрымліваць за кратамі мінімум 75 сутак.
Яшчэ падчас першага арышту мужчына перанёс гіпертанічны крыз, але гэтая акаличнасць не спыніла сэрыю адміністратыўных адміністратыўных арыштаў.

**16.08.2022**

У судзе Ленінскага раёна Магілёва 15 жніўня быў вынесены прысуд **Алегу Яфрэменку**, якога абвінавацілі па ч. 1 арт. 411 Крымінальнага кодэкса (злоснае непадпарадкаванне патрабаванням адміністрацыі папраўчай установы). Суддзя Вікторыя Палякова асудзіла Алега да яшчэ аднаго года зняволення. Раней палітвязню ўжо ўзмацнялі рэжым — у верасні 2021 года з калоніі, дзе ён адбываў тэрмін за падсечку міліцыянту, Алега перавялі на турэмны рэжым у Магілёў. Вядома, што адміністрацыя магілёўскай турмы рэгулярна змяшчала палітвязня ў ШІЗА.
Алег Яфрэменка — жыхар Віцебска, якога ўжо 23 месяца ўтрымліваюць за кратамі. 9 снежня 2020 года яго асудзілі па артыкуле аб гвалце да супрацоўніка МУС (арт. 364 КК). Яго абвінавацілі ў тым, што ён зрабіў падсечку міліцыянту падчас вулічнага шэсця 13 верасня 2020 года — той упаў і падрапаў далоні. Суд прызначыў Алегу 4,5 гадоў калоніі. Адбываць тэрмін яго накіравалі ў магілёўскую калонію № 15. Але праз некалькі месяцаў яму ўзмацнілі пакаранне і перавялі на турэмны рэжым.
Ініцыятарам узбуджэння новай крымінальнай справы стала адміністрацыя магілёўскай турмы № 4. Там Алега рэгулярна змяшчалі ў ШІЗА па надуманых прычынах.
Справу Яфрэменкі ў судзе Ленінскага раёна Магілёва пачалі разглядаць яшчэ 26 ліпеня. Спачатку палітвязня абвінавачвалі па ч. 2 арт. 411 Крымінальнага кодэкса, але падчас суда яму перакваліфікавалі частку на першую — яна прадугледжвае больш мяккае пакаранне.
Суддзя Вікторыя Палякова 15 жніўня прысудзіла Алегу ў дадатак да чатырох з паловай гадоў калоніі яшчэ год у зняволенні.

**18.08.2022**



Пяць гадоў пазбаўлення волі прысудзілі жыхару аграгарадка Друя Браслаўскага раёна. Такое пакаранне прызначыла суддзя Віцебскі абласны суд Галіна Бондал 10 жніўня 38-гадоваму **Роберту Кузняцову**. Яго абвінавацілі паводле чатырох артыкулаў Крымінальнага кодэкса: ч. 1 арт. 368 (абраза прэзідэнта Рэспублікі Беларусь), ч. 1 арт. 130 (распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай альбо іншай сацыяльнай варожасці або варажнечы), ч. 3 арт. 361 (заклікі да мер абмежавальнага характару (санкцый), іншым дзеянням, накіраваным на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь), арт. 370 (здзек з дзяржаўных сімвалаў).
Падчас судовага следства было ўстаноўлена, што абвінавачаны Кузняцоў у жніўні 2021 года размясціў у сетцы Інтэрнэт каментары і графічныя матэрыялы, якія змяшчаюць заклікі да ўзбуджэння сацыяльнай варожасці і варажнечы, захопу дзяржаўнай улады, гвалтоўнай змены канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь, а таксама абразы ў адрас кіраўнікоў Беларусі і Расеі.
У лістападзе 2021 года ён размясціў у сетцы Інтэрнэт абразлівыя фотавыявы дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь і каментары да яго.
З улікам прадстаўленых дзяржаўным абвінаваўцам доказаў Віцебскі абласны суд прызнаў жыхара Браслаўскага раёна вінаватым у здзяйсненні вышэйзгаданых дзеянняў і па сукупнасці злачынстваў яму прызначана пакаранне ў выглядзе пяці гадоў пазбаўлення волі з адбываннем у папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму.

**22.08.2022**

Камітэт разгледзеў зварот віцебскага палітычнага актывіста **Андрэя Андрэева**, зарэгістраваны ў 2016 годзе пад нумарам № 2863/2016 і вырашыў, што з боку дзяржавы, Рэспубліка Беларусь, мела месца парушэнне яго права на распаўсюд інфармацыі "левай" арыентацыі.
З'яўляючыся сябрам Беларускай партыі левых «Справядлівы свет» Андрэй Андрэеў, 13 жніўня 2013 года распаўсюджваў партыйныя ўлёткі ў шматкватэрным доме ў Віцебску. У той жа дзень ён быў затрыманы супрацоўнікамі міліцыі ў сувязі са здзяйсненнем правапарушэння, прадугледжанага ч. 2 арт. 22.9 КаАП (парушэнне парадку, устаноўленага заканадаўствам аб сродках масавай інфармацыі).
5 верасня суд Кастрычніцкага раёна Віцебска прызнаў аўтара вінаватым у незаконным распаўсюджванні агітацыйных матэрыялаў палітычнага характару ў замежных СМІ ў адпаведнасці з артыкулам 22.9(2) Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях і аштрафаваў яго на суму 2 000 000 рублёў. На думку суда, замежная друкарня павінна была атрымаць папярэдні дазвол Міністэрства інфармацыі; аднак у аўтара не было такога дазволу.
Камітэт зазначыў, што беларуская дзяржава не прывяла якіх-небудзь канкрэтных падстаў у падтрымку неабходнасці абмежаванняў, накладзеных на аўтара ў адпаведнасці з патрабаваннямі пункта 3 артыкула 19 Пакта. Яно таксама не прадэманстравала, што абраныя меры былі найменш дакучлівымі па сваім характары або суразмернымі інтарэсам, якія яно імкнулася абараніць.
Камітэт палічыў, што ў абставінах справы Андрэева абмежаванні, накладзеныя на аўтара, хаця і грунтаваліся на нацыянальным заканадаўстве, не былі апраўданы ўмовамі, выкладзенымі ў артыкуле 19(3) Пакта. Таму ён прыходзіць да высновы, што правы аўтара па артыкуле 19(2) Пакта былі парушаныя.
Такім чынам Камітэт, дзейнічаючы ў адпаведнасці з артыкулам 5 (4) Факультатыўнага пратакола, палічыў, што прадстаўленыя яму факты сведчаць аб парушэнні беларускімі ўладамі правоў Андрэева згодна з артыкулам 19 (2) Пакта.

**23.08.2022**



**Сяргея Серабро** выклікалі ў ГУБАЗіК наконт падзеяў 2020-га году. З рэдактара і заснавальніка «Нар одных навінаў Віцебску» узялі тлумачэнні, як ён асабіста асвятляў мірныя шэсці пасля мінулых прэзідэнцкіх выбараў, і што на гэтую тэму публікавалася на ягоным сайце.
Спадару Сяргею не паведамілі, ці ёсць у яго нейкі юрыдычны статус, але пад запіс распыталі наконт таго, як праходзілі мірныя пратэсты – ці заўважыў ён нейкія парушэнні з боку пратэстоўцаў. Ён патлумачыў, што выконваў звыклую журналісцкую працу: асвятляў навакольныя падзеі, імкнуўся не змешвацца з натоўпам, назіраць за ўсім збоку і быць аб’ектыўным падчас напісання матэрыялаў.
Следчых цікавіла, ці не быў журналіст прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці паводле тагачасных падзеяў. Сяргея Серабро двойчы затрымлівалі супрацоўнікі аддзелу міліцыі Першамайскага раёну, але размовы ў пастарунку сканчаліся толькі папярэджаннем пра недапушчальнасць парушэння заканадаўства аб масавых мерапрыемствах.
Гутарка з супрацоўнікамі ГУБАЗіК працягвалася каля гадзіны. Напрыканцы паўжартам зазначылі, «што «ННВ» малавата ўдзяляюць увагі праблемам злачыннасці, – так напісаў Сяргей Серабро на сваёй Старонцы ў Фэйсбуку. Але, на думку рэдактара сайта, крымінальнай хронікі там надаецца ці не найбольш увагі ў параўнанні з іншымі рэгіянальнымі СМІ.

**25.08.2022**

Суддзя Кастрычніцкага райсуду Уладзімір Царыкаў прызнаў яе вінаватай паводле ч. 1 арт. 24.23 КаАП – за незаконнае пікетаванне шляхам размяшчэння малюнка на фотаздымку ў Фэйсбуку. На малюнку – так званай «рамцы», з ліку прапанаваных сістэмай для ўпрыгожвання фотавыява – былі тры паласы белага і чырвонага колеру і цытата з верша Янкі Купалы «Хочам людзьмі звацца». Суд падтрымаў меркаванне складальнікаў адміністрацыйнага пратаколу пра тое, што такім чынам віцебская журналістка публічна выказвала свае грамадска-палітычныя меркаванні. Таццяну Матвееву ўзялі пад варту адразу па сканчэнні судовага разбіральніцтва.

Працэс над **Таццянай Матвеевай** распачаўся яшчэ 9-га жніўня, але тым разам суддзя Царыкаў заўважыў памылкі і неадпаведнасці ў дакументах адміністрацыйнай справы і накіраваў яе на выпраўленне ў Кастрычніцкі РАУС. Міліцыянт Уладзіслаў Шышкавец паўторна склаў пратакол пра правапарушэнне, дзе значылася, што журналістка зладзіла незаконнае пікетаванне, калі размясціла ў Фэйсбуку фота з малюнкам у белым і чырвоным колерах.
Выслухаўшы падсудную і сведак з ейнага боку, Уладзімір Царыкаў пастанавіў, што дзеянні Таццяны Матвеевай усё ж падпадаюць пад азначэнне несанкцыянаванага пікету, і пакараў яе арыштам на 8 сутак. Паколькі трое сутак за кратамі яна ўжо адбыла пасля затрымання 28-га ліпеня – у той дзень на журналістку і быў складзены пратакол па ч. 1 арт. 24.23 КаАП – ёй належыць адбыць у віцебскім ІЧУ яшчэ 5 сутак арышту.

**26.08.2022**



Рашэннем Віцебскага абласнога суда ўлады ліквідавалі фонд "За адраджэнне", які быў зарэгістраваны ў 2020 годзе мясцовай жыхаркай **Наталляй Астроўскай**. 25 ліпеня Вярхоўны суд разгледзеўшы ў апеляцыйным парадку скаргу фонду рашэнне абласнога суда пакінуў без змены. Пасля гэтага арганізацыя страціла статус юрыдычнай асобы.
Фонд "За адраджэнне" праіснаваў крыху больш за два гады, застанецца ў памяці ў жыхароў Дзісны добрыя ўспаміны. Сапраўды за час сваёй працы і кіраўніца фонду і валанцёры здолелі шмат зрабіць для паляпшэння сацыяльнага жыцця, экалогіі і навакольнага асяроддзя, а таксама садзейнічалі адраджэнню культурных традыцый.

**28.08.2022**

Цяжка хворы палітзняволены **Павел Вінаградаў** схуднеў амаль на 40 кілаграмаў. ядаўна ў палітзняволенага блогера і актывіста выявілі сухоты. Раней была інфармацыя, што Вінаградава пазбавілі працяглага спаткання за сон у дзённы час. Напрыканцы ліпеня яго перавялі ў аршанскую папраўчую калонію № 12, вядомую тым, што там утрымліваюцца і лечацца асуджаныя, хворыя на актыўную форму сухотаў. Ёсць звесткі аб тым, што ў ПК-12 з боку адміністрацыі ў дачыненні да зняволеных практыкуюцца здзекі, у "зоне" для хворых ежа і санітарныя ўмовы не адпавядае медыцынскім нормам, у турэмны магазін завозяцца тавары, цэны на якія ў разы перавышаюць іх кошты па-за калоніяй.

**31.08.2022**

Па рашэнні Віцебскага абласнога суда з 4 траўня грамадскае аб'яднанне Клуб амерыканскага футбола "Віцебскія Рысі" знаходзіцца ў стане ліквідацыі. Арганізацыя праіснавала без малога 6 гадоў і давала магчымасць легальна папулярызаваць, любімую многімі ў свеце, гульню. Ініцыятарам знішчэння клуба стала кіраўніцтва галоўнага ўпраўлення юстыцыі Віцебскага аблвыканкама. У апошнія два гады, ліквідацыя грамадскіх аб'яднанняў стала ўніверсальным і эфектыўным спосабам "развіцця" грамадзянскай супольнасці на Віцебшчыне.
У Віцебску ў 2013 годзе з'явілася каманда па амерыканскім футболе "Віцебскія рысі". Праз два годы каманда атрымала рэспубліканскае прызнанне выйграўшы кубак Вітаўта Вялікага (г. Мінск) і зацвердзіла свой статус моцнага спартыўнага клуба прыняўшы ўдзел у турнірах Балтыйскага дывізіёна Усходняй лігі амерыканскага футбола.
Заснавальнікам, ідэйным натхняльнікам і першапачатковым спонсарам каманды стаў вядомы ў Віцебску прадпрымальнік Кірыл Шведаў.
Без праблем, 27 верасня 2016 года, Галоўным упраўленнем юстыцыі Віцебскага аблвыканкама было зарэгістравана ГА КАФ "Віцебскія Рысі".
Заснавальнікі арганізацыі дэкларавалі яе мэты як развіццё і папулярызацыю амерыканскага футбола і сцяг-футбола ў Віцебску, нашай краіне і на міжнароднай арэне.

## Верасень 2022

**01.09.2022**



4,5 гадоў калоніі прысудзілі **Аляксею Рэзнікаву** за пасты ў інтэрнэце. Віцябляніна прызналі вінаватым паводле арт. 130 (Распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай або іншай сацыяльнай варожасці або варожасці), арт. 368 (Абраза Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь), арт. 369 (Абраза прадстаўніка ўлады), арт. 370 (Здзек з дзяржаўных сімвалаў). Вырак Андрэю Рэзнікаву вынес суддзя Віцебскага абласнога суду Яўген Буруноў. Прыцэс працягваўся некалькі тыдняў і праходзіў у закрытым рэжыме.
Паводле следства, ураджэнец Віцебску размяшчаў абразлівыя пасты і каментары ў сацыяльнай сетцы "ВКонтакте". Працяглы час ён працаваў за мяжой, але вярнуўся ў Беларусь у сувязі з кваробай маці. Яго затрымалі больш як чатыры месяцы таму і змясцілі ў СІЗА-2. На трэці дзень пасля зняволення сына ягоная маці памерла. Больш блізкіх сваякоў у Аляксея Рэзнікава не засталося.

**01.09.2022**

Расейскія ўлады задаволілі запыт Генеральнай пракуратуры Беларусі аб выдачы 25 гадовай **Яны Пінчук** для прыцягнення да крымінальнай адказнасці. 1 верасня 2022 года маладая жанчына перададзена на тэрыторыю Беларусі і ўжо змешчаная ў Віцебскі абласны ізалятар №2. Крымінальная справа ў дачыненні да Яны Пінчук знаходзіцца ў вытворчасці Віцебскага гарадскога аддзела Следчага камітэта.
Пінчук знаходзіцца ў статусе абвінавачанай. Ёй інкрымінавана ўчыненне злачынстваў, прадугледжаных ч.3 арт.130 (наўмысныя дзеянні, накіраваныя на ўзбуджэнне іншай сацыяльнай варожасці і варожасці па прыкмеце іншай сацыяльнай прыналежнасці, учыненыя групай асоб) КК РБ; ч.3 арт.361 (публічныя заклікі да захопу дзяржаўнай улады, гвалтоўнай змены канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь, ажыццяўленню дзеянняў, накіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь, учыненыя з выкарыстаннем глабальнай камп'ютарнай сеткі Інтэрнэт) КК РБ; а таксама ч.1 і ч.2 арт.361-1 (стварэнне экстрэмісцкага фармавання, кіраўніцтва такім фармаваннем) КК РБ.

**02.09.2022**

Палітвязня **Андрэя Кузнечыка** этапавалі ў Наваполацкую калонію. Ураджэнец Віцебску, журналіст Радыё Свабода Андрэй Кузнечык, асуджаны да 6 гадоў пазбаўлення волі па справе аб экстрэмісцкім фармаванні, прыбыў адбываць пакаранне ў наваполацкай калоніі №1. Ліст са штэмпелем гэтай установы атрымала жонка палітзняволенага Алеся Рак. Суддзя Магілёўскага абласнога суду Ігар Шведаў прызнаў журналіста вінаватым паводле ч. 1 арт. 361-1 КК («Стварэнне экстрэмісцкага фармавання або ўдзел у ім»), і прызначыў пакаранне ў выглядзе зняволення ў калоніі ўзмоцненага рэжыму на тэрмін 6 гадоў.

**03.09.2022**

Суд Наваполацка вынес пастанову аштрафаваць **Ганну Тукаву** за антываенную акцыю. Суд прызнаў яе вінаватай і прымяніў да дзяўчыны арт. 24.23 (Парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў) Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях. Прычынай «мяккага», для цяперашняга часу, пакарання стала тое, што «парушальніца закону» мае малалетняга дзіцяці. Але пасля прысуду Ганна так і не выйшла на волю.
Магчыма, міліцыянты склалі на яе яшчэ адзін адміністратыўны пратакол па арт. 19.11 (Распаўсюджванне, выраб, захоўванне, перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або якая прапагандуе такую дзейнасць) КаАП РБ.
1 верасня падчас лінейкі ў гімназіі №1 Наваполацка, быў выступ людзей у вайсковай форме. Тукава на сярэдзіне выступу выйшла з антываеннай акцыяй — яна стала перад імі і паказала знак "Перамога". Спачатку да яе падыйшлі супрацоўнікі школы, а потым і міліцыянт, які павёў дзяўчыну ў АУС Наваполацку. Сыходзіла дзяўчына пад апладысменты людзей, якія прысутнічалі на школьным свяце.

**07.09.2022**

Палітвязня **Мікалая Статкевіча** ўжо больш за месяц не выводзяць на свежае паветра. Адсутнасць прагулак адміністрацыя глыбоцкай калоніі ПК 13 тлумачыць рамонтам ва ўнутраным двары. Таксама ён паведаміў, што яго перавялі ў іншую камеру – «адзіночку», якая «на сантыметраў 7 шырэйшая і гэтага хапіла, каб прасунуцца паўз тумбачку да сценкі, супрацьлеглай дзвярам».
Мікалай Статкевіч піша, як ён бавіць час: «Паступова павялічваю нагрузкі падчас заняткаў фізкультурай. Днём у мяне тры «прагулкі» па камеры па 30-40 хвілін і адна вечарам на 20-30 хвілін. Падчас дзённых «прагулак» раблю фізічныя практыкаванні. З-за памераў камеры прыйшлося ўводзіць практыкаванні з «гантэляй», у якасці якой скарыстоўваю ПЭТ-бутэльку 1,5 літра. Праўда, з-за невялікай вагі мушу цягаць гэтую «гантэлю» па разоў 800 за дзень. І з часам прыйдзецца гэтую колькасць яшчэ павялічваць».

**09.09.2022**



Віцяблянін **Сяргей Сясіцкі** прызнаны палітвязнем. Сёлета ў жніўні Сяргея Сясіцкага затрымалі за абразу А. Лукашэнкі паводле арт. 368 Крымінальнага Кодэксу. Санкцыі артыкула прадугледжваюць да 4 год пазбаўлення волі. Дома ў Сяргея, а таксама ў яго бацькоў прайшлі ператрусы. Незадоўга да затрымання пракуратура залічыла старонку Сясіцкага ў Facebook у пералік экстрэмісцкіх матэрыялаў. У Віцебску мужчына вядомы як даўні апанент так званага «русского мира».
У студзені 2017г. года Сясіцкі заклікаў не дапусціць у Віцебску канцэртаў выканаўцы турэмнага шансону Віктара Каліны, вядомага сваімі шавіністкімі выказваннямі пра беларусаў і беларускую мову, а таксама фатаграфаваннем са зброяй на тады занятых сепаратыстамі тэрыторыях Данецкай і Луганскай абласцей Украіны. Прыхільнікі «русского мира» спрабавалі скардзіцца на Сяргея ў Следчы камітэт Расейскай Фэдэрацыі – скаргу напісаў нібыта грамадзянін РФ Сяргей Іваноў. Але вынікаў гэта не мела, крымінальную справу супраць віцябляніна ў Расеі заводзіць не сталі.
Старонка Сяргея Сясіцкага ў Фэйсбуку некалькі разоў была заблакаваная па ініцыятыве тых, хто лічыў сябе абражаным за выказванні супраць «русского мира», а таксама за крытыку дзейных беларускіх уладаў.

**09.09.2022**

40-гадовую **Ганну Тукаву** затрымалі 1-га верасня падчас урачыстай лінейкі ў наваполацкай гімназіі. Яна прывяла ў школу сваю дачку і ўбачыла «паказальны выступ» падлеткаў у вайсковай форме, якія імітавалі баявыя дзеянні і расстрэл палонных. Жанчына выйшла ў цэнтр пляцоўку, паказваючы абедзвюма рукамі сімвалы «V», за што была затрымана міліцыяй.
72 гадзіны жыхарка Наваполацку мусіла правесці за кратамі, а 3 верасня Наваполацкі гарадскі суд вынес пастанову аштрафаваць яе за антываенную акцыю. Суддзя Зінаіда Балаболава прызнала Ганну Тукаву вінаватай за парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў (арт. 24.23 КаАП). На волю жанчына пакуль не выйшла: яе зноў затрымалі на 72 гадзіны, а 8 верасня асудзілі другі раз, цяпер паводле паводле арт. 19.11 КаАП за падпіску ў «ВКонтакте» на два «экстрэмісцкія» каналы. Суддзя Зінаіда Балаболава зноўку прысудзіла ёй штраф.
Паколькі пасля суду Ганна Тукава так і не выйшла з-за кратаў, праваабаронцы мяркуюць, што супраць яе распачалі ўжо трэцюю адміністрацыйную справу.

**10.09.2022**

У судзе Першамайскага раёну Віцебску прайшоў працэс над былым пробашчам парафіі Святога Духа **Андрэем Вашчуком**. Суддзя Андрэй Андрушэнка прызнаў ксяндза вінаватым паводле ч.1 артыкула 19.11 КаАП за распаўсюд забароненай сімволікі, і прысудзіў штраф памерам 10 базавых велічынь (320 рублёў). Падсудны на працэс не з’явіўся: тры тыдні таму ён пакінуў Беларусь.
Паводле міліцэйскага пратаколу, 21лютага 2021г. у адным з тэлеграм-чатаў Андрэй Вашчук размясціў карыкатуру з выявай свастыкі. Паводле высноваў супрацоўніка Першамайскага РАУС Прыстаўкі, такім чынам святар прапагандаваў нацысцкую сімволіку. За гэта супраць яго была распачатая адміністрацыйная справа, ужо трэцяя цягам апошніх трох месяцаў.

15 ліпеня ён быў затрыманы і абвінавачаны паводле арт. 23.34 за несанкцыянаванае пікетаванне. Прычынай стала аватарка ў Фэйсбуку з бел-чырвона-белым сцягам. Затрыманне праводзілі супрацоўнікі ГУБАЗіКу, яны ж правялі ператрус у касцельным памяшканні, дзе жыў ксёндз Андрэй. Праз тры дні над святаром адбыўся першы суд. Вашчук на судзе сказаў, што бел-чырвона-белы сцяг для яго – сімвал хрысціянства.
Акрамя гэтага, у матэрыялах справы было пазначана, што ў ягоным акаўнце ёсць і іншыя «пратэсныя» фота, у тым ліку і са сцягам Украіны. 17 ліпеня ксяндза Андрэя асудзілі на 15 сутак арышту, а 20 ліпеня, калі святар ужо знаходзіўся ў ІЧУ, над ім адбыўся другі суд. Гэтым разам па арт. 19.11 КаАП -- за тое, што ён з'яўляецца ўдзельнікам тэлеграм-чату, прызнанага ўладамі экстрэмісцкім. Андрэю Вашчуку прысудзілі яшчэ 15 сутак арышту і канфіскацыю тэлефона як прадмета, праз які было здзейснена правапарушэнне.
Паводле рашэння па апошняй адміністрацыйнай справе – за рэпост карыкатуры з выявай свастыкі -- суддзя Андрэй Андрушэнка пастанавіў не канфіскоўваць тэлефон ксяндза Андрэя. Найверагодней, таму, што ён ужо канфіскаваны. Увогуле ж, зрабіць гэта было б немагчыма: адбыўшы месяц у віцебскім ІЧУ і ўсвядоміўшы, што ціск на яго ўжо не спыніцца, Андрэй Вашчук быў вымушаны пакінуць Беларусь.

**11.09.2022**

Палітвязня **Андрэя Кузнечыка** міліцэйскія чыноўнікі залічылі ў "экстрэмісты". На сайце МУС, з'явіўся адноўлены пералік асобаў, якія маюць дачыненне да «экстрэмісцкай» дзейнасці. У спіс трапіў былы журналіст-фрылансер "Радыё Свабода" вязень наваполацкай калоніі № 1 Андрэй Кузнечык, які быў асуджаны да шасці гадоў калоніі за "стварэнне экстрэмісцкага фармавання або ўдзел у ім".
Андрэя затрымалі 25 лістапада 2021 года. У ягонай кватэры адбыўся ператрус. Пасля затрымання фрылансера сілавікі ненадоўга здолелі захапіць кантроль над тэлеграм-каналам "Радыё Свабода".
Разгляд ягонай справы адбыўся на пачатку чэрвеня у Магілёўскім абласным судзе. Журналіста абвінавачвалі паводле ч. 1 арт. 361-1 КК (Стварэнне экстрэмісцкага фармавання або ўдзел у ім).
Суддзя Ігар Шведаў прызнаў яго вінаватым і прызначыў пакаранне ў выглядзе зняволення ў калоніі ўзмоцненага рэжыму на тэрмін 6 гадоў. 1 верасня 2022 года Андрэя этапаваны з турмы № 4 у наваполацкую калонію № 1.

**12.09.2022**

Мастака з Новалукомлю асудзілі да 2,5 гадоў «хіміі». **Сцяпан Хадатовіч** прызнаны вінаватым паводле артыкула 341 Крымінальнага кодэксу ( апаганьванне збудаванняў і псаванне маёмасці). Суддзя Чашніцкага раённага суду Таццяна Заруба прызнала яго вінаватым і асудзіла на два гады абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу. Цяпер прысуд уступіў у законную сілу.
Паводле матэрыялаў крымінальнай справы, 23-гадовы Сцяпан Хадатовіч у сакавіку гэтага году «зрабіў экстрэмісцкія надпісы на трубаправодзе Лукомскай ДРЭС», а яшчэ праз два месяцы «нанёс на паверхню артылерыйскай прылады, усталяванай на тэрыторыі вайсковага пахавання ў вёсцы Старыя Лаўкі Чашніцкага раёну, выявы бел-чырвона-белага і сіне-жоўтага сцягоў».
Пасля таго, як у траўні хлопца затрымалі за малюнкі сцягоў на старой пушцы, на адным з праўладным тэлеграм-каналаў выйшла «пакаяльнае» відэа з удзелам Сцяпана Хадатовіча. Ягоныя дзеянні адсачылі праз відэакамеры.

**13.09.2022**

У палітвязня **Васіля Бераснева** істотна пагоршылася здароўе. шанскі актывіст незалежнага прафсаюзу РЭП находзіцца ў менскім СІЗА-1, яго затрымалі 19 красавіка 2022 г. па «справе прафсаюзаў». Пасля За паўгода за кратамі ў яго абвастрыліся праблемы з ныркамі ( адну нырку яму выдалілі ў 2018 г., другая цяпер баліць, але належнай дапамогі Васіль Бераснеў не атрымлівае – на шматлікія просьбы наконт медычнага абследавання яму прыходзяць толькі адмовы. Адзінае, што яму ставяць кропельніцы для абязбольвання, але гэта не з'яўляецца паўнавартасным лячэннем.

**13.09.2022**



Актывіст незалежнага прафсаюзу **Віктар Стукаў** мае адбыць 30 сутак арышту. Мужчыну затрымалі 12 верасня на полацкім вакзале, проста ў цягніку «Полацк-Масква», на якім ён выправіўся ў госці да сваякоў. На думку сяброў, сваю ролю адыграла тое, што квіток быў іменны, а полацкая міліцыя ўжо год шукала Віктара Стукава, каб накіраваць яго на 15 сутак арышту паводле судовага рашэння леташняй даўніны. На актывіста ў прысутнасці астатніх пасажыраў надзелі кайданкі і змясцілі пад варту. 13 верасня над ім адбыўся яшчэ адзін суд. Паводле апошняга судовага рашэння, Віктар Стукаў прызнаны вінаватым у несанкцыянаваным пікетаванні. У ягоных сацыяльных сетках знайшлі фотаздымкі з пратэстаў 2020 г. Суд вырашыў, што такім чынам Стукаў праводзіў у інтэрнэце несанкцыянаваную акцыю, і паводле артыкула 24.23 пакараў яго арыштам на 15 сутак.
У дадатак да гэтага тэрміну, Віктар Стукаў мае адбыць 15-суткавы арышт, прысуджаны яму яшчэ летась за парушэнне артыкула 19.11 КаАП. Тады актывіста асудзілі за рэпост артыкула з сайта вядомага тэлеканала, пазней прызнанага экстрэмісцкім. Аднак судовага рашэння Стукаў на рукі не атрымаў, дый міліцыя не надта шчыравала, каб адразу ж яго арыштаваць ды завезці ў ІЧУ. Цяпер ён мае адбыць у ізалятары 30 сутак арышту агулам.

**14.09.2022**

Суддзя Міхаіл Юрчанка суда Першамайскага раёна Віцебска вынес прысуд у дачыненні да **Яўгена Гукава**. Мужчына прызнаны вінаватым у абразе прэзідэнта (ч. 1 арт. 368 Крымінальнага кодэкса) і абразе прадстаўніка ўлады (арт. 369 Крымінальнага кодэкса) і прызначыў яму пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на адзін год і 10 месяцаў у калоніі агульнага рэжыму.
Яўген быў затрыманы 20 чэрвеня 2022 года і да суда змешчаны ў Віцебскі абласны следчый ізалятар №2.
Па матэрыялах следства, работнік прадпрыемства “Альянс-Пластык” Яўген Гукаў у перыяд часу з 20 кастрычніка па 20 лістапада 2020 года шматразова ў тэлеграм-чатах “Вуліца Гагарына” і “Віцебск-97” размяшчаў відэаролік выступу Аляксандра Лукашэнкі на канале “Пул Першага”, які суправаджаў абразлівымі і нецэнзурнымі каментарыямі, з выкарыстаннем ненарматыўнай формай маўленчага выказвання.
Таксама 28 кастрычніка на адным з тэлеграм-каналам абразіў былога міністра ўнутраных спраў Юрыя Караева.
Падчас допыту ў судзе Гукаў патлумачыў, што ў 2021 годзе быў двойчы прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці паводле арт. 19.11 КаАП, быў аштрафаваны, а летам 2021 года свой тэлефон наўмысна ўтапіў у Заходняй Дзвіне.

**15.09.2022**

Судовая калегія Віцебскага абласнога суда завяршыла разгляд крымінальнай справы **Анатоля Міхайлава**. 28-гадовы мужчына абвінавачваўся ў стварэнні экстрэмісцкага фарміравання (арт. 361-3), распальванні расавай, нацыянальнай, рэлігійнай альбо іншай сацыяльнай варожасці або варажнечы (арт. 130), абразе прэзідэнта (арт. 368) і абразе прадстаўнікоў улады (арт. 369 Крымінальнага кодэкса). Суд прызнаў Міхайлава вінаватым і па сукупнасці санкцый гэтых артыкулаў прызначыў яму пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін 4 гады і штрафа ў памеры 3,2 тысячы рублёў.
Працэс, які распачаўся 1 верасня, вяла старшыня судовай калегіі Галіна Бондал.
Паводле матэрыялаў абвінавачання, Міхайлаў, у перыяд з сакавіка 2021 года па студзень 2022 года ў сетцы Інтэрнэт размяшчаў каментары і графічныя матэрыялы з заклікамі да ўзбуджэння нацыянальнай і іншай сацыяльнай варожасці, а таксама абразы ў адрас кіраўніка дзяржавы і супрацоўніка органаў унутраных спраў.
Ён жа ў сакавіку 2022 года стаў удзельнікам дэструктыўных Telegram-канала і Telegram-чата.
Паводле звестак праўладных каналаў, прычынай затрымання стала рэгістрацыя ў “Плане "Перамога".
Паведамлялася, што Анатоль таксама запоўніў анкету, каб паехаць ваяваць ва Украіну.

**16.09.2022**






Віцебскім абласным судом вынесены прысуд палітзняволенаму Сяргею Канавалава па крымінальнай справе аб наўмысных дзеяннях, накіраваных на ўзбуджэнне нацыянальнай і іншай сацыяльнай варожасці, аб падрыхтоўцы да здзяйснення акта тэрарызму і наўмыснаму прывядзенню ў непрыдатны стан сродкаў сувязі. Судовы працэс у закрытым рэжыме вёў суддзя Яўген Буруноў.
**Сяргей Канавалаў** з’яўляўся супрацоўнікам Віцебскай дыстанцыі сігналізацыі і сувязі УП "Віцебскае аддзяленне Беларускай чыгункі". Быў затрыманы 6 сакавіка 2022 года за "падрыхтоўку акту тэрарызму". Згодна з дадзенымі МУС, мужчына нібыта планаваў вывядзенне са строю сістэм, якія забяспечваюць бяспеку чыгуначнага руху.
Па інфармацыі МУС Канавалаў меў доступ да абсталявання, але як піша ТГ "Live. Сообщество железнодорожников Беларуси" Канавалаў не працаваў на перагонах, ён працаваў толькі ў будынку.
А 7 ліпеня 2022 года КДБ унёс Сяргея Канавалава ў "Спіс асобаў, датычных да тэрарыстычнай дзейнасці".
Судовы працэс распачаўся 24 жніўня ў закрытым рэжыме, таму акалічнасці справы пакуль невядомыя.
Па сукупнасці злачынстваў, шляхам частковага складання пакаранняў і далучэння дадатковага пакарання, канчаткова прызначана абвінавачанаму Канавалаву пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін 15 гадоў з адбываннем пакарання ў папраўчай калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму, са штрафам у памеры 300 базавых велічынь.

**21.09.2022**

Па ініцыятыве Галоўнага ўпраўлення юстыцыі Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта і па рашэнні Віцебскага абласнога суда 25 мая пачаўся працэс ліквідацыі грамадскага аб’яднання "Самакіраванне і грамадства". Арганізацыя праіснавала больш за 11 гадоў і рэальна дапамагала мясцовым уладам, асабліва рэгіянальным Саветам дэпутатаў, развіваць мясцовае ўпраўленне і самакіраванне ўсімі даступнымі законнымі спосабамі. Нязменным кіраўніком арганізацыі быў палітык і грамадскі дзеяч **Хрыстафор Жаляпаў**.
Трэба сказаць, што ГА “Самакіраванне і грамадства” у якую ўваходзілі больш за 30 грамадзянскіх актывістаў, была ўнікальная тым, што яе стварылі вядомыя ў Віцебскім рэгіёне палітыкі і грамадскія дзеячы, прозвішча якіх гавораць самі за сябе. Дастаткова згадаць Леаніда Гаравога, Аляксея Гаўруцікава і Хрыстафор Жаляпаў, і стане зразумела супраць каго была накіравана рэпрэсія, звязаная з закрыццём арганізацыі.
Аднак не толькі склад знішчанай арганізацыі гаворыць пра значнасць для развіцця ў Віцебскай вобласці грамадзянскай супольнасці, але і тыя справы, мерапрыемствы і акцыі якія гэтая арганізацыя здзяйсняла.
Так у 2020 годзе праўленнем, членамі арганізацыі і добраахвотнымі памочнікамі аб’яднання было праведзена больш як 25 значных для Віцебскага рэгіёну мерапрыемстваў.

**26.09.2022**



Актывіст-праваабаронца **Павел Левінаў** запытаўся ў Віцебскага гарвыканкама, ці можна яму правесці пікет на асабістай старонцы ў Facebook і размясціць там нацыянальны бел-чырвона-белы сцяг. Аднак улады забаранілі Левінаву правесці масавае мерапрыемства з-за непісьменна афармленай заявы.
У сваім звароце Павел спаслаўся на тое, што раней беларусам выносілі адміністрацыйныя пастановы за размяшчэнне ў сетцы БЧБ-сцяга і прызнавалі гэта пікетам (па ч. 1 арт. 24.23 КаАП). Таму ён папрасіў дазволіць правесці масавае мерапрыемства - пікетаванне.
Дазвольны прынцып правядзення масавых мерапрыемстваў увялі ў новай рэдакцыі закона "Аб масавых мерапрыемствах" у 2021 годзе. Пры гэтым скасавалі апавяшчальны прынцып, калі жадаючыя

маглі паведаміць выканкаму аб мерапрыемстве і правесці яго ў дазволеным месцы.
У якасці месца правядзення мерапрыемства праваабаронца ўказаў Facebook. Таксама Павал паведаміў аб часе пачатку і канца пікету. Ён паабяцаў, што пасля правядзення пікетавання будзе праведзена ўборка тэрыторыі на акаўнце „Павел Левінаў“ у сацыяльнай сетцы „Facebook“. Але атрымаў забарону. Павел Ісакавіч абскардзіў адмоўнае рашэньне гарадзкіх уладаў у Віцебскі аблвыканкам. Але чыноўнікі вырашылі, што заява афармлена няслушна і пададзена ў парушэнне абзаца другога часткі пятай артыкула 5 Закона "Аб масавых мерапрыемствах".

**27.09.2022**

Палітвязень **Аляксандр Целешман** пакараны бестэрміновым утрыманнем у ШІЗА. Адміністрацыя Наваполацкай калоніі №1 трэціруе палітвязня Аляксандра Целяшмана. За дзесяць месяцаў знаходжання ў папраўчай установе па ініцыятыве кіраўніцтва ўстановы яе тройчы змяшчалі ў штрафны ізалятар.
Аляксандр Целяшман абвінавачаны па справе аб удзеле ў масавых беспарадках у Брэсце 9-10 жніўня 2020 года (ч. 2 арт. 293 Крымінальнага кодэксу).
Першы раз быў затрыманы 14 жніўня, яго забралі ў шортах без майкі і абутку, павезлі ў РАУС без бацькоў (на той момант Аляксандру не было 18 гадоў). Таксама 20 жніўня 2020 года дапытвалі ў Следчым камітэце без бацькоў. Тады Аляксандра адпусцілі пад падпіску аб нявыездзе. Але 8 лютага 2021 зноў затрымалі і перавялі ў брэскае СІЗА.
8 лістапада 2021 года ў судзе Ленінскага раёна Брэста агучылі прысуд пятай частцы абвінавачаных па справе аб “масавых беспарадках” у горадзе падчас падзей 9-10 жніўня 2020 года.
Суддзя Аляксандр Семянчук пастанавіў прызнаць усіх 19 палітзняволеных, што праходзілі па справе, вінаватымі, а Аляксандру Целяшману прызначыў 4 гады і 6 месяцаў калоніі агульнага рэжыму.

**29.09.2022**

Пра тое, што ў мінулы панядзелак **Паўла Максімава** выклікалі на гутарку ў Першамайскі РАУС, паведаміў у Фэйсбуку ягоны калега, фотамастак Віктар Барысенкаў. Нагода для гутаркі і яе змест застаюцца невядомымі, бо з пастарунку Павел Максімаў ужо не выйшаў. Ягоны тэлефон выключаны. Паводле непацверджанай інфармацыі ад ягоных сяброў, віцебскага фотааматара арыштавалі на 15 сутак.
У чым абвінавацілі Паўла Максімава, невядома. Паводле зместу ягоных старонак у сацыяльных сетках, мужчына цікавіўся палітыкай, але не дапускаў выказванняў радыкальнага зместу. Большую частку кантэнту складаюць ягоныя ўласныя фотаздымкі з гарадскіх імпрэзаў, партрэты землякоў і віцебскія краявіды.

**30.09.2022**

У судзе Полацку і Полацкага раёну вынесены прысуд **Алегу Крычкоўскаму**, прызнанаму вінаватым паводле ч.1 арт. 368 Крымінальнага кодэксу. Суддзя Уладзімір Бясецкі пастанавіў пакараць мужчыну зняволеннем на паўтара гады, як і прапанавала напярэдадні прадстаўніца полацкай пракуратуры Вольга Коласава. Падсудны цалкам прызнаў сваю віну.
Алега Крычкоўскага затрымалі ў сярэдзіне траўня 2022г. і з той пары ён знаходзіцца пад вартай. З моманту інцыдэнту, які разбіралі ў судзе, прайшло ўжо больш за паўтара гады, і падчас пасяджэння Крычкоўскі заявіў, што нават забыўся на падзею 31 снежня 2020г.
Па матэрыялах абвінавачання, у той вечар, знаходзячыся па месцы жыхарства, палачанін пакінуў каментар пад выявай Аляксандра Лукашэнкі ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте». Каментар тычыўся навіны пра ўручэнне Лукашэнку найвышэйшай адзнакі АМАП МУС – чорнага берэта. Лінгвістычная экспертыза прызнала, што допіс Крычкоўскага ўтрымлівае ненарматыўныя формы маўленчага выказвання і нясе негатыўную ацэнку кіраўніка дзяржавы. Падсудны адмовіўся ад паслугаў адваката, а ў сваю абарону заявіў, што гэта была навагодняя ноч і таму ён быў нападпітку, а каментар напісаў пад уплывам эмоцый.

**30.09.2022**



**Паўла Вінаградава** пасля месяца ў ШІЗА перавялі ў «спецыяльную палату» на паўгода. Палітвязень Павел Вінаградаў 22 верасня выйшаў са штрафнога ізалятару аршанскай калоніі №12, дзе яго ўтрымлівалі месяц.
Але адразу пасля гэтага адміністрацыя калоніі палічыла, што палітвязень «парушае рэжым», таму яго на 6 месяцаў перавялі ў «спецыяльную палату» — «памяшканне камернага тыпу» для хворых на сухоты. Вінаградаў грамадскі актывіст і блогер. Быў затрыманы 22 снежня 2021 года ў сябе ў прыватным доме ў Беразіно.
Ён стаў фігурантам крымінальнай справы па арт. 130 (Распальванне сацыяльнай варожасці), ч. 2 арт. 367 (Паклёп на прэзідэнта) і арт. 342 (Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх).
У сярэдзіне ліпеня 2022 г. у палітвязня на рэнтгене знайшлі пляму ў лёгкіх. Павел прайшоў курс антыбіётыкаў, але гэта не прынесла плёну.
28 чэрвеня 2022 г. КДБ унёс палітвязня ў спіс асобаў, "датычных да тэрарыстычнай дзейнасці".
28 ліпеня 2022 г. Паўла перавялі з ПК № 11 у аршанскую калонію № 12. Вядома, што Вінаградава пазбавілі працяглага спаткання за сон днём — зараз палітвязень афіцыйна прызнаны "злосным парушальнікам рэжыму". У Паўла дыягнаставалі сухоты, ён схуднеў на 36 кг. Вядома, што адміністрацыя ПК № 12 скала на палітвязня тры рапарты і 23 жніўня змясціла Вінаградава ў штрафны ізалятар, а таксама пазбавіла яго рэжымнай перадачы. 22 верасня Павел выйшаў са штрафнога ізалятару, але адразу пасля гэтага адміністрацыя калоніі палічыла, што палітвязень "парушае рэжым", таму яго на шэсць месяцаў перавялі ў "спецыяльную палату" — "памяшканне камернага тыпу" для хворых на сухоты.

## Кастрычнік 2022

**03.10.2022**

Віцяблянку **Яну Пінчук** прызналі палітзняволенай. Праваабарончая супольнасць Беларусі ўключыла ў пералік палітычных зняволеных ураджэнку Віцебску Яну Пінчук, якую вінавацяць у паклёпе, незаконных дзеяннях з персанальнымі дадзенымі, распальванні сацыяльнай варожасці і варажнечы, стварэнні і кіраўніцтве экстрэмісцкім фармаваннем, заклікам да абмежавальных мер (санкцый). Зараз дзяўчыну ўтрымліваюць у віцебскім СІЗА-2, у верасні Яну Пінчук дэпартавалі з Расеі насуперак закліку Камітэту па правах чалавека ААН абараніць дзяўчыну ад пераследу ў Беларусі.

**04.10.2022**

Камітэце ААН па правах чалавека абараніў правы **Юрыя Бельскага**, які памёр у 2021 годзе. Камітэт 17 траўня разгледзеў зварот №2766/2016 праваабаронцы з Полацку Юрыя Бельскага. У сваім рашэнні Камітэт пацвердзіў пазіцыю актывіста аб тым, што беларускія ўлады парушылі яго свабоду публічна выказваць свае меркаванні і права праводзіць масавае мерапрыемства.



Бельскі, 15 снежня 2014 года, падаў заяву ў Полацкі раённы выканаўчы камітэт для атрымання дазволу на правядзенне мірнага пікету 30 снежня з мэтай збору подпісаў у падтрымку стварэння грамадскага аб'яднання па абароне правоў спажыўцоў.
Пікет планавалася правесці каля кінатэатра "Радзіма", месца, якое раней было вызначана выканаўчым камітэтам як спецыяльна адведзенае месца ў горадзе для арганізацыі мірных сходаў.
Полацкі раённы выканаўчы камітэт 24 снежня адмовіў у дазволе на правядзенне пікету, паколькі заяўнік не заручыўся адпаведнай падтрымкай з боку міліцыі для гарантавання бяспекі і грамадскага парадку, а таксама з прычыны адсутнасці дамоваў у абслугоўванні масавага мерапрыемства з боку медыцынскіх установы і камунальных прадпрыемстваў горада.

Ужо 15 студзеня 2015 года Юрый абскардзіў рашэнне раённага выканаўчага камітэта ў Полацкім раённым судзе, заявіўшы аб парушэнні яго правоў на свабоду выказвання меркаванняў і мірных сходаў, гарантаваных Канстытуцыяй Беларусі і артыкуламі 19 і 21 Пакта.

Аналізуючы фактычны бок справы Камітэт вырашыў, што забарона на правядзенне публічнага пікету, накладзеная на праваабаронцу Полацкім раённым выканаўчым камітэтам, раўнасільная парушэннем яго правоў па артыкулах 19 і 21 Пакта.

Камітэт палічыў, што ўрад Рэспублікі Беларусь абавязаны прыняць усе неабходныя меры для прадухілення такіх парушэнняў у будучыні.

У сувязі з гэтым Камітэт адзначае, што ён разглядаў аналагічныя справы ў дачыненні да тых жа законаў і практыкі дзяржавы і ёй трэба перагледзець сваю нарматыўную базу ў адносінах да публічных мерапрыемстваў з мэтай забеспячэння захавання правоў, прадугледжаных артыкуламі 19 і 21 Пакта.

Таксама цягам 180 дзён Камітэт хацеў бы атрымаць ад Беларусі інфармацыю аб мерах, прынятых для імплементацыі прынятага рашэння, і прапануе ўраду апублікаваць яго ў дзяржаўных СМІ.

**06.10.2022**

Жыхарка Наваполацка **Настасся Савуляк** патэлефанавала на «гарачую лінію» у міліцыю і выказалася на адрас Аляксандра Лукашэнкі – як палічылі эксперты, «у ненарматыўнай форме». Інцыдэнт здарыўся 26-га красавіка – праз колькі дзён, як жанчына адсвяткавала сваё 37-годдзе. Суд, жанчыну прызнаў вінаватай паводле ч.1 артыкула 368 Крымінальнага Кодэксу.

Паводле следства, жанчына размаўляла з міліцыянтамі з тэлефона свайго грамадзянскага мужа. Як яна патлумачыла ў судзе, у той момант яна была ў нецвярозым стане. Гэта ўжо тыповая сітуацыя, калі пад уздзеяннем алкаголю людзі губляюць кантроль і выказваюцца пра тое, што набалела за апошнія гады. Прычым гэта не хранічныя алкаголікі, як імкнуцца прадставіць асуджаных у дзяржаўных СМІ, а звычайныя людзі, што паддаліся эмоцыям.

На думку абвінавачання, сваім учынкам Настасся Савуляк прынізіла аўтарытэт, гонар і годнасць Аляксандра Лукашэнкі. Суддзя наваполацкага суду Віталь Лапко прысудзіў жанчыне паўтара гады пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму.

**07.10.2022**

У судзе Наваполацка быў вынесены прысуд 40-гадоваму мясцоваму жыхару **Максіму Камкову**, абвінавачанаму ў абразе прадстаўніка ўлады па арт. 369 Крымінальнага кодэкса. Суддзя Віталь Лапко пастанавіў прызнаць Максіма вінаватым і прысудзіў яму абмежаванне волі тэрмінам на 1 год і 6 месяцаў з накіраваннем ва ўстанову адкрытага тыпу.

Па матэрыялах абвінавачання, 28 лютага 2021 у сетцы "ВКонтакте" Максім Камкоў у публічнай групе “Полацк, Наваполацк…” размясціў публікацыю з фота пацярпелага супрацоўніка міліцыі Ляшко, яго асабістымі дадзенымі, тым самым публічна абразіў як прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў. Дзеянні Камкова прычынілі Ляшко маральныя пакуты, якія ён ацаніў у 1 500 рублёў.

Каментар, згодна з высновамі экспертызы, “негатыўна ацэньвае Ляшко і змяшчае ненарматыўную форму маўленчага выказвання, якое зневажае аўтарытэт, гонар і годнасць прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў. Сваімі наўмыснымі дзеяннямі Камкоў здзейсніў абразу прадстаўніка ўлады ў сувязі з выкананнем ім службовых абавязкаў”.

Пад час разгляду справы ў судзе, абвінавачаны прызнаў сваю віну і папрасіў прабачэння ў міліцыянта. Раней Камкоў выплаціў усю суму маральнай шкоды пацярпеламу, і грамадзянскі пазоў быў судом зняты.

**08.10.2022**

У судзе Глыбокскага раёна была разгледзена адміністрацыйная справа фатографа і відэааператара **Леаніда Юрыка.** На падставе міліцэйскіх пратаколаў суд прызнаў медыйшчыка вінаватым “распаўсюдзе інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці” і пакараў адміністрацыйным арыштам на 5 сутак.

Суддзя Андрэй Тарасевіч, які разглядаў справу, прызнаў Леаніда вінаватымі ў парушэнні артыкула 19.11 КаАП (“Распаўсюд, выраб, захоўванне, перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці ці прапагандуе такую дзейнасць”) і пакараў яго пазбаўленнем волі.

**09.10.2022**

Чыноўнікі Міністэрства ўнутраных страўабнавілі «Пералік асобаў, датычных да экстрэміскай дзейнасці». Спіс павялічыўся яшчэ на 47 прозвішчаў беларусаў. У базу быў уключаны і палітвязень **Леанід Судаленка**, які адбывае пакаранне ў папраўчай калоніі №3 у пасёлку Віцьба Віцебскага раёна Віцебскай вобласці.
Леанід Судаленка — старшыня Гомельскага аддзялення Праваабарончага цэнтра "Вясна", праваабаронца з 20-гадовым стажам аказання дапамогі ў аднаўленні парушаных правоў грамадзянаў. Ён дапамагаў у падрыхтоўцы і накіраванні шматлікіх індывідуальных зваротаў у Камітэт па правах чалавека ААН супраць Беларусі.

**09.10.2022**

У судзе Глыбокскага раёна была разгледзена адміністрацыйная справа **Вадзіма Хлуса**. На падставе матэрыялаў справы суд прызнаў грамадскага актывіста Хлуса вінаватым у “распаўсюдзе інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці” і пакараў яго адміністрацыйным арыштам на 7 сутак.
Суддзя Андрэй Тарасевіч, які разглядаў справу, прызнаў Вадзіма вінаватымі ў парушэнні арт. 19.11 КаАП (“Распаўсюд, выраб, захоўванне, перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці ці прапагандуе такую дзейнасць”) і пакараў яго пазбаўленнем волі.

**10.10.2022**

У Віцебскім абласным судзе быў вынесены прысуд паводле ч. 1 арт. 130 (Распальванне іншай сацыяльнай варожасці) КК палітзняволенаму **Сяргею Давівелю**. Суддзя Віцебскага абласнога суда Галіна Бондал прызнала Сяргея вінаватым і прызначыла яму пакаранне тэрмінам на 2 гады пазбаўлення волі ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму. Пасяджэнне праходзіла ў закрытым фармаце.
Сяргея Далівеля затрымалі ў 2021 годзе паводле крымінальнай справы, узбуджанай за каментары ў інтэрнэце пасля гібелі ў мінскай кватэры супрацоўніка КДБ Дзмітрыя Федасюка і it-спецыяліста Андрэя Зельцэра.
Пасля затрымання падсуднага змясцілі ў Следчую турму № 8 горада Жодзіна, пасля чаго перавялі ў Віцебскае абласное СІЗА №2.
Першапачаткова Далівеля абвінавачвалі паводле двух артыкулаў. Але падчас судовага пасяджэння высветлілася, што абвінавачанні паводле арт. 369 (Абраза прадстаўніка ўлады) знялі.

**11.10.2022**



У Наваполацку адбыўся ўжо трэці суд над **Ганнай Тукавай**. Цяпер міліцыя паставіла ёй у віну «пікетаванне» ў інстаграме выявамі украінскага сцяга. Справу па двух пратаколах па адміністратыўнаму артыкулу 24.23 (Парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў) разгледзела суддзя Зінаіда Балаболава. Пасля разгляду матэрыялаў справы, суддзя прызначыла Ганне штраф у памеры 3200 рублёў.
На судзе жанчына адзначыла, што старонка яе закрытая, таму ўчастковы не меў доступу да яе публікацый. Такое ўмяшальніцтва ў яе прыватнае жыццё яна расцэньвае як «спробу псіхалагічнага ціску».
Трэба нагадаць пра тое, што 1 верасня падчас лінейкі ў наваполацкай гімназіі №1 праходзіла выступленне людзей у вайсковай форме. Ганна на сярэдзіне выступлення выйшла з антываеннай акцыяй — яна стала перад імі і паказала знак перамогі - «V».
Жанчыну адразу затрымалі, а потым тыдзень утрымлівалі за кратамі, нягледзячы на тое, што ў яе ёсць 12-гадовая дачка.
Раней Ганне двойчы прызначалі штрафы: 960 і 3200 рублёў па артыкулу 19.11 КаАП РБ. Агулам Тукава павінна сплаціць дзяржаве суму штрафу ў памеры 7360 рублёў.

**14.10.2022**

Адміністрацыя віцебскай калоніі незадаволеная тым, што сваякі публікуюць лісты **Максіма Знака**. Палітзняволены, былы адвакат Максім Знак быў абвінавачаны ў спробе захопу ўлады, публічных закліках да дзеянняў, скіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы, і стварэнні экстрэмісцкага фарміравання, яго асудзілі да 10-ці гадоў калоніі. Тэрмін зняволення ён адбывае ў віцебскай ПК-3(«Віцьба»). Сваякі палітвязня стварылі тэлеграм-канал «Невероятные письма. Максим Знак», дзе размяшчалі ўрыўкі з ягоных лістоў на волю. Цяпер гэты канал вымушана спыняе сваё існаванне.
Макс Знак – адзін з самых вядомых на сёння ўтрыманцаў «Віцьбы-3». Гэта былы чалец Прэзідыюму Каардынацыйнай Рады па ўрэгуляванню палітычнага крызісу, адвакат, супрацоўнік перадвыбарчага штабу Віктара Бабарыкі – а цяпер таксама палітвязня, які адбывае пакаранне ў наваполацкай ПК-1.

**15.10.2022**

Віцебскі абласны суд прыняў рашэнне аб ліквідацыі Браслаўскага раённага грамадскага аб’яднання літоўцаў «Рытас» («Ritas»), якое праіснавала 22 гады. Грамадскае аб’яднанне было зарэгістравана ў вёсцы Адымянішкі Браслаўскага раёну і мела каля 100 удзельнікаў. Дзейнасць арганізацыі была накіравана на стварэнне ўмоў для нацыянальнага самавыяўлення, захавання літоўскай мовы, гісторыі, звычаяў і традыцый літоўцаў Браслаўшчыны.
Вёска Адымянішкі Опсаўскага сельсавету – адна з памежных вёсак, і таму не дзіўна, што побач з беларусамі ў гэтым рэгіёне здаўна жыве шмат літоўцаў. Грамадскае аб’яднанне «Рытас» арганізавала працу дзвюх нядзельных школ па вывучэнні літоўскай мовы ў вёсках Опса і Усяны Браслаўскага раёну. Удзельнікі праводзілі імпрэзы да літоўскіх нацыянальных святаў, ладзілі мерапрыемствы на літоўскай мове да Дня маці, Дня ведаў, Новага году. Грамадскае аб’яднанне «Рытас» рэгулярна брала ўдзел фестывалях, якія праводзяцца на тэрыторыі Літоўскай Рэспублікі, прымала дэлегацыі з
Літвы, супрацоўнічала з грамадскім аб’яднаннем «Драўгія» (г. Вільнюс).
Пазоў аб ліквідацыі БРГАЛ «Рытас» быў пададзены галоўным упраўленнем юстыцыі Віцебскага аблвыканкама. Па рашэнні абласнога суду ад 14 верасня яно лічыцца ліквідаваным.

**20.10.2022**

У беларускай сталіцы затрымана пара з Оршы - **Марыю Яшчанку** і **Рамана Цыганкова**. У дзень затрымання яны былі арыштаваныя судом на 14 сутак кожны за нібыта адміністрацыйнае правапарушэнне. Цяпер яны знаходзяцца ў Цэнтры ізаляцыі правапарушальнікаў, які размешчаны на вул. Акрэсціна ў Мінску. І Марыя, і Раман маюць хранічныя захворванні, але кіраўніцтва ЦІПа адмовіла сваякам перадаць ім ежу, лекі і цёплыя рэчы.




На відэа, якое здымалася падчас аперацыі затрымання, дзяўчыны і маладога чалавека відаць, як дзверы кватэры, у якой яны пражывалі, сілавікі выкрывалі пры дапамозе ломаў. Затым у памяшканне праніклі байцы Спецыяльны атрад хуткага рэагавання, экіпіраваныя так, быццам яны праводзяць спецаперацыю супраць тэрарыстаў.
Падчас затрымання на Марыю і Рамана было аказана фізічнае ўздзеянне і псіхалагічны ціск, што ўвяло іх у шокавы стан.
Калі яны адбывалі арышт ў дачыненні да Марыі Яшчанкі і Рамана Цыганкова была ўзбуджаная крымінальная справа па арт. 342 (Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх) КК РБ.
Тое, што яны прымалі ўдзел у пратэстах, маладыя людзі спраўджваюць на відэа, якое было паказана на тэлеграм-канале, афіляваным з праваахоўнымі органамі.

**21.10.2022**

Згодна з рашэннем Віцебскага абласнога суда, ліквідавана Віцебскае грамадскае аб'яднанне "Дзіцячай Актыўнай Рэабілітацыі". Знішчэнне "ДАРа" адбываецца па прадстаўленні Галоўнага ўпраўлення юстыцыі Віцебскага выканаўчага камітэта, якім кіруе Сяргей Канапелька. Улічваючы, што закрытая

арганізацыя дапамагала дзецям з абмежаванымі магчымасцямі, то напрошваецца відавочная выснова аб тым, што віцебскія ўлады канчаткова расчалавечыліся.
ГА "Дзіцячай Актыўнай Рэабілітацыі" было зарэгістраванае ўладамі 23 мая 2018 года і за сваю чатырохгадовую гісторыю існавання змагла дапамагчы многім дзецям у якіх былі сур'ёзныя праблемы са здароўем.
Стварыўшы гэтую грамадскую арганізацыю і працуючы ў ёй на валанцёрскіх пачатках, віцябляне шчыра імкнуліся змяніць грамадскую свядомасць у адносінах да людзей з абмежаванымі магчымасцямі, устараніць сацыяльныя бар'еры і стэрэатыпы.
Для гэтага ДАРаўцы арганізоўвалі сумесны вольны час дзяцей з інваліднасцю і фізічна здаровых людзей, імкнуліся стварыць для хворых дзяцей асяроддзе пражывання, у якім адсутнічалі б пачуцці непатрэбнасці, незапатрабаванасці, дыскрымінацыі і адзіноты. І словы не разыходзіліся са справамі.
Адразу пасля рэгістрацыі, у ліпені 2018 года бацькі, заснавальнікі арганізацыі, і іх дзеці ў складзе каманды «Крылы Анёлаў» прынялі масавы ўдзел у "Славянскім забегу". Разам з імі паўмарафонскую дыстанцыю пераадолеў ураджэнец Оршы, удзельнік Нацыянальнай паралімпійскай зборнай, бізнэсмэн, матывацыйны аратар Аляксей Талай.
У лістападзе 2018 года актывісты арганізацыі далучыліся да сацыяльнага праекту "Новае жыццё ў абмен на вечкі". Яны звярнуліся да жыхароў горада з прапановай прыняць удзел у зборы пластыкавых вечак ад бутэлек з-пад напояў, бытавой парфумерыі і хіміі, якія потым ішлі на перапрацоўку. Атрыманыя падчас акцыі грошы пайшлі на набыццё медыкаментаў, медінвентару і рэабілітацыйнага абсталявання для людзей з інваліднасцю.

**29.10.2022**

Віцебскага блогера і прадзюсара **Уладзіслава Савіна** асудзілі яшчэ і за абразу Лукашэнкі. У судзе Баранавіцкага раёну і г. Баранавічы разгледзелі крымінальную справу супраць блогера і прадзюсара Уладзіслава Савіна, якога 30 красавіка мінулага году асудзілі да васьмі гадоў калоніі за «махлярства ў буйным памеры» (ч. 4 арт. 209 Крымінальнага кодэксу), а таксама за арганізацыю і ўдзел у акцыях пратэсту (арт. 342 Крыминальнага Кодэксу). Ён знаходзіцца ў зняволенні, і цяпер яго судзілі паводле артыкула 368 Крымінальнага кодэксу за абразу Лукашэнкі ў вершы, змешчаным у апеляцыйнай скарзе. Суддзя Вікторыя Пакунова 26 кастрычніка прызначыла яму яшчэ два гады калоніі.
Згодна з версіяй абвінавачвання, Савін напрыканцы чэрвеня 2022 г., «маючы намер на публічную абразу прэзідэнта, знаходзячыся ў камеры № 49 СІЗА-6, напісаў апеляцыйную скаргу, якая змяшчае непрыстойныя выказванні абразлівага характару ў адносінах да прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі. Паводле вынікаў экспертызы, «верш мае негатыўную ацэнку прэзідэнта, ён разлічаны на азнаямленне шырокага нявызначанага кола асоб, у тым ліку асоб, якія ўтрымліваюцца з ім у адной камеры пад вартай, супрацоўнікаў СІЗА-6 і Мінскага гарадскога суда». І паколькі ён «падаў апеляцыйную скаргу для агляду, азнаямлення і наступнага накіравання ў Мінскі гарадскі суд, то тым самым публічна прынізіў гонар і годнасць Лукашэнкі».

**29.10.2022**

Віцебскія ўлады пазбавілі рэгістрацыі маладзёжную лігу клубаў вясёлых і знаходлівых. Маладзёжнае грамадскае аб'яднанне "Віцебская ліга КВЗ" спыніла сваё існаванне ў якасці юрыдычнай асобы. Стартам працэдуры ліквідацыі стала рашэньне Віцебскага абласнога суда прынятае яшчэ ў сакавіку 2022 года. Ініцыятарам знішчэння маладзёжнай арганізацыі стала кіраўніцтва Упраўлення юстыцыі Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта.
"Віцебская ліга КВЗ" змагла праіснаваць восем гадоў, пры гэтым члены гэтай грамадскай арганізацыі застануцца ў істрыі правядзення гульняў КВЗ яркі і незгладжальны след.
Неабходна адзначыць, што віцебскія кваўшчыкі доўгі час плячом да пляча працавалі з дзяржаўнымі органамі і арганізацыямі.

**31.10.2022**

Полацкі суд арыштаваў прадпрымальніцу на 30 сутак, за спробу перадаць калектыўны зварот мясцовым уладам. У Полацку ў сераду 26 кастрычніка была затрымана ІП **Таццяна Шастак**, якая збіралась перадаць старшыні Наваполацкага гарвыканкаму Дзмітрыю Дзямідаву петыцыю ад мясцовых бізнісоўцаў. У звароце прадпрымальнікі прасілі ўлады растлумачыць ім як працаваць у новых умовах з цэнаўтварэннем.
Таццяну затрымалі а сёмай гадзіне раніцы, калі яна выходзіла з дома ў Полацку, і завезлі ў мясцовы

РАУС. Пасля складання пратакола ў яе кватэры быў праведзеныператрус, пад час якога міліцыянты канфіскавалі ўсе дакументы з калектыўным зваротам прадпрымальнікаў да Дзямідава і асабісты тэлефон.
У гэты ж дзень судом Полацкага раёна арыштаваў Шастак на 30 сутак. Сябры і сваякі не змаглі патрапіць на судовае паседжанне, бо суд прайшоў раптоўна ў паскорыным рэжыме.
Пакуль не вядома па якім артыкуле арыштавалі прадпрымальніцу. У судзе яе мужу адмовіліся паведаміць, у чым абвінавацілі Таццяну.
Сваякі 29 кастрычніка спрабавалі зрабіць перадачу Таццяне ў ІЧУ Віцебскага аблвыканкама, дзе прадпрымальніца адбывае арышт. Аднак, кіраўнік ізалятара без тлумачэнняў адмовіліся прымаць прадукты харчавання, але дазволіў перадаць зняволенай толькі асабістыя гігенічныя прылады.

## Лістапад 2022

**03.11.2022**

**Вольгу Брыцікаву** чарговы раз асудзілі на 15 сутак. Старшыню пярвічнай арганізацыі Беларускага Незалежнага прафсаюзу «Нафтан» затрымалі 1 лістапада. На трэці дзень па затрыманні яе асудзілі за распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў (арт. 19.11 КаАП). Гэта ўжо шосты арышт сёлета: вясной гэтага году Вольга Брыцікава правяла за кратамі 75 сутак без перапынку. Яе пяць разоў запар арыштоўвалі на 15 сутак па адміністрацыйным артыкуле 24.23 – нібыта за несанкцыянаванае пікетаванне.
Паказальна, што на наступны дзень пасля затрымання актывісткі на «Нафтане» правялі ідэалагічны сход з удзелам кіраўніка КДБ Івана Церцеля. На сходзе вялося пра неабходнасць мацаваць унутраную дысцыпліну, каб супрацьстаяць унутраным і знешнім ворагам. Да ліку ўнутраных залічаны «дэструктыўныя сілы», куды, відавочна, прадстаўнікі ўлады адносяць і Вольгу Брыцікаву, і недзяржаўныя прафсаюзы, і ўсіх грамадскіх актывістаў.
Да небяспекі пагрозаў «знутры» дадаюцца знешнія пагрозы. Пра гэта казаў намеснік начальніка Генеральнага штаба Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь Ігар Кароль. Ён зазначыў, што Беларусь – мірная краіна, але армія гатова бараніць радзіму ў выпадку неабходнасці. Дзеля гэтага вайскоўцы выконваюць задачы баявога дзяжурства ва ўзмоцненым рэжыме, працуе выведка, прадугледжаны захады супрацьстаяння вайсковым правакацыям у памежнай прасторы.
Работнікі «Нафтана» адзначаюць, што візіт сілавікоў, найверагодней, звязаны з узмацненнем пратэстных настрояў на прадпрыемстве. І што Вольгу Брыцікаву адмыслова затрымалі напярэдадні сходу.

**05.11.2022**



Палітвязень з Пастаўшчыны **Андрэй Новікаў** адбыў тэрмін пакарання, але яго адразу перадалі расейскай ФСБ. Андрэй Новікаў выйшаў на волю з бабруйскай ПК № 2 31-га кастрычніка 2022 г. Але дахаты не прыехаў – яго забралі супрацоўнікі расейскай ФСБ. Ён быў асуджаны да двух з паловай гадоў зняволення паводле арт. 342 Крымінальнага Кодэкса (Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, што груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх) і арт. 371 Крымінальнага Кодэкса (Незаконнае перасячэнне дзяржаўнай мяжы Рэспублікі Беларусь). Пасля затрымання па першым артыкуле яго вывезлі за беларускую мяжу і зрабілі «неўяўздным».
Андрэй Новікаў – грамадзянін Расейскай Федэрацыі, ён нарадзіўся ў беларускім Варапаева, пасля школы з’ехаў вучыцца ў Расею. Падчас мінулай прэзідэнцкай выбарчай кампаніі быў валанцёрам ініцыятыўнай групы Святланы Ціханоўскай. 12 чэрвеня 2020 года яму прад’явілі абвінавачванне па ч. 1 арт. 342 Крымінальнага Кодэкса (Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак). 26 лістапада Андрэя Новікава наўпрост вывезлі на мяжу з Расеяй, і паставілі штамп аб забароне ўезду на тэрыторыю Беларусі на 10 гадоў.
У Беларусі, дзе ён меў від на жыхарства, у яго заставаліся жонка і дзеці. Андрэй Новікаў вырашыў вярнуцца да іх патаемна, і быў ізноў затрыманы 13 красавіка 2021 года ў Паставах. Мужчыну інкрымінавалі парушэнне арт. 371 Крымінальнага Кодэкса (Незаконнае перасячэнне дзяржаўнай мяжы Рэспублікі Беларусь).
5 жніўня 2021 г. у судзе Кастрычніцкага раёну Віцебска Андрэя Новікава асудзілі да двух з паловай гадоў пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму.

**10.11.2022**

Санкт-Пецярбургскі гарадскі суд прыняў рашэнне задаволіць запыт беларускага боку на экстрадыцыю з Расіі ўраджэнца Оршы псіхолага **Андрэя Рускіх**. Яго падазраюць у двух злачынствах па так званых «народных крымінальных артыкулах», здейсненых ім на тэрыторыі Беларусі.
Андрэй Рускіх, псіхолаг і псіхатэрапеўт, трэнер у сферы трывожна-фабічных і сэксуальных расстройстваў, аўтар кнігі «Назойлівыя думкі, страхі і ВСД. Як вярнуць паўнавартаснае жыццё» і яшчэ некалькіх кніг па практычнай псіхалогіі, вёў уласны сайт і блогі ў сацсетках.
Андрэя затрымала паліцыянты ў Санкт-Пецярбургу 28 траўня гэтага года. Як тады высветлілася, у Беларусі супраць яго ўзбуджана крымінальная справа з-за каментароў у сацсетках, і ён быў аб'яўлены ў федэральны вышук у РФ.
Ёсць звесткі пра тое, што 43-гадоваму мужчыну інкрымінуюць крымінальныя дзеянні ў рамках арт. 368 (Абраза Прэзідэнта РБ) і арт. 130 (Распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай або іншай сацыяльнай варожасці або варожасці).
У жніўні расейскія праваабаронцы з «Мемарыяла» прызналі Андрэя Рускіх палітычным зняволеным. Пры гэтым расійскія праваабаронцы, кіраваліся міжнароднымі крытэрыямі, і мяркуюць, што яго крымінальны пераслед палітычна матываваны і звязаны выключна з яго перакананнямі і рэалізацыяй права на свабоду выказвання меркавання.

**11.11.2022**

Вользе Брыцікавай накінулі новы арышт. Да таго яна абвесціла галадоўку. 11 лістапада над старшынёй незалежнага прафсаюза «Нафтан» **Вольгай Брыцікавай** адбыўся чарговы суд. Яе абвінавацілі ў «несанкцыянаваным пікетаванні» (арт. 24.23 КаАП).
Падставай стаў малюнак «Не вайне» на яе старонцы ў фэйсбуку. Але справа ў тым, што Вольга ўжо адбыла арышт за яго некалькі месяцаў таму. Але суддзя Зінаіда Балаболава зноў прызнала Вольгу вінаватай і зноў прысудзіла 15 сутак.
Вольгу Брыцікаву затрымалі 1 лістапада. Яе асудзілі за «распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў» на 15 сутак. 8 лістапада яна абвясціла галадоўку.
Увесну Вольга Брыцікава адсядзела 75 сутак. Яе пяць разоў запар арыштоўвалі на 15 сутак па артыкуле 24.23.
Таксама стала вядома пра тое, что Вольга Брыцікава з 8 лістапада 2022 года абвясціла галадоўку ў ІЧУ горада Наваполацка. Яна напісала адпаведную заяву на імя начальніка карнай установы.

**11.11.2022**



Суд арыштаваў актывіста **Генадзя Бярдзенёва** на 30 сутак. Генадзя затрымалі 10 лістапада ў Полацку. Ён нядаўна прыехаў з Польшчы, дзе працаваў апошнія тры месяцы і збіраўся ў бліжэйшыя дні зноў вярнуцца назад.
Полацкія міліцыянты на мужчыну склалі адразу два пратаколы: па арт. 24.23 (Парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў) і арт. 19.11 КаАП (Распаўсюджванне, выраб, захоўванне, перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або якая прапагандуе такую дзейнасць).
Суд над Бярдзенёвым адбыўся 11 лістапада, які праходзіў у закрытым рэжыме, на якім суддзя прызнаў яго вінаватым па двух пратаколах і арыштаваў на 30 сутак.
Каля пяці гадоў таму Генадзь быў адным з ініцыятараў стварэння пярвічнай арганізацыі «Свабодны прафсаюз Беларусі» сярод ІП на Полацкім рынку.

**12.11.2022**

У Менскім гарадскім судзе абвясцілі вырак **Вадзіму Васільеву**, 27-гадоваму ўраджэнцу Віцебску – 12

гадоў калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму і штраф у памеры 500 базавых велічыняў (16 000 беларускіх рублёў). Суд праходзіў у закрытым рэжыме, хлопца асудзілі па шасці артыкулах Крымінальнага кодэксу нібыта за адміністраванне «экстрэмісцкіх» тэлеграм-каналаў.
Суддзя Таццяна Фалькоўская прызнала Вадзіма Васільева вінаватым па шасці артыкулах Крымінальнага кодэксу: ч. 1 арт. 342 (Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, што груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх), ч. 3 арт. 361 (Заклікі да дзеянняў, скіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь), арт. 361-1 (Стварэнне экстрэмісцкага фармавання або ўдзел у ім), ч. 3 арт. 130 (распальванне іншай сацыяльнай варожасці), ч. 1 арт. 293 (Арганізацыя масавых беспарадкаў), ч. 1 арт. 290-4 (Стварэнне арганізацыі для ажыццяўлення тэрарыстычнай дзейнасці альбо ўдзел у ёй).
Вадзіма Васільева затрымалі ў траўні 2022г. у дзень завядзення крымінальнай справы на адміністратараў Nexta Сцяпана Пуцілы і Яна Рудзіка «за стварэнне тэрарыстычнай арганізацыі». Сілавікі тады казалі затрыманне некалькіх адміністратараў тэлеграм-каналаў, «звязаных з NEXTA». Вадзім Васільеў у жніўні 2020 г. ён быў адміністратарам чатаў «Віцебск 97%» і «Орша 97%».

**16.11.2022**

Журналістку **Жанну Іванову (Жалевіч)** аштрафавалі на 100 базавых велічынь. Пра гэта пазаштатная карэспандэнтка інтэрнэт-выдання «Витебский курьер» паведаміла ў Фэйсбуку, напісаўшы: «Я дома. Суд быў». Жанчыну прызналі вінаватай у несанкцыянаваным пікетаванні паводле артыкула 24.23 КоАП. У адміністрацыйным пратаколе былі згаданыя 4 публікацыі ў Instagram і «Одноклассниках», дзе міліцыянты разгледзелі нацыянальную сімволіку.
Суд над Жаннай Івановай (Жанна Жалевіч – гэта творчы псеўданім журналісткі) мусіў адбыцца толькі ў пятніцу, 18-га лістапада. Але раніцай 16-га па яе прыйшлі супрацоўнікі Першамайскага РАУС. Жанчына паспела паведаміць пра гэта ў сацыяльных сетках. І толькі ўвечары з'явілася наступнае паведамленне, што яна на волі, але са штрафам у 3 200 рублёў.
Паводле артыкула 24.23 КоАП яе маглі пакараць і «суткамі», але спадарыня Жанна мае шэраг хранічных хваробаў, што было ўлічана судом. Сувязь з журналісткай па-ранейшаму адсутнічае: найверагодней, што тэлефон у яе забралі ў якасці гарантыі аплаты штрафа.

**17.11.2022**



У судзе Віцебскага раёна завяршыўся разгляд крымінальнай справы ў дачыненні да 68-гадовага жыхара в. Хатоля Віцебскага раёна **Аляксандра Патапава.** Мужчыну абвінавацілі ў абразе прэзідэнта па ч.1 арт. 368 беларускага КК.
Суддзя Наталля Траццякова прызнала падсуднага вінаватым і прызначыць яму пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам на 2 гады ва ўмовах агульнага рэжыму.
Палітзняволены Аляксандр Патапаў быў затрыманы міліцыяй 25 жніўня 2022 года і ўзяты пад варту па падазрэнні ў абразе Лукашэнкі праз каментары ў сацыяльнай сетцы "Аднакласнікі". Раней Аляксандра ўжо затрымлівалі ў межах адміністрацыйнай справы па арт. 19.11 КаАП, тады яму прызначылі штраф.
Пад час апошняга судовым пасяджэнні Патапаў заявіў, што ў яго пастаянна дрэннае самаадчуванне, цяжкасць у галаве, слабасць і ён вымушаны прымаць абязбольныя сродкі. Яму абяцалі абследванне ў медыцынскім стацыянары, але апошнія 94 дні ён знаходзіўся ў жорсткіх умовах зняволення ў ШІЗА.
Суд абвясціў перапынак і запрасіў даведку аб стане здароўя абвінавачанага. Медык СІЗА №2, якога выклікалі ў суд, паведаміў, што Аляксандру аказваецца належная медыцынская дапамога, змяшчэнне ў стацыянар не патрабуецца. Даведку далучылі да матэрыялаў справы.

**18.11.2022**

Пенсіянерку **Эму Сцепулёнак** асудзілі да 2 гадоў калоніі за абразу чыноўнікаў. Эму Антонаўну абвінавацілі паводле двух артыкулаў Крымінальнага кодэкса: арт. 368 (Абраза Лукашэнкі) і арт. 369 (Абраза прадстаўніка ўлады). Суддзя суда Мёрскага раёна Ірына Яскевіч прызначыла палітзняволенай 2 гады пазбаўлення волі ва ўмовах агульнага рэжыму. Яе ўзялі пад варту ў зале суда. У зняволенні ёй

засталося адбыць прыкладна 4 месяцы.
Эму Сцепулёнак затрымалі 29 верасня 2021 года ў межах крымінальнай справы, узбуджанай за каментары ў інтэрнэце пасля гібелі супрацоўніка КДБ Дзмітрыя Федасюка і IT-спецыяліста Андрэя Зельцэра. Першыя два месяцы жанчыну ўтрымлівалі ў жодзінскай турме № 8, а потым перавялі ў віцебскі СІЗА-2.
У сярэдзіне верасня жанчыне змянілі меру стрымання і перавялі на хатні арышт. 7 лістапада Эма Антонаўна адзначыла 69-годдзе дома. Пенсіянерку ўтрымлівалі за кратамі амаль год, але ў сярэдзіне верасня жанчыне змянілі меру стрымання і перавялі на хатні арышт.

**19.11.2022**

Палітвязня блогера Дзмітрыя Цімафеева перавялі з "хіміі" ў калонію. Судзе Чыгуначнага раёна Віцебска 16 лістапада разглядзеў справу аб змене пакарання палітзняволенаму блогеру **Дзмітрыю Цімафееву** на больш жорсткае і пастанавіў перавесці палітвязня з папраўчай установы адкрытага тыпу ў папраўчую калонію тэрмінам на 3,5 месяцы. 51-гадовага баранавіцкага блогера Дзмітрыя Цімафеева 17 лютага 2021 года асудзілі да двух гадоў "хіміі" за абразу начальніка аддзела ДАІ Бабруйскага гарвыканкама Віталя Паддубскага.
Цімафеева накіравалі адбываць у віцебскую ПУАТ-9 ад 17 чэрвеня 2021 года. На чацвёрты дзень знаходжання ва ўстанове Дзмітрыя паставілі адразу на два прафулікі: "схільнага да экстрэмізму і іншай дэструктыўнай дзейнасці" і "схільнага да захопу закладнікаў, нападу на адміністрацыю і хуліганскіх праяваў".
Таксама Дзмітрыю была выдана забарона на выхад з ПУАТ, таму ён самастойна не мог нават наведваць краму і вымушан быў або прасіць людзей, каб яны купілі прадукты, або рабіць "дастаўку" з крамы. З чэрвеня гэтага года Дзмітрыя ўтрымлівалі ў ШІЗА мінімум 73 дні, 60 з якіх амаль бесперапынна. Штрафны ізалятар знаходзіцца ў ІЧУ г. Гарадок.
Дзмітрый на судзе выказаў меркаванне, што адміністрацыя калоніі вельмі прадузята да яго ставіцца, таму бесперапынна выпісваюць спагнанні і рознымі спосабамі ціснуць на яго.
Але суддзя Алена Грэбянчук не паверыла довадам палітвязня і прыняла рашэнне аб узмацненні Дзмітрыю Цімафееву пакарання і змяніў абмежаванне волі з накіраваннем у ПУАТ на пазбаўленне волі ва ўмовах агульнага рэжыму тэрмінам на тры с паловай месяцы.

**19.11.2022**



У Віцебску на кіроўцу «жывемабіля» завялі крымінальную справу. **Андрэй Кулакоў** — вядомы шмат каму кіроўца «жывемабіля». Улады маюць намер пакараць мужчыну па «народным» арт.342 (арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак) Крымінальнага кодэкса. Таксама была арыштавана яго маёмасць. Кіроўца «жывемабіля» даўно з’ехаў з Беларусі, калі заставацца яму стала небяспечна. Цяпер ён жыве ў Варшаве, а пасля нападу Расіі на Украіну аддаў увесь час на ратаванне ўкраінскіх уцекачоў.
Пасля пачатку вайны ва Украіне беларус стаў валанцёрыць на польска-ўкраінскай мяжы і дапамагаць уцекачам.
Паводле слоў Андрэя, з пачатку вайны на сваім аўтамабілі ён перавёз больш як 50 тысяч украінцаў. Цяпер, кажа ён, на мяжы з Польшчай ужо нямнога людзей, але ж і валанцёраў амаль не засталося. У цяперашні час у асноўным Андрэй перавозіць людзей з інваліднасцю.

**25.11.2022**

Супрацоўнікі міліцы 25 лістапада прыйшлі да бацькі каталіцкага святара **Вячаслава Барка**, які жыве ў Мёрах Віцебскай вобласці. Яго апытвалі ў сувязі з удзелам святара ў відэа для канала «Хартыя-97» «Беларускі святар распавёў, калі падзе рэжым Лукашэнкі», апублікаваным два месяцы таму.
Пытанні тычыліся таго, ці ўжывае ксёндз Вячаслаў алкаголь і наркотыкі, ці мае маёмасць. Міліцыю таксама цікавіла, калі ён вернецца ў Беларусь.
Ксёндз Вячаслаў Барок — вядомы каталіцкі святар, аўтар ютуб-канала «Ксёндз Барок». Улетку 2021 года ён быў вымушаны выехаць з Беларусі ў Польшчу ў сувязі з пераследам, якому падвяргаўся з боку

рэжыму Лукашэнкі. Цяпер ён кіраўнік Беларускай каталіцкай грамады ў Варшаве, якая дзейнічае пры касцёле Святога Аляксандра на пляцы Трох Крыжоў.

**27.11.2022**

Актывістку з Верхнядзвінску **Валянціну Болбат** асудзілі да арышту на 10 сутак. Але няма звестак пра тое, у чым канкрэтна абвінавацілі актывістку, і не зразумела, калі над ёй адбыўся суд. Паводле звестак, якімі падзяліліся сябры спадарыні Валянціны, 22 лістапада ў яе адбыўсяператрус, а потым некалькі гадзін актывістку апытвалі пра кіраўніцтва руху «За свабоду», у прыватнасці, пра Юрыя Губарэвіча. У праваабаронцаў ёсць падставы меркаваць, што асудзіць актывістку маглі паводле арт. 19.11 КаАП. Але высветліць гэта дакладна можна будзе хіба толькі тады, калі Валянціна Болбат выйдзе на волю.
Што да арышту жыхаркі Верхнядзвінску, то ёсць дэталі, якія бянтэжаць і праваабаронцаў, і яе аднадумцаў. Справа ў тым, што 23 і 24 лістапада актывістка некалькі разоў выходзіла на сувязь і прасіла за яе не хвалявацца. Застаецца не зразумелым, ці гэта супакойвала знаёмых сама Валянціна Болбат, ці нехта рабіў гэта ад ейнага імя з ейнага тэлефона. Бо голасу актывісткі ніхто не чуў, каб можна было з поўнай упэўненасцю сказаць, што на сувязі менавіта гэты чалавек. Усе камунікацыі адбываліся пісьмова праз мэсэнджары. Тэлефон Валянціны Болбат не адказвае з 22 лістапада: на ўсе спробы датэлефанавацца абанентам паведамляюць, што «няправільна набраны нумар».
Валянціна Болбат - адна з пачынальніц беларускага дэмаратычнага руху ў1990-я гады. Яна шмат працавала на карысць развіцця Верхнядзвіншчыны - ладзіла асветніцкія і культурніцкія імпрэзы, супрацоўнічала з мясцовымі ўладамі ў галіне аховы здароўя, правоў жанчын і дзяцей, неаднаразова была незалежнай назіральніцай падчас выбараў розных узроўняў, дапамагала неабыякавым жыхарам Верхнядзвінску аб'яднацца дзеля добраўпарадкавання сваіх двароў і навакольных тэрыторый.

**28.11.2022**



Следчыя шукаюць доказы па крымінальнай справе ў сваякоў новаполацкай актывісткі “Руха за свабоду”. У вечары, 28 лістапада, адбыўсяператрус па месцы прапіскі грамадскай і палітычнай дзяячкі з Наваполацка **Вольгі Дамаскінай**. Вольга ўжо больш за год знаходзіцца разам з мужам за межамі Беларусі і не займаецца публічнай палітыкай.
Да гэтага ўжо прайшоўператрус у яе маці, што жыве у прыгарадзе Наваполацка, і, згодна з паперамі, якія пабачылі яе родныя, плануеццаператрус па месцы прапіскі мужа Вольгі. Афіцыйнай падставай ператруса з'яўляюцца крымінальныя справы, узбуджанныя за разгалошванне нейкіх сведчанняў і абраза нейкіх трох асоб.
Але падчас ператруса сілавікі распытвалі пра дзейнасць грамадскай арганізацыі “Рух за свабоду”, пра Юрыя Губарэвіча, удакладнялі, ці займаецца Вольга за мяжой нейкай палітычнай дзейнасцю. Па выніках першага ператруса была вынята тэхніка блізкіх Вольгі, але ніякіх пратаколаў, ці вопісу вынятага супрацоўнікі міліцыіі не пакінулі, спасылаючыся на тое, што гэта не прадугледжана Крымінальна-працэсуальным кодэксам краіны.

**30.11.2022**

Турэмныя ўлады засакрэцілі інфармацыю пра стан здароўя **Мікалая Статкевіча**. Жонцы палітвязня да гэтага часу не ўдалося атрымаць інфармацыю аб стане здароўя палітвязня Мікалая Статкевіча, які ў калоніі пасля трох перанесеных кавідаў захварэў на пнеўманію. Яго маглі пакінуць без неабходных лекаў.
Статкевічу, які адбывае тэрмін у калоніі, дыягнаставалі пнеўманію пасля трох перанесеных кавідаў. Палітвязень знаходзіцца ў медсанчастцы, пры гэтым да яго не пускаюць адваката.
Марына Адамовіч распавяла, што не ведае, ці перадаюць Статкевічу неабходныя лекі.
Пры гэтым яна зазначыла, што можна пісаць афіцыйныя запыты ў калонію па электроннай пошце: vi.ik13.pismo@din.gov.by. Звычайныя ці заказныя лісты да яго і да Марыны не даходзяць.

Палітвязня 14 снежня мінулага года асудзілі паводле «справы Ціханоўскага», прызналі вінаватым паводле ч.1 арт. 293 («Арганізацыя масавых беспарадкаў») і прызначылі 14 гадоў калоніі асаблівага рэжыму.

## Снежань 2022

**01.12.2022**

Цэнзар у віцебскім СІЗА -2 не ведае беларускай мовы, а просіць не карыстацца ёй у лістах. Пра такі выпадак стала вядома ў дачыненні да палітвязня **Анатоля Латушкі**, якому «настойліва раяць» не пісаць лісты па-беларуску, бо цэнзар не вывучала беларускую мову і зусім яе не разумее. Праз гэта лісты на дзяржаўнай мове не даходзяць да палітзняволенага, але ён прынцыпова працягвае ліставанне па-беларуску.
Стрыечнага брата апазіцыйнага палітыка Паўла Латушкі асудзілі да 6-ці гадоў пазбаўлення волі і ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму паводле арт. 342 Крымінальнага кодэкса (Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, што груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх), арт. 370 Крымінальнага кодэкса ( Здзек з дзяржаўных сімвалаў), ч. 2 арт. 339 Крымінальнага кодэкса (Хуліганства, здзейсненае групай асобаў), арт. 203-1 Крымінальнага кодэкса (Незаконныя дзеянні ў дачыненні да інфармацыі аб прыватным жыцці і персанальных дадзеных).
Прысуд быў вынесены 20 верасня гэтага году, а ў лістападзе жыхара Менску перавялі з СІЗА-1 у віцебскі СІЗА-2.
Анатоль Латушка быў затрыманы ўначы 31 студзеня 2022 года. Спачатку яму паставілі ў віну маляванне праз трафарэты герба «Пагоня», распаўсюд улётак, спаленне дзяржаўнага сцяга і ўдзел у пратэсных маршах у 2020 годзе. Пазней стала вядома, што яму таксама інкрымінавалі збор і распаўсюд інфармацыі аб прыватным жыцці і персанальных дадзеных службовых асобаў. Вядома, што пасля затрымання Анатоля Латушку моцна збілі.

**01.12.2022**




У **Віктара Бабарыкі** пагоршалі ўмовы працы ў наваполацкай калоніі. Экс-банкіру і палітвязню Віктару Бабарыку прызначылі новую працу ў ПК-1. Цяпер ён выпальвае драўняны вугаль, паведамляе Telegram-канал «Виктор Бабарико». Гэта значыць, што палітзняволены вымушаны ў халодную пару году працаваць на вуліцы цягам 9 гадзінаў штодня за адзіным выходным на тыдні. Варта заўважыць, што ягоная мінулая праца была ўнутры памяшкання без вентыляцыі пры тэмпературы +30 градусаў – у такіх умовах ён працаваў укладчыкам хлебабулачных вырабаў у пякарні.
Сваякі палітыка адзначаюць, што працу палітзняволенаму прызначаюць без уліку медычных супрацьпаказанняў. Што да вольнага часу, то і тут да Віктара Бабарыкі ўведзены абмежаванні. У адным з лістоў да сваёй дачкі ён пісаў, што яго абмяжоўваюць у чытанні і не дазваляюць чытаць нават стоячы.
У Наваполацкай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму зняволены палітык адбывае 14-гадовы тэрмін, прысуджаны яму паводле «эканамічных» артыкулаў – арт. 235 Крымінальнага кодэкса (Легалізацыя сродкаў, атрыманых злачынным шляхам) і арт. 430 Крымінальнага кодэкса (Атрыманне хабару). Праблемы ў экс-банкіра Белгазпрамбанка пачаліся пасля таго, як 12 траўня 2020 г. ён звольніўся з пасады старшыні праўлення па ўласным жаданні і паведаміў аб сваім намеры ўдзельнічаць у прэзідэнцкіх выбарах. За кароткі тэрмін Бабарыка стварыў другую па колькасці ініцыятыўную групу (каля 9 тысяч чалавек, у той час як у Лукашэнкі было 11 тысяч чалавек). Таксама ён паставіў рэкорд па колькасці подпісаў, сабраных альтэрнатыўнымі кандыдатамі за ўсю гісторыю прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі: паводле звестак ягонага штаба, іх было сабрана больш за 430 тысяч, з іх для падачы ў ЦВК было падрыхтавана 365 тысяч.

**02.12.2022**

Спецдакладчыкі ААН разгледзяць зварот з нагоды затрымання **Валянціны Болбат.** 25 лістапада суддзя Зінаіда Балаболава Наваполацкага гарадскога суда арыштавала Валянціну Болбат

на 10 сутак паводле арт. 19.11 (Распаўсюджванне, выраб, захоўванне, перавозка інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або якая прапагандуе такую дзейнасць) КаАП РБ. З нагоды рэпрэсіўнага рашэння суда, была складзена і накіравана скарга ў рамках Спецыяльных працэдур да Рады па правах чалавека на факту затрымання і арышту актывісткі апазіцыйнага руху “За Свабоду” Валянціны Болбат.

**03.12.2022**



Палітзняволенага **Максіма Знака** адправілі ў памяшканне камернага тыпу. Раней яго тройчы змяшчалі ў штрафны ізалятар карнай установы “Віцьба”, дзе ён адбывае пакаранне.
Змяшчэнне ў ПКТ — самая суровая мера спагнання ў калоніі. Асуджаныя, пераведзеныя ў ПКТ, маюць права траціць у месяц толькі 32 рублі, атрымліваць 1 бандэроль на паўгода і выходзіць на прагулку на 30 хвілін.
Маскім быў затрыманы 9 верасня 2020 года і улады прад’явілі яму абвінавачванні па трох крымінальных артыкулах: арт. 361(Заклікі да дзеянняў, скіраваных на прычыненне шкоды нацыянальнай бяспецы Рэспублікі Беларусь), арт. 357 (Змова з мэтай захопу ўлады неканстытуцыйным шляхам), арт. 361-1 (Стварэнне экстрэмісцкага фармавання або ўдзел у ім). Па рашэнню суддзі Сяргея Епіхава, Знак быў пазбаўлены волі тэрмінам на 10 гадоў і ён адбывае пакаранне у ПК №3 Віцьба.

**12.12.2022**

**Валянціна Болбат** выйшла з-за кратаў, але ў яе праблемы са здароўем і вялікі штраф. Актывістку з Верхнядзвінску затрымалі 22 лістапада, калі па Віцебшчыне пракацілася хваля ператрусаў у прыхільнікаў руху «За Свабоду». У Валянціны Болбат забралі ўсю аргтэхніку – тэлефон і два кампутары, прычым адзін – у непрацоўным стане. У Наваполацкім гарадскім аддзеле міліцыі на яе склалі некалькі адміністрацыйных пратаколаў па арт. 19.11 – за распаўсюд «экстрэмісцкіх матэрыялаў».
Паводле паведамлення, якое Валянціна Болбат пакінула на сваёй старонцы ў Фэйсбуку, на яе склалі 4 адміністрацыйныя пратаколы. Усе паводле арт. 19.11 за рэпосты «ВКонтакте», але гэтыя звесткі «падзялілі», каб «хапіла» на некалькі судоў. Прычым частка рэпостаў было зроблена 10-15 гадоў таму, калі крыніцы матэрыялаў яшчэ не былі абвешчаны «экстрэмісцкімі».
Першы суд над актывісткай адбыўся 25 лістапада па 2-х адміністрацыйных пратаколах. Суддзя Наваполацкага гарадскога суду Зінаіда Балаболава асудзіла жанчыну на 10 сутак арышту. Яшчэ адзін пратакол разбіралі 30 лістапада. Тая самая суддзя Балаболава прысудзіла спадарыні Валянціне яшчэ 10 сутак арышту.
«Суткі» актывістка адбывала ў Наваполацкім ЦІПе. У першы ж вечар ёй выклікалі хуткую дапамогу, бо ў актывісткі ўжо не маладога веку падняўся высокі ціск. З тае ёй пачалі даваць сродкі ад ціску, але праблемы гэта не вырашыла – хуткую выклікалі яшчэ некалькі разоў. Урэшце ёй далі «пасцельны рэжым» – дазволілі не прыбіраць пасцель у дзённы час, каб была магчымасць паляжаць. На апошнім судзе 5 снежня суддзя Балаболава пастанавіла даць жанчыне ўжо не «суткі», а штраф памерам 20 базавых велічынь.
З улікам кепскага стану здароўя Валянціну Болбат адпусцілі на волю на трое сутак раней, не 12, а 9 снежня. Пазней яна мае адбыць гэтыя трое сутак арышту, а таксама яе абавязалі з’явіцца ў Наваполацкі гарадскі аддзел міліцыі 19 снежня на чарговы допыт. І папярэдзілі, што 20 снежня хутчэй за ўсё адбудзецца новы суд.

**12.12.2022**

Улады пашырылі тэрыторыю крымінальнага вышуку праваабаронцы і рэдактара рэгіянальнага партала horsha.eu **Ігара Казмерчака**. У пачатку 2022 года ён быў аб'яўлены ў вышук у межах Беларусі. Цяпер жа сілавікі спадзяюцца яго адшукаць у краінах Садружнасці Незалежных Дзяржаў, якія раней уваходзілі СССР.
Ігара шукае міліцыя для таго, каб прыцягнуць да крымінальнай адказнасці па арт. 368 (Абраза Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь), якая прадугледжвае пазбаўленне волі да 4 гадоў. Аднак сілавікам гэта

зрабіць пакуль не ўдалося, бо Казмерчак з'ехаў з краіны яшчэ летась.
Да гэтага часу супрацоўнікі міліцыі практыкавалі не эфектыўную стратэгію пошуку праз множнае расклейванне партрэтаў праваабаронцы на стэндах "іх шукае міліцыя" ў Оршы. З-за няўдач знайсці праваабаронцу ў яго родным горадзе, таму геаграфія пошуку была пашырана да межаў дзяржаў якія ўваходзяць у СНД, г.зн. Ігара аб'явілі ў міждзяржаўны вышук.
Трэба адзначыць, што міждзяржаўны-гэта вышук у межах Садружнасці, які рэгламентуецца дагаворам ад 2010 года. Улічваючы, што гэта фармальнае аб'яднанне дзяржаў і з гэтай прычыны сістэма вышуку ў СНД практычна не працуе.
Да таго ж урады краін Садружнасці, акрамя Расіі, не практыкуюць выдачу беларускіх грамадзян, якіх абвінавачваюць па палітычных артыкулах.
І добрая навіна. Казмерчака пакуль не аб'явілі міжнародны вышук па лініі Інтэрпола, з-за таго, што гэты паліцэйскі інстытут ужо даўно не выдае беларусаў і беларусак на запыт беларускіх органаў улады з прычыны адсутнасці незалежнага правасуддзя і знішчэння існуючым аўтарытарным рэжымам рэжыму прававой дзяржавы.

**17.12.2022**

Суд пакараў 19-гадовага жыхара Докшыц за надпіс “3%”. Згодна крымінальнага артыкула 341 (Апаганьванне будынкаў і псаванне маёмасці) яму прісудзілі пазбаўленне волі на паўтара гады.
Газета не называе прозвішча асуджанага, але пра гэты выпадак у райцэнтры ведаюць і шмат абмяркоўваюць. Паводле тамтэйшага краязнаўцы **Канстанціна Шыталя**, асуджанага хлопца завуць Аляксандр Сініца. Распавядаюць таксама, што ў апошні час ён актыўна займаўся крытыкай докшыцкіх аб’ектаў гандлю – за продаж пратэрмінаваных прадуктаў і кепскія санітарныя ўмовы.

**20.12.2022**

ААНаўскі Камітэт па правах чалавека абавязаў расейскія ўлады не выдаваць Беларусі аршанца Андрэя Рускіх. Зняволены беларус нарадзіўся ў горадзе Орша Віцебскай вобласці. У снежні 2021 года ён пераехаў у Расію. У маі 2022 года беларускія ўлады распачалі супраць Рускіх адразу дзве крымінальныя справы з-за каментароў у сацсетках — аб абразе прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі (арт. 368 КК РБ) і распальванні сацыяльнай варожасці да органаў улады (арт. 130 КК РБ). Улады Беларусі патрабуюць экстрадыцыі палітвязня.
На прыканцы трацня транспартная паліцыя затрымала Рускіх на Маскоўскім вакзале ў Пецярбургу. У жніўні Мемарыял прызнаў Андрэя палітычным зняволеным. Тым не менш, Генеральная пракуратура Расіі пастанавіла задаволіць экстрадыцыйны запыт Беларусі, і 9 лістапада Санкт-Пецярбургскі гарадскі суд пакінуў рашэнне аб экстрадыцыі ў сіле.
Праваабаронцы звярнуліся са скаргай у КПЧ ААН, запатрабаваўшы ў рамках гэтай справы прымяніць часовыя (забяспечальныя) меры ў выглядзе забароны на экстрадыцыю. Камітэт пачуў довады абароны і ўказаў Расіі на неабходнасць устрымацца ад экстрадыцыі да разгляду справы ў Камітэце па сутнасці. аму сёння, 20 снежня, будзе слухацца апеляцыя ў Другім апеляцыйным судзе агульнай юрысдыкцыі.

**20.12.2022**

У Кастрычніцкім судзе Віцебска напачатку снежня асудзілі **Уладзіслава Аўчыннікава** паводле ч. 1 арт. 352 (Неправамоцнае авалоданне камп’ютарнай інфармацыяй), ч. 2 арт. 424 (Злоўжыванне ўладай ці службовымі паўнамоцтвамі) Крымінальнага кодэкса. Суддзя Сняжана Кіндзеева прызначыла Уладзіславу 2 гады і 6 месяцаў пазбаўлення волі ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыма і штраф 300 базавых велічыняў.
Уладзіслаў Аўчыннікаў – былы супрацоўнік УУС Віцебскага аблвыканкама.
Мужчыну абвінавацілі ў тым, што са снежня 2021 па травень 2022 ён збіраў у базах дадзеных МУС інфармацыю аб прыватным жыцці і персанальных дадзеных грамадзян, якую потым “распаўсюджваў у месенджары Telegram”.
Акрамя пазбаўлення волі і штрафа, Уладзіславу забаранілі працаваць у праваахоўных органах тэрмінам на 5 год.

**23.12.2022**



Віцебскага блогера і прадзюсара **Уладзіслава Савіна** прызналі палітвязнем, які быў асуджаны двойчы. 30 красавіка мінулага году яго асудзілі да васьмі гадоў калоніі за «махлярства ў буйным памеры» (ч. 4 арт. 209 Крымінальнага кодэксу), а таксама за арганізацыю і ўдзел у акцыях пратэсту (арт. 342 Крымінальнага Кодэксу). Сёлета 26 кастрычніка ўраджэнца Віцебска асудзілі і паводле арт. 368 Крымінальнага кодэксу – за абразу Лукашэнкі ў вершы, змешчаным у апеляцыйнай скарзе. У выніку частковага складання двух прысуджаных тэрмінаў зняволення (8 гадоў і 2 гады) Савіну засталося адбываць у калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму больш за сем гадоў.
Праваабаронцы лічаць, што «акалічнасці вынясення прысудаў, якімі Уладзіславу Савіну прызначаны такі працяглы тэрмін пазбаўлення волі, значную частку якога складае адвольнае пакаранне за ажыццяўленне сваіх грамадзянскіх правоў і свабод, прымушаюць патрабаваць перагляду прысуду і спынення пераследу паводле арт. 342 і 368 Крымінальнага Кодэкса».
Што да абвінавачвання ў махлярстве, то, паводле матэрыялаў крымінальнай справы, вядзецца пра падман людзей, якія выказалі жаданне ўзяць удзел у рэаліці-шоў «Автобус-2», «Корабль-2», «Самолет-1,2», «Бандиты Мексики», «Мисс Дубай», бо здымкі не адбыліся. Паводле версіі абвінавачвання, Уладзіслаў Савін з 20 сакавіка 2015 па 5 красавіка 2016 году «шляхам падману (махлярства) асобаў завалодаў грашовымі сродкамі ў агульнай суме эквівалентнай 8430 базавым велічыням (175 142 рубля 44 капейкі)».

**24.12.2022**

За перадачу дадзеных у "Чорную кнігу Беларусі" віцеблянку асудзілі на пяць гадоў калоніі. У Магілёўскім абласным судзе ў закрытым рэжыме 23 снежня асудзілі палітзняволеную **Таццяну Карповіч** паводле ч. 3 арт. 130 (распальванне іншай сацыяльнай варожасці) Крымінальнага кодэкса. Суддзя Павел Клімаў прызначыў жанчыне 5 гадоў пазбаўленняволі ў калоніі ва ўмовах агульнага рэжыма і штраф 250 базавых велічыняў. Таццяна Карповіч – 25-гадовая палітзняволеная жыхарка Віцебска, паводле адукацыі праграмістка. Яна была затрыманая 17 лістапада 2021 года.
Першапачаткова Таццяну абвінавачвалі паводле ч. 3 арт. 130 (Распальванне іншай сацыяльнай варожасці) і ч. 3 арт. 203-1 (Незаконныя дзеянні ў дачыненні інфармацыі аб прыватным жыцці і персанальных дадзеных) Крымінальнага кодэкса за перадачу дадзеных сілавікоў, настаўнікаў, суддзяў у тэлеграм-канал "Чорная кніга Беларусі". Таццяну змясцілі ў СІЗА-1. Напрыканцы кастрычніка 2022 г. яе перавялі ў віцебскі СІЗА-2, а пасля — у магілёўскую Турму № 4. Але пазней другі атрыкул з абвінавачання прыбралі.
12 снежня 2022 распачаўся ў закрытым рэжыме судовы працэс над Таццянай. Дзяржабвінавачанне прадстаўляла пракурор Таццяна Касцюшка. Яна запрасіла для палітзняволенай 6 гадоў пазбаўлення волі. Але суддзя ў выніку прызначыла жанчыне 5 гадоў калоніі.

**27.12.2022**

Палітзняволеная **Эма Сцепулёнак** сустрэне Новы год у калоніі. З 16 снежня былая настаўніца беларускай мовы, а цяпер пенсіянерка, пачала адбываць тэрмін пакарання ў гомельскай жаночай калоніі № 4. У зняволенні ёй засталося правесці каля 4-х месяцаў. Эму Антонаўну абвінавацілі паводле двух артыкулаў Крымінальнага кодэкса: арт. 368 (Абраза Лукашэнкі) і арт. 369 (Абраза прадстаўніка ўлады). Суд прызначыў палітзняволенай 2 гады пазбаўлення волі ва ўмовах агульнага рэжыму. Працэс праходзіў па месцы жыхарства Эмы Сцепулёнак – у Мёрах. Тамсама яна была затрыманая 29 верасня 2021г. у межах крымінальнай справы, распачатай за каментары ў інтэрнэце пасля гібелі супрацоўніка КДБ Дзмітрыя Федасюка і ІТ-спецыяліста Андрэя Зельцара.
Першапачаткова Эма Антонаўна праходзіла па крымінальнай справе паводле арт. 369 Крымінальнага Кодэкса (Абраза прадстаўніка ўлады) і арт. 130 Крымінальнага Кодэкса (Распальванне сацыяльнай варожасці). Пазней апошні артыкул знялі, але дадалі арт. 368 (Абраза Лукашэнкі). З 11 снежня 2021 г. 69-гадовая жанчына знаходзілася ў віцебскім СІЗА-2. Паколькі яна не мае ўласнай сям'і, ёй апекавалася віцебская грамадскасць: незнаёмыя людзі рыхтавалі для яе перадачы, дасылалі лісты і паштоўкі.

**29.12.2022**



Улады налічылі ў Віцебскім рэгіёне каля 200 "экстрэмістаў і экстрэмістак". З сакавіка бягучага года чыноўнікі з Міністэрства ўнутраных спраў вядуць спіс асоб, якія маюць дачыненне да так званай экстрэмісцкай дзейнасці. У гэтую базу практычна штодня залічваюцца грамадзяне краіны, якія выказалі незадаволенасць вынікамі падліку галасоў на апошніх выбарах Кіраўніка дзяржавы і потым асуджаныя па так званых «пратэстных народных артыкулах». За апошнія 6 месяц 2022 года колькасць «экстрэмістаў» у Віцебскай вобласці павялічылася ў 2,5 разы: з 67 імёнаў да 177. Сярод «палітычна нядобранадзейных асоб» 32 жанчыны і 145 мужчын.

Згодна са статыстычнымі дадзенымі ў Віцебску і Віцебскім раёне пражывала 76 «экстрэмістаў і экстрэмістак», адпаведна ў Оршы і Аршанскі -29, Полацку і Полацкім раёне -21, у Наваполацку -18.

Па малых населеных пунктах размеркаванне "радыкалаў" выглядае наступным чынам.

У Паставах і ў прылеглым раёне сілавікамі выяўлена 6 чалавек, а ў Лепелі і Лепельскім раёне 5 дысідэнтаў.

Рашэннем судоў пацверджаны абвінавачанні ў дачыненні да «прадстаўнікоў народнага супраціву»: па 3 асуджаных - у Глыбокім, Браслаўскім і Верхнядзвінскім раёнах і па 2 - Дубровенскім, Докшыцкім, Міёрскім, Ушацкім і Чашніцкім раёнах.

У Гарадоцкім і Бешанковіцкім раёнах і ў г. Новалукомль улады выявілі і асудзілі па адным «шкодным апазіцыянеру».

Сярод найбольш рэвалюцыйна настроеных жыхароў Віцебскага рэгіёну з'яўляліся маладыя людзі ва ўзросце ад 21 да 30 гадоў (43 чалавекі) і ад 31 да 40 гадоў (58 чалавек), што складае без малога 60% ад усіх асуджаных за «экстрэмізм».

**29.12.2022**

Палітзняволены старшыня Гомельскага аддзялення Праваабарончага цэнтра «Вясна» трапіў у віцебскую ПК-3 сёлета 27 студзеня. Сюды яго накіравалі адбываць тэрмін пазбаўлення волі, прысуджаны паводле арт. 342 Крымінальнага кодэкса («Арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, што груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх»). Стаўленне да **Леаніда Судаленкі** з боку адміністрацыі віцебскай калоніі адмысловае: яго паставілі на асобны кантроль, паводле інфармацыі праваабаронцаў, да яго часта прыходзяць з пазапланавымі праверкамі, выварочваюць і пераглядаюць ягоныя рэчы.

Вядома таксама, што адміністрацыя калоніі ціснe на палітзняволенага праваабаронцу: яго з верасня зрабілі «парушальнікам», пазбавілі кароткатэрміновага спаткання і права на пакупкі ў краме.

У кастрычніку 2022 г., амаль праз 10 месяцаў пасля затрымання, МУС унёс палітзняволенага праваабаронцу ў пералік «асобаў, датычных да экстрэмісцкай дзейнасці».

**31.12.2022**

Віцебскі арт-менеджэр Уладзімір Булаўскі не выйшаў на волю. На яго у СК завялі крымінальную справу па двум "народным артыкулам".



16 студзеня Уладзімір Булаўскі асуджаны да 15 сутак арышту. Ёсць верагоднасць, што яго звінавацілі паводле артыкула 19.11 за распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў. Прынамсі, такое самае абвінавачанне было высунута супраць затрыманых з ім у адзін дзень заснавальнікаў гастрапаба ROK'I PUB Іллі Кульмана і Паўла Пятрунiна, а таксама сталага наведніка Дзмітрыя Ларкова. Апошнія трое ўжо на волі.

Уладзімір Булаўскі, вядомы ў Віцебску арганізатар выступаў беларускіх выканаўцаў і гуртоў, мае выйсці з-пад арышту ў першы дзень 2023г. З улікам апошняга інцыдэнту, у 2022г. яго тройчы судзілі па адміністрацыйных артыкулах – у снежні (вырак – 15 сутак

арышту), у ліпені (30 сутак арышту паводле арт. 24.23 КаАП), і ў лютым (15 сутак арышту паводле арт. 24.23 КаАП)

Да гэтага арт-менеджар Булаўскі таксама быў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці па так званых «народных» артыкулах. У 2020-м годзе ён быў асуджаны да 8-мі сутак арышту за парушэнні заканадаўства аб масавых мерапрыемствах (былы арт. 23.34 КаАП). У лістападзе 2021 года яго пакаралі арыштам на 7 сутак за распаўсюд «экстрэмісцкіх» матэрыялаў па арт. 19.11 КаАП.

Выдадзена праваабаронцамі Віцебскага рэгіёну.
У выданьні выкарстоўваюцца матэрыялы,
апублікаваныя сайтамvitebskspring.org і іншымі інтэрнэт-рэсурсамі.
*Для вольнага распаўсюду*